# ПАМЯЦЬ

## ДОКШЫЦКІ РАЁН

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
2004

# 1941

# 1945

## ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

### Так пачыналася вайна

На досвітку 22 чэрвеня 1941 г. танкавыя і мотапяхотныя дывізіі вермахта пры масіраванай падтрымцы артылерыі і авіяцыі перайшлі заходнюю граніцу СССР ад Карэліі да Чорнага мора. Германія напала на Савецкі Саюз. Пачалася Вялікая Айчынная вайна.

23 чэрвеня ў выніку неаслабнага ціску праціўніка пачаўся масавы адыход савецкіх войск на ўсход. Імкліва наступаючы, 3-я нямецкая танкавая група (камандуючы генерал-палкоўнік Г. фон Гот) за 2 дні паглыбілася ў савецкую тэрыторыю на 120 км. Яе 39-ы танкавы корпус (генерал Р.Шміт) 24 чэрвеня заняў Вільнюс і павярнуў на Мінск. Наперадзе ішла 7-я танкавая дывізія (генерал-маёр Г. фон Функ). Часці Чырвонай Арміі і полк войск НКУС каля Маладзечна спрабавалі затрымаць рух корпуса, але былі разбіты і адкінуты, як і 50-я стралковая дывізія (палкоўнік В.П.Еўдакімаў), што зрабіла спробу атакаваць калоны корпуса з боку Вілейкі. 26 чэрвеня пачаліся баі за Мінск, а 28 чэрвеня сталіца Беларусі апынулася ў руках ворага. Яе абаронцы, у асноўным часці 44-га стралковага корпуса, якія трымалі абарону ў Мінскім умацаваным раёне, трапілі ў «кацёл». Пасля яго ліквідацыі 2—3 ліпеня камандаванне вермахта перакінула свае карпусы на першапачаткова пракладзеныя маршруты — на поўнач, каб наступаць праз Докшыцкі, Глыбоцкі і суседнія раёны.

У напрамку, адваротным руху 39-га танкавага корпуса, ад Мінска і Валожына праз Вільнюс, Кабыльнік (Нарач) і Глыбокае да Заходняй Дзвіны прайшоў 57-ы танкавы корпус (генерал А.Кунцэн) з ліку ўсё той жа 3-й нямецкай танкавай групы. 3—4 ліпеня ён авалодаў Глыбокім і Дзіснай і падышоў да Заходняй Дзвіны, ахапіўшы паўночна-заходнюю частку Докшыцкага раёна. За суткі 57-ы корпус пераадолеў 200 км перш чым сутыкнуўся з часцямі 22-й арміі, якія займалі абарону ў Полацкім умацаваным раёне.

Праз цэнтр Докшыцкага раёна па дарозе ад Даўгінава да Беразіно хутка рухаліся танкі 39-га корпуса. Наперадзе па-ранейшаму была 7-я танкавая дывізія, а перад ёй атрад на чале з падпалкоўнікам Г. фон Мантойфелем. За адзін дзень 3 ліпеня дывізія прайшла паўз Докшыцы, пераправілася цераз р. Бярэзіна і захапіла Лепель. Мост каля в. Беразіно быў адноўлены. Замацоўваючы поспех, за 7-й дывізіяй ішлі танкі 20-й танкавай дывізіі (генерал-маёр Штумпф), аўтамашыны з салдатамі. Да вечара дывізія дасягнула в. Беразіно. На наступны дзень камандны пункт 39-га танкавага корпуса размясціўся на ўсход ад Докшыц, каля в. Гічанцы.

ВАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ НА ТЭРЫТОРЫІ ДОКШЫЦКАГА РАЁНА Ў 1941 г.




Аўтар карты У. Ф. Ісаенка

Далей на поўдзень паралельным маршрутам рухалася паходная калона 20-й матапяхотнай дывізіі (генерал-маёр Цорн). Яна 1 ліпеня авалодала Плешчаніцамі, на наступны дзень — Бягомлем і выйшла да пераправы ў в. Кальнік. Асноўныя сілы дывізіі затрымаліся на 3 дні каля в. Ліпск на поўдзень ад шашы, якая вяла ў Лепель. З поўдня рух дывізіі прыкрывала 900-я вучэбная матабрыгада.

Асобныя часці Чырвонай Арміі, рэшткі палкоў і батальёнаў, пагранатрады з баямі адыходзілі на рубеж Бярэзіны. Аднак яны былі не ў стане спыніць прасоўванне нямецкіх злучэнняў. Да некаторых з іх дайшоў загад савецкага Вярхоўнага камандавання ад 27 чэрвеня выходзіць з акружэння і збірацца за Полацкім, Лепельскім і Мінскім умацаванымі раёнамі. Адступаючыя савецкія часці спрабавалі заняць абарону на старой граніцы, потым на ўсходнім беразе Бярэзіны, асабліва ў месцах пераправ і паблізу мастоў. 50-я стралковая дывізія вяла жорсткія баі на поўдні Бягомльскага раёна, каля Плешчаніц, Зембіна, Мсціжа. Пасля няўдалай спробы 28 чэрвеня

адбіць Лагойск да яе далучыўся 288-ы стралковы полк, адкінуты ад Мінска. Часці дывізіі змаглі арганізаваць часовую абарону за р. Бярэзіна толькі на ўчастку ад воз. Палік і в. Халхоліца да в. Сцюдзёнка. Тут 3—4 ліпеня адбываліся ўпартыя баі, у адным з якіх прапаў без вестак камандзір дывізіі В.П.Еўдакімаў. Удала камандаваў 49-м стралковым палком палкоўнік А.Т.Паўлыга. Але сілы былі няроўныя. 50-я дывізія і іншыя часці не здолелі стрымаць нямецкія танкі, былі з дарог адкінуты ў лясы і адступалі да Лепеля.

Нямецкае камандаванне нарошчвала сілы. На галоўны напрамак наступлення накіроўваліся праз вёскі Броды і Домжарыцы 900-я вучэбная мотабрыгада, праз в. Беразіно — 20-я мотапяхотная дывізія. 8 ліпеня з Даўгінава праз Докшыцы выступіла 12-я танкавая дывізія (генерал-маёр Харпе). Гэтыя часці своечасова падышлі да г. Сянно і прынялі ўдзел у найбуйнейшай танкавай бітве 2-й сусветнай вайны. Колькасць танкаў, якія ўдзельнічалі ў ёй з абодвух бакоў, больш чым у 2 разы перавышала лік баявых машын, задзейнічаных у Курскай бітве 1943 г. Крыху пазней да фронту накіраваўся 5-ы армейскі корпус (генерал Руоф). 10 ліпеня ён прайшоў праз Параф'янава і Докшыцы, на некалькі дзён затрымаўся ў азёрным краі каля вёсак Стараселле і Тумілавічы. Потым быў накіраваны далей на ўсход, каб змяніць на фронце 39-ы танкавы корпус.

Рух нямецкіх танкавых дывізій амаль не сустрэў сур'ёзнага супраціўлення з боку часцей Чырвонай Арміі. Узнікла пагроза фарсіравання імі Заходняй Дзвіны з ходу і хуткага захопу Віцебска. Але ў наступленне праціўніка карэктывы ўнесла надвор'е. Як сведчыў генерал-палкоўнік Г. фон Гот, «39-ы танкавы корпус атрымаў задачу — абысці Бярэзіну з поўначы і, павярнуўшы на ўсход, авалодаць Віцебскам. Але пачаліся дажджы і неўмацаваныя дарогі ператварыліся ў бяздонныя балоты, дзе безнадзейна вязлі цяжкія машыны. І замест хуткага, як спадзяваліся, авалодання Віцебскам 7-й танкавай дывізіяй, якая наступала ў першым эшалоне 39-га танкавага корпуса, спатрэбілася два дні, каб дабрацца да Лепеля, г.зн. прайсці 90 км. Дывізія згубіла баяздольнасць, бо яе калона, якая скрозь перарывалася машынамі, што заселі ў гразі, моцна расцягнулася паміж Бешанковічамі і Віцебскам. 7-я танкавая дывізія сутыкнулася з моцным супраціўлен...». Праліўныя дажджы, якія працягваліся двое сутак, зрабілі сваю справу: нямецкія танкі за дзень ледзьледзь прасоўваліся на 40—50 км замест сотні. 20-я танкавая дывізія з вялікімі цяжкасцямі дасягнула Лепеля і Улы, дзе 5—6 ліпеня яе машыны літаральна патанулі ў гразі. Наступленне на Віцебск давялося адкласці да 7 ліпеня.

Перамяшчэнні нямецкіх войск на смаленскі напрамак, такім чынам, не міналі Докшыцкі раён. Яны суправаджаліся рабункамі на карысць армейскіх часцей, зачысткамі, калі знішчаліся парушальнікі рэжыму і ворагі акупацыйных парадкаў, прыхільнікі савецкай улады, асобы яўрэйскай нацыянальнасці.

Фронт між тым усё далей адсоўваўся на ўсход. Захоплены былі Смаленск, Кіеў, Вязьма. Многія людзі гублялі надзею, але і колькасць тых, што вырашылі змагацца з акупантамі да канца, з кожным днём узрастала. Лясы давалі ім прытулак, схаваныя ў іх вёсачкі — харчы, там знаходзілася і неабходная зброя, кінутая пры адступленні. Хутка Докшыцкі і Бягомльскі раёны зрабіліся вельмі няўтульнымі для акупантаў, а іх дарогі асабліва небяспечнымі. Разгаралася полымя ўсенароднай вайны.

*У.Ф.Ісаенка.*

## Перад прыходам акупантаў

Раніцай 22 чэрвеня 1941 г. камуністы Бягомльскага раёна накіроўваліся ў клуб райцэнтра. Там было намечана правесці агульнараённы партыйны сход. Мне, як інструктару аргаддзела райкома, было даручана рэгістраваць прыбываючых. Як і было дамоўлена, у 11 гадзін 1-ы сакратар райкома партыі т. Маклакоў адкрыў партыйны сход. З дакладам аб выніках веснавой сяўбы, доглядзе пасеваў і падрыхтоўцы да ўборкі ураджаю выступіў старшыня райвыканкома Фёдар Іванавіч Рахманаў.

Раптам нехта з камуністаў зайшоў у клуб і аб нечым паведаміў т. Маклакову. 1-ы сакратар райкома спыніў дакладчыка і давёў да ведама камуністаў, што ў 12 гадзін па радыё будзе перадавацца важнае ўрадавае паведамленне.

У клубе ўключылі дынамік, і ўсе адразу пасуровелі, праслухаўшы паведамленне аб

вераломным нападзе гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз.

Пасля такога незвычайнага партыйнага сходу ўсе работнікі райкома партыі былі накіраваны ў сельскія Саветы. На фронт жа былі прызваны старшыні калгасаў, брыгадзіры, іншыя кіруючыя кадры, спецыялісты. Трэба было тэрмінова шукаць для іх замену.

Райком партыі даручыў мне вырашыць шэраг арганізацыйных пытанняў у калгасах Недальскага сельсавета. Але доўга затрымацца там не давялося.

1 ліпеня атрымаў тэлефанаграму аб тым, што на другі дзень трэба быць у райкоме партыі. Калі прыехаў у Бягомль, 2-гі сакратар райкома Пярчонак даў новае заданне. У гэты час у памяшканні сярэдняй школы знаходзілася каля 100 чалавек, якія прыбылі сюды па выкліку райваенкамата з мэтай фарміравання знішчальнага батальёна. Камандзірам яго быў прызначаны старшыня райкома Асаавіяхіма Міхаіл Пятровіч Богдан, а мне была даверана пасада камісара.

Адразу ж заняліся арганізацыйнымі мерапрыемствамі. Сфарміравалі чатыры ўзводы, прызначылі іх камандзіраў, далі ім заданне сфарміраваць аддзяленні. Самі накіраваліся ў райвыканком — трэба было ўдакладніць пытанні харчавання, забеспячэння боепрыпасамі.

Аказалася, што старшыня райвыканкома пайшоў на абед. Мы таксама накіраваліся ў сталовую. Толькі дайшлі да вуліцы Ленінскай (а было гэта прыкладна ў 14 гадзін), як у Бягомль уварваліся фашысцкія танкі. Яны адкрылі агонь па будынку райкома КП(б)Б і па цаглянаму будынку сярэдняй школы (там цяпер музей народнай славы). Нашы будучыя байцы знішчальнага батальёна, не маючы боепрыпасаў, натуральна, разбегліся. Кінуліся наўцёкі і мы з М.П.Богданам. Выскачылі на сенажаць, перабраліся на лодцы цераз Беразіну і дабраліся да вёскі Крайцы, дзе пад наглядам шафёра Мікалая Мікалаевіча Глазко (з вёскі Вускрам'е) знаходзілася райкомаўская машына з дакументамі. Неўзабаве тут сабраліся работнікі райкома і райвыканкома, сярод якіх былі Пярчонак, другі сакратар райкома, Кур'ян, загадчык аддзела, Кавалёў, загадчык аддзела партыйнага ўліку, я, як інструктар райкома партыі, Чуйкоў, загадчык планавага аддзела райвыканкома, Пісецкі, інспектар райана, Добыш, загадчык аддзела сацыяльнага забеспячэння, Каплан, дырэктар Бярэзінскай МТС.

Каб не трапілі ў рукі ворага партыйныя дакументы, мне і шафёру РК КП(б)Б М.М.Глазко было даручана даставіць іх на аўтамашыне ў г. Лёзна Віцебскай вобласці. Па шляху мы са старшынёй райплана Чуйковым знішчылі архіў райвыканкома, які захоўваўся ў Крайцах. Дзякуючы гэтаму былі выратаваны ад знішчэння фашыстамі многія дзесяткі савецкіх патрыётаў.

4 ліпеня прыбылі ў Лёзна. Першы сакратар РК КП(б)Б Маклакоў даў мне распараджэнне знішчыць усе дакументы райкома партыі. Заехаўшы ў кусты, мы з шафёрам Глазко (ён таксама быў членам партыі), знішчылі ўсе дакументы, а чыстыя бланкі партбілетаў і райкомаўскую пячатку здалі т. Маклакову.

Паўстала пытанне: а што рабіць далей? Другія суткі мы нічога не елі, ды і грошай не было. Бягомль прыйшлося пакідаць у спешцы, не заходзячы дамоў, і сям'я да жніўня 1944 года не ведала, дзе я. Можна было накіроўвацца ў тыл краіны, але сумленне не дазволіла так паступіць. Тады мы, група бягомльскіх камуністаў (2-гі сакратар РК КП(б)Б Пярчонак, старшыня райплана Чуйкоў, работнік райкома Кур'ян, інспектар райана Пісецкі, дырэктар Бярэзінскай МТС т. Каплан і я) звярнуліся да лёзненскага райваенкома з просьбай накіраваць нас у вайсковую часць. Нас адправілі чыгункай у Калугу. Паколькі ўсе мы мелі воінскія званні палітсаставу, ужо 5 ліпеня мы сталі ваеннымі, а 14 жніўня прынялі першае баявое хрышчэнне.

Мне давялося абараняць Маскву, а затым удзельнічаць у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на розных франтах Вялікай Айчыннай вайны. Я дайшоў па дарогах вайны да Берліна. Знаходзячыся на 3-м Украінскім фронце на Днястры, у канцы жніўня 1944 г. атрымаў такое жаданае і доўгачаканае першае пісьмо з дому. Страшнае гэта было пісьмо. Жонка пісала, што гітлераўскія вылюдкі па даносу здрадніка 15 чэрвеня 1944 г. забілі нашага шасцігадовага сына, спалілі дом і ўсю маёмасць.

Мы спаўна адпомсцілі людаедам за ўсё, абараняючы Радзіму. Мужна змагаліся камуністы-бягомльцы. Смерцю мужных загінулі на фронце тт. Рахманаў, Чуйкоў, Каплан, Пісецкі і іншыя. Многія камуністы Бягомльшчыны змагаліся з фашыстамі ў партызан-

скіх атрадах і злучэннях. Сярод іх — былы 3-ці сакратар Бягомльскага райкома Герой Савецкага Саюза Манковіч, былы сакратар райвыканкома П.С.Руткоўскі і іншыя. Камуністы Бягомльшчыны праявілі сябе ў гады вайны як палымяныя патрыёты сваёй Радзімы.

*М.Ф.Батура,*
*ураджэнец в. Вайча, падпалкоўнік у адстаўцы.*

## Бягомльшчына напярэдадні вайны і ў першыя яе дні

Адны і тыя ж падзеі савецкай перадваеннай гісторыі адбываліся ў розных частках сучаснага Докшыцкага раёна неадначасова. Калі ў тагачасным Бягомльскім раёне калектывізацыя закончылася ў асноўным у 1932 г., а «ворагі народа» былі разгромлены ў 1937 г., то на Докшыччыне ўсё гэта адбывалася пазней, паколькі яна ўвайшла ў склад БССР у верасні 1939 г. І толькі 2-я сусветная вайна звалілася вялікай бядой на абедзве часткі раёна адначасова.

Подых вайны адчуваўся грамадствам яшчэ здалёк, з сярэдзіны 1930-х гадоў. Пакт Рыбентропа—Молатава 1939 г., несакрэтная частка якога даносілася нешматлікімі газетамі ў вясковую глухамань, засяроджваў увагу паасобных вясковых «мудрацоў», якія нешматслоўна казалі: «Гэта не к дабру».

На тэрыторыі Бягомльшчыны пачалі пракладваць гравейку з Бягомля ў напрамку Бярозак, за якімі праз 5 кіламетраў у перадваенны час праходзіла дзяржаўная граніца з Польшчай. На пасяджэннях сельскіх Саветаў на парадак дня выносілася спецыяльнае пытанне пра стан дарог і мастоў у раёне. У такіх мэтавых абмеркаваннях удзельнічалі начальнікі пагранзастаў — Чысцянскай і Новазапонскай. У гэты ж час пачалося будаўніцтва аэрадрома ў самім Бягомлі. На працягу 3—4 перадваенных гадоў у пачатку сакавіка ў кожным сельсавеце праводзіўся ветэрынарны агляд конскага пагалоўя на прадмет прыгоднасці калгасных коней да вайсковай службы. Кожнаму калгасу як першачарговы абавязак трэба было мець армейскую фурманку, а калі калгас быў вялікі — то і дзве.

Са школ у Чырвоную Армію прызываліся ў якасці камандзіраў настаўнікі з тых, якія пасля дзесяцігодкі адразу паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Спачатку іх накіроўвалі ў ваенныя вучылішчы, а пасля кароткатэрміновых курсаў — у войскі. Вялікая ўвага ў школах надавалася стралковаму і санітарнаму гурткам. Штогод вясной у райцэнтры праводзіліся спаборніцтвы паміж гуртакоўцамі ўсіх сярэдніх і няпоўных сярэдніх школ на лепшага санітара, «варашылаўскага стралка» ці спартсмена. Профілю гэтых гуртакоў адпавядалі і нагрудныя значкі «Юны варашылаўскі стралок», ГСА (Гатоў да санітарнай абароны), БГПА (Будзь гатоў да працы і абароны), ППХА (Проціпаветраная і хімічная абарона), ГПА (Гатоў да працы і абароны). Іх з гонарам насілі вучні і настаўнікі.

Насцярожваў мясцовых жыхароў і той факт, што Усходняя і Заходняя Беларусь аб'ядналіся, а граніца па р. Поня не знята: пагранічнікі па-ранейшаму затрымліваюць парушальнікаў, адводзяць іх на заставу і складаюць пратаколы.

Прадстаўнікі раённага ваенкамата ў 1938—40 гг. часта наведвалі старэйшыя класы сярэдніх школ і агітавалі юнакоў паступаць у ваенныя вучылішчы.

Самай трывожнай весткай блізкай трагедыі быў гул самалёта высока ў небе. Да зямлі далятаў гук рухавіка, сам жа самалёт быў амаль нябачны для няўзброенага вока, і трэба было доўга і ўважліва ўглядацца ў нябесны блакіт, каб заўважыць яго. Звычайна спачатку самалёт павольна рухаўся з глыбіні Польшчы перпендыкулярна дзяржаўнай граніцы, потым разварочваўся на Захад і знікаў. Падлеткі і юнакі ўспрымалі ўсё гэта лёгкадумна, старэйшыя ж з трывогай і глыбокім роздумам: «Бог ведае, што будзе».

Як толькі пачыналася жніво, усё раённае і сельсавецкае начальства патрабавала ад калгасаў, каб яны як мага хутчэй здавалі нарыхтоўку. Удзень малацілі, а праз ноч везлі абозам збожжа на здатачны пункт. Бягомльшчына ўсю сваю нарыхтоўку ў 1939—40 гг. дастаўляла на прыстань у в. Брод. Там зерне вельмі прыдзірліва правяралася на наяўнасць кляшча і засмечанасць. Калі паразіта ці смецце выяўлялі, адразу ж прапускалі зерне праз арфу і толькі тады ссыпалі ў баржы. А там

яно ішло па гандлёвай дамоўленасці ў Германію.

Пры тэлефонных апаратах і ў фельчарскіх пунктах арганізавалі начныя дзяжурствы камсамольцаў.

Вучні-дзесяцікласнікі, у канцы мая — пачатку чэрвеня 1941 г., яшчэ здаючы экзамены, пачыналі прапытваць у мясцовых канторах — МТС, сельпо, сельсаветах — каб на летнія 2—3 месяцы ўладкавацца ды зарабіць якую сотню грошай. Хаця вакансіі і былі, але юнакам звычайна адмаўлялі. На што бацькі казалі: «Начальства ўсё ведае. Будзе, будзе вайна».

І вайна пачалася.

Раніцай 23 чэрвеня ў напрамку чыгункі і ст. Параф'янава пачаўся гул самалётаў і выбухі.

Паявіліся першыя бежанцы. З в. Чысці, дзе праходзіла паласа былой савецка-польскай граніцы, у в. Бярозкі на ўспацелых і стомленых конях прыехала некалькі фурманак з людзьмі розных узростаў — ад малых да сталага веку жанчын. Гэта былі сем'і савецкіх работнікаў, пасланых пасля верасня 1939 г. ў заходнія вобласці Беларусі для будаўніцтва новага жыцця. Яны далі час перадыхнуць коням, падкармілі іх, самі прагналі смагу і шпарка рушылі бліжэй да чыгункі.

А 2 ліпеня на шашы Барысаў—Бягомль каля в. Зарэчча (цяпер Барысаўскі раён) у бой з нямецкімі часцямі, якія рухаліся да лініі фронту, уступіў дывізіён 202-га ап 50-й сд пад камандаваннем маёра У.В.Дабрасердава. Бой працягваўся двое сутак, агнём артылерыі дывізіёна былі знішчаны 4 танкі, 2 бронетранспарцёры, да 2 рот нямецкай пяхоты. Дывізіён, хаця і сам панёс немалыя страты, выйшаў з акружэння каля в. Ніўкі Бягомльскага раёна, забяспечыўшы пры гэтым выхад з акружэння яшчэ двух падраздзяленняў 202-га ап. За гэты бой камандзір дывізіёна Уладзімір Васілевіч Дабрасердаў, малодшы сержант І.А.Свістэнка, камандзір узвода старшы сяржант І.І.Барыкін, наводчык гарматы чырвонаармеец Н.Кансейтаў, камандзір танкавага ўзвода М.Д.Кавардакаў, камандзір танка старшы сяржант А.А.Кузняцоў былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

3 ліпеня сакратар Бягомльскага райвыканкома Руткоўскі патэлефанаваў у Бярозкаўскі сельсавет: «У Бягомль прыйшлі тры нямецкія танкі. Адзін танк падбіў звязкай гранат механік Бягомльскай МТС Станкевіч. Танкі спыніліся. Потым адзін развярнуўся, узяў на буксір падбіты і ўсе тры рушылі пад Плешчаніцы». Атрымаўшы такое паведамленне, больш за 20 актывістаў сельсавета ў той жа дзень селі на грузавік Бярозкаўскай МТС і накіраваліся ў Бягомль. Сярод іх знаходзіліся дырэктар Бярозкаўскай СШ А.І.Стаскевіч, намеснік дырэктара МТС па палітрабоце Ю.С.Забалоцкі, старшы піянерважаты школы В.Шпак, бухгалтар Бярозкаўскага сельпо П.Мятліцкі. За рулём сядзеў Бардыка. Каля в. Вітунічы яны сустрэліся з групай пагранічнікаў, якія ўзброілі бярозкаўцаў вінтоўкамі і гранатамі. Бярозкаўцы прыехалі ў Бягомль, дзе ўбачылі нашых вайскоўцаў і міліцыю. Назваўшы сябе народным апалчэннем, вырашылі абараняць Бягомль сваімі сіламі. У бярозкаўскай групе камандзірам абралі А.І.Стаскевіча і вызначылі напрамак абароны: на Докшыцы, пад в. П'яны Лес (цяпер в. Сасновая). Прыбыўшы на месца, занялі абарону. Тут Стаскевіч аб'явіў, што заўтра ўсёй групай паедуць у савецкі тыл. Праз некаторы час з боку Бягомля пачулася страляніна. Пасланая туды разведка вярнулася і паведаміла, што праз раённы цэнтр на Лепель рухаюцца нямецкія войскі. Перад «апалчэнцамі» паўстала пытанне: як быць далей? У сітуацыі, што склалася, рашэнне прымаў кожны сам. Стаскевіч і Забалоцкі пайшлі даганяць фронт. Бардыка спаліў грузавік, разам са Шпакам і Мятліцкім схавалі ў лесе вінтоўкі і пайшлі ў Бярозкі. Вярнуліся дадому і астатнія.



У.В.Дабрасердаў.

Апошняя рота пагранічнікаў Бярэзінскага пагранатрада вырашыла прыпыніць рух немцаў на лепельскім напрамку і заняла абарону на ўскрайку лесу за р. Бярэзіна. На прахадной заставы пакінулі вартавога, каб ён стрэлам даў знак, што немцы ўжо тут. Пры паяў-



А.М.Панчанка.



Г.К.Раманенка.

ленні ворага пагранічнік так і зрабіў, фашысты скасілі байца кулямётнай чаргой.

Яшчэ фронт не дайшоў да нас, а ў сельсавет пачалі прыводзіць «палонных». Гэта былі нашы лётчыкі са збітых самалётаў, якіх мясцовыя жыхары прымалі за нямецкіх шпіёнаў, затрымлівалі і дастаўлялі ў сельсавет. Адтуль звязваліся з ваенкаматам і адпраўлялі іх у Бягомль.

Ляснымі сцежкамі і абочынамі бойкіх дарог са зброяй і без яе, сарваўшы пятліцы са знакамі адрознення, пераапранаючыся ў вёсках у цывільную вопратку, ішлі на ўсход акружэнцы. На папрокі за адступленне яны вінавата, але пераканаўча абяцалі: «Хоць да Урала дойдзем, але назад вернемся, прагонім немцаў!»

*В.І.Скараход.*

## Стралок-радыст расказвае...

«Я — былы стралок-радыст Н-скага авіяпалка Папоў Пётр Кліменцевіч, 1918 года нараджэння, ураджэнец і жыхар сяла Калікіна Аляксандраўскага раёна Арэнбургскай вобласці».




Помнік на магіле лётчыкаў Г.К.Раманенкі і А.М.Панчанкі ва ўрочышчы Калюга каля в. Новае Запонне.

Такімі радкамі пачыналася пісьмо, якое я атрымаў у снежні 1966 г. ад чалавека дзіўнага лёсу, ад таго, хто падобна Васілю Цёркіну, легендарнаму герою вядомай паэмы Аляксандра Твардоўскага, пабываў на «тым свеце» і зноў вярнуўся ў строй.

Докшыцкая раённая газета «Ленінская трыбуна» на працягу 1966 г. неаднаразова пісала аб савецкім двухматорным бамбардзіроўшчыку, які ўпаў і згарэў ва ўрочышчы Калюга на правабярэжжы Поні 29.6.1941 г. На месцы падзення самалёта пасля выступленняў газеты пастаўлены помнік загінуўшым лётчыкам — камандзіру экіпажа, намесніку камандзіра эскадрыллі па палітчастцы лейтэнанту Г.К.Раманенку і штурману малодшаму лейтэнанту А.М.Панчанку.

Між тым працягваліся пошукі стралка-радыста старшага сяржанта Папова. У час катастрофы ён цудам застаўся жывы і ў беспрытомным стане быў дастаўлены ў Бягомльскую бальніцу. Здарылася так, што гітлераўцы нечакана захапілі Бягомль. Бальніцу не ўдалося эвакуіраваць. Дзесяткі раненых чырвонаармейцаў аказаліся ў драматычным становішчы. Але трывожыліся яны дарэмна: сярод медыцынскага персаналу бальніцы не знай-

П.К.Папоў і Я.П.Сырнікава. Фота 1960-х г.



шлося фашысцкіх халуёў. Сапраўдныя патрыёткі Радзімы — урач Яніна Пятроўна Сырнікава, медсястра Ядвіга Іосіфаўна Саковіч, санітаркі, няні выратавалі нашых байцоў. «Сярод нашых хворых няма ваенных», — заявіла гестапаўскаму афіцэру Я.П.Сырнікава.

Пад выглядам пацярпеўшага мясцовага жыхара лячыўся і стралок-радыст Пётр Папоў. Ён пісаў:

«Твар, рукі і ногі былі абпалены. На нагах — апёкі 3-й ступені. З рук злезлі ўсе пазногці, я сам не мог нават напіцца. З апёкамі ног 9 месяцаў ляжаў на спіне. Але дзякуючы медработнікам і асабліва ўрачу Я.П.Сырнікавай, я выжыў. Яна вельмі ўважліва адносілася да раненых чырвонаармейцаў. У бальніцы не было ні медыкаментаў, ні прадуктаў. Усё гэта медработнікі даставалі ў мясцовага насельніцтва, і мы з голаду не памерлі...»

Пётр Кліменцевіч пісаў, што ў пачатку 1943 г., пасля таго як варожы гарнізон у Бягомлі быў знішчаны партызанскай брыгадай «Жалязняк», яго разам з іншымі раненымі чырвонаармейцамі і партызанамі адправілі самалётам на «Вялікую зямлю», г.зн. за лінію фронта. Пасля лячэння ў ваенным шпіталі камісія прызнала старшага сяржанта Папова непрыдатным па стану здароўя для далейшай службы ў авіяцыі і наогул у арміі. З таго часу Пётр Кліменцевіч жыў у родным сяле Калікіна, да выхаду на пенсію працаваў сакратаром выканкома сельскага Савета. Жонка яго працавала медсястрой. У Паповых дзве дачкі, з якімі Пётр Кліменцевіч вясной 1967 г. прыязджаў у наш раён, каб пакланіцца праху сваіх баявых сяброў, паглядзець абеліск, наведаць Бягомль.

Чытачам, бясспрэчна, цікава даведацца, пры якіх абставінах разбіўся ў Калюзе наш бамбардзіроўшчык СБ. Вось што аб гэтым расказвае П.К.Папоў:

«Наш авіяполк з першага дня вайны пачаў баявыя дзеянні. 5 разоў вылятаў наш экіпаж на бамбёжку ворага. Бамбрадзіравалі скапленні гітлераўскіх войск у Гродна, Лідзе і іншых прыгранічных гарадах, а таксама на маршы. Нас абстрэльвалі з зенітак, атакавалі «месершміты». За кароткі перыяд полк страціў 6 самалётаў.

І вось на шостым баявым вылеце не вярнулася на аэрадром наша машына. У пары з другім самалётам мы ляцелі ў разведку. Трэба было выявіць варожыя мотамехчасці і перадаць па рацыі ў полк іх каардынаты. Неба кішэла нямецкімі знішчальнікамі. Нас жа — 2 самалёты... Прыйшлося ляцець «у прыцірку да зямлі». Над Бягомльскім раёнам трапілі ў суцэльную нізкую воблачнасць. Я нечакана адчуў, што самалёт моцна ўстрасянула. Я стаяў у сваёй кабіне і ледзь не ўпаў. І ў тое ж імгненне ўбачыў пад самалётам лес. Успеў толькі падумаць: «Вось і ўсё».

...Я ляжаў на спіне галавой да матораў. Апрытомнеў ад нясцерпнай гарачыні, ад страшнага пякучага болю. Сабраўшы апошнія сілы, выпаўз з самалёта, скінуў камбінезон,

які гарэў, і рукамі стаў тушыць агонь на штанах».

Што было далей, Папоў не памятаў. Апрытомнеў ён ў бальніцы ў момант, калі па палатах расхаджвалі немцы.

П.К.Папоў у 1954 г. ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. *Я.Пашэвіч.*

## Акупацыйны рэжым

Акупацыйная палітыка на захопленых тэрыторыях нашай Радзімы распрацоўвалася верхаводамі нацысцкай Германіі яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яе накірункі былі выкладзены рэйхсфюрэрам СС Г.Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25.5.1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншаземнага насельніцтва» ў напаўпісьменных рабоў.

Ад мясцовага насельніцтва асаблівых праблем нацысты не чакалі: бязлітасны гвалт і тэрор павінны былі зрабіць яго паслухмяным і згаворлівым.

Тэрор, як галоўны метад насаджэння «новага парадку» на акупіраванай тэрыторыі, у тым ліку і Беларусі, планаваўся загадзя. Так, у «Кіруючых указаннях аб паводзінах войск у Расіі», распрацаваных штабам Вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброеных сіл Германіі (ОКВ) у якасці дадатка да асобага распараджэння № 1 ад 19.5.1941 г. па рэалізацыі дырэктывы Гітлера № 21, прама ўказвалася на неабходнасць бязлітасных і рашучых дзеянняў супраць «бальшавіцкіх» падбухторшчыкаў, партызан, сабатажнікаў, яўрэяў і поўнага падаўлення любой спробы актыўнага або пасіўнага супраціўлення.

13.5.1941 г. начальнік штаба ОКВ В.Кейтэль падпісаў распараджэнне Гітлера «Аб ваеннай падсуднасці ў раёне «Барбароса» і асобных паўнамоцтвах войск». Гэта распараджэнне з'явілася тым самым афіцыйным дакументам, які здымаў з салдат і афіцэраў вермахта юрыдычную і маральную адказнасць за забойствы цывільнага насельніцтва на тэрыторыі нашай краіны.

У адпаведнасці з гэтым і іншымі распараджэннямі і загадамі любы чыноўнік акупацыйнага апарата, паліцэйскі, афіцэр і салдат вермахта маглі паводле свайго меркавання распараджацца жыццём савецкіх грамадзян, не кажучы ўжо пра іх маёмасць. Была ўведзена злачынная сістэма заложніцтва і г.д.

Акупацыйная палітыка фашысцкай Германіі на нашай зямлі ўяўляла сабой адзіны комплекс ваенных, палітычных, эканамічных і ідэалагічных мерапрыемстваў, а па сваіх мэтах і сутнасці насіла адкрыта варварскі, рабаўніцкі характар. Планы па яе ажыццяўленні распрацоўваліся галоўным чынам у ведамстве рэйхсфюрэра СС Г.Гімлера. З красавіка 1941 г. такім планаваннем занялося «Бюро па цэнтралізаваным вырашэнні праблем усходнееўрапейскай прасторы» на чале з Розенбергам, да яго падключыліся і розныя аддзелы ОКВ. У далейшым усе абагуленыя праекты і прапановы атрымалі назву «Генеральны план «ОСТ», прычым ён пастаянна дапаўняўся і ўдакладняўся.

План «ОСТ» — асноўны, хаця і не адзіны дакумент, які раскрываў сапраўдныя мэты гітлераўцаў. Менавіта ў ім ярчэй за ўсё ўвасобіліся ідэі генацыду, каланізацыі захопленых тэрыторый, германізацыі — гэта значыла высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі.

Ажыццяўленне каланіяльных планаў акупанты з нямецкай педантычнасцю пачалі з першых дзён уварвання перакройкай граніц рэспублік Савецкага Саюза і стварэннем адміністрацыйнага кіравання.

Зацверджанае летам 1941 г. Упраўленне акупіраваных тэрыторый з'явілася адлюстраваннем таго, што Гітлер не ўспрымаў ніякіх іншых рашэнняў, акрамя «поўнай каланізацыі» захопленых тэрыторый.

План расчлянення Савецкага Саюза прадугледжваў стварэнне на яго акупіраваных тэрыторыях чатырох рэйхскамісарыятаў: Остланд, Украіна, Каўказ, Расія (ці Масковія).

У адпаведнасці з гэтымі планамі быў зроблены і падзел Беларусі, які восенню 1941 г. быў у асноўным завершаны. Яе этнаграфічную цэласную тэрыторыю захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым гістарычную супольнасць тэрыторыі,

мовы, культуры беларускага народа. Тэрыторыю Беларусі на лініі Полацк – Барысаў на ўсходзе, Старыя Дарогі — возера Чырвонае на поўдні, па р. Зяльвянка і ўсходнім узлессі Белавежскай пушчы на захадзе вылучылі ў генеральную акругу, якая атрымала назву «Беларутэнія». Плошча акругі склала толькі чвэрць тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3 138 256 чалавек па стану на 4.12.1941 г. Гэта тэрыторыя была ўключана ў склад рэйхскамісарыята «Остланд» (з цэнтрам у Рызе) і падзелена на 10 акруг (гебітаў): Баранавіцкую, Барысаўскую, Вілейскую, Ганцавіцкую, Глыбоцкую, Лідскую, Мінскую, Навагрудскую, Слонімскую, Слуцкую (1.4.1944 указам Гітлера Генеральная акруга «Беларутэнія» была выдзелена з рэйхскамісарыята «Остланд» у самастойны камісарыят і перададзена ў непасрэднае падпарадкаванне рэйхскамісарыята па справах акупіраваных абласцей на Усходзе, які ўзначальваў Розенберг. Матывіруючы гэта, рэйхскамісар «Остланда» Лозэ пісаў, што Беларусь, якая з'яўляецца раёнам напружаных баявых дзеянняў, не можа больш разглядацца як тылавы раён, што ўзмоцненая дзейнасць партызан ускладняе палітычнае ўпраўленне і перашкаджае арганізацыйнай рабоце). У кожную акругу ўваходзіла некалькі раёнаў. У Мінскую акругу ўваходзілі Бягомльскі і Докшыцкі раёны.

Паўднёвыя раёны Гомельскай, Пінскай і Палескай абласцей, частка Брэсцкай вобласці былі ўключаны ў рэйхскамісарыят «Украіна». Беластоцкая вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі да акругі «Беласток», якая далучалася да Усходняй Прусіі. Часткі Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучаліся да Генеральнай акругі «Літва». Віцебскую, Магілёўскую і ўсходнія раёны Мінскай абласцей, а таксама большую частку Гомельскай вобласці аднеслі ў зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр». У гэтай зоне ўся ўлада была сканцэнтравана ў руках ваенных інстанцый. Ім падпарадкоўваліся начальнікі тылавых раёнаў разам з палявымі і гарнізоннымі (мясцовымі) камендантамі, ахоўныя дывізіі і іншыя войскі спецыяльнага прызначэння. У гэтай вялізнай прыфрантавой зоне да ўпраўлення ў нязначнай ступені прыцягваліся мясцовыя органы ўлады, але толькі ў населеных пунктах.

Штучна разарваўшы цэласную тэрыторыю рэспублікі і ўводзячы новыя межы, гітлераўцы лічылі, што гэта палегчыць ім ператварэнне Беларусі ў германскую калонію.

Загадам Гітлера ад 25.6.1941 г. ўся паўната ўлады на акупіраванай тэрыторыі перадавалася камандуючаму вермахта. Нямецкая цывільная ўлада засяроджвалася ў руках рэйхскамісара, генеральных камісараў, гебітскамісараў, гарадскіх камісараў і розных «шэфаў» і камендантаў, на пасады якіх прызначаліся толькі немцы.

Для больш эфектыўнага правядзення сваёй злачыннай палітыкі акупанты жадалі заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва. Для прыдання бачнасці мясцовага самакіравання яны стваралі марыянетачную так званую «дапаможную мясцовую ўладу» — раённыя ўправы пры шэфах раёнаў на чале з бургамістрамі, на тэрыторыях былых сельсаветаў былі створаны валасныя ўправы, якія ўзначальвалі бургамістры, ці старшыны, як іх іншы раз называлі, у кожную вёску прызначылі стараст. Мясцовая адміністрацыя павінна была садзейнічаць акупантам у зняволенні савецкіх людзей, у рабаванні і вывазе з раёна матэрыяльных і людскіх рэсурсаў.

Цывільная акупацыйная адміністрацыя абапіралася на ўзброеныя сілы вермахта і фашысцкія карныя органы.

Каланіяльны рэжым на Беларусі, у тым ліку і на тэрыторыі Бягомльскага і Докшыцкага раёнаў, падтрымліваўся густой сеткай карных органаў, такіх як паліцыя бяспекі і СД, СС, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя парадку і іншых.

Усе савецкія законы на часова акупіраванай тэрыторыі фашысты абвясцілі несапраўднымі, пазбавіўшы насельніцтва практычна любых грамадзянскіх правоў. Замест іх акупацыйныя ўлады выдавалі загады пра «новы парадак», якія заканчваліся адной фразай: «Вінаватыя будуць пакараны смерцю». Жорстка рэгламентавалася ўсё жыццё людзей.

У правядзенні сваёй палітыкі ў акупаваных раёнах гітлераўцы шырока выкарыстоўвалі здраднікаў, людзей, пакрыўджаных у свой час савецкай уладай. Яны складалі галоўную апору акупантаў у стварэнні мясцовых органаў улады, дапаможнай паліцыі. Іх гітлераўцы прыцягвалі да выканання самых ганебных даручэнняў у барацьбе супраць свайго народа, партызан і падпольшчыкаў. Шырока выкарыстоўвалі мясцовых паліцэй-

скіх акупанты і ў карных аперацыях супраць партызан і насельніцтва.

У Докшыцкім і асабліва ў Бягомльскім раёне стварэнне мясцовай акупацыйнай улады на першым этапе акупацыі мела свае асаблівасці. Пры арганізацыі валасцей і паліцэйскіх участкаў падпольшчыкі змаглі засланць туды сваіх людзей. Так, напрыклад, у Домжарыцкай валасці ўвесь апарат кіравання быў укамплектаваны выключна з засланых патрыётаў. Бургамістрам валасці стаў Юрый Шымко (камсамолец), сакратаром Іван Кліманскі (член партыі), пісарам — Вольга Стральчонак (камсамолка). І ў паліцыю пры гэтай жа валасці быў накіраваны ў якасці начальніка Іван Аўдзеевіч Машкевіч (камсамолец). Бургамістрам в. Бярозкі быў накіраваны І.К.Насеннік (член партыі). У адміністрацыю валасцей, у паліцыю на пасады стараст вёсак былі накіраваны таксама надзейныя, правераныя людзі.

Працуючы ў акупацыйных установах і арганізацыях, засланыя туды падпольшчыкі ўсімі даступнымі ім метадамі зрывалі мерапрыемствы гітлераўцаў; прыпісваючы у раёне, ратавалі савецкіх ваеннапалонных, якія потым усе ўліліся ў партызанскія атрады.

Калі нямецкія ўлады выдалі афіцыйнае распараджэнне бургамістрам валасцей, каб яны прадставілі спісы членаў партыі і камсамола для далейшага іх знішчэння, такія «бургамістры» афіцыйна паведамлялі нямецкім уладам, што на тэрыторыі іх валасных упраў камуністаў і камсамольцаў няма, а тыя, хто быў, усе пайшлі з адступаючай Чырвонай Арміяй. Так, бургамістр І.К.Насеннік выратаваў такім чынам звыш 40 чалавек у сваёй воласці.

Начальнік паліцыі Домжарыцкай воласці І.А.Машкевіч па дамоўленасці з партызанамі зняў двух вартавых і гэтым самым забяспечыў партызанам магчымасць без выстралаў знішчыць ноччу ў казарме паліцэйскі атрад, забраць усю зброю і боепрыпасы. Сам Машкевіч пасля гэтага пайшоў у партызанскі атрад.

Калі нямецкія ўлады вырашылі арганізаваць з мясцовага насельніцтва атрады так званай самаахові для барацьбы з партызанамі, добраахвотнікаў з мясцовых жыхароў не знайшлося. Тады гітлераўцы вырашылі правесці мабілізацыю мужчынскага насельніцтва. Такім шляхам ім удалося ўкамплектаваць атрад колькасцю 60 чалавек замест плануемых 400. Пры арганізацыі атрада самаахові падпольны райком КП(б)Б заслаў для яго разлажэння сваіх людзей, якія, праводзячы гэту работу, дабіліся поспеху. Гэты атрад праіснаваў усяго 2 тыдні, пасля чаго разбегся, большая яго частка ўступіла ў партызанскія атрады.

Нямецкія органы ўлады на тэрыторыі Докшыцкага раёна ў пачатковы перыяд акупацыі імкнуліся як мага больш выкачаць харчавання для забеспячэння сваёй арміі. З гэтай мэтай былі ўстаноўлены натуральныя падаткі. Яны складалі ў сярэднім па 3—4 ц збожжа з гектара, 350—400 л малака з адной каровы, 100 кг мяса з аднаго сялянскага двара, 1,5 кг воўны, 35 яек з адной курыцы.

Пазней быў уведзены так званы «ваенны падатак», які прадугледжваў значнае павелічэнне раней устаноўленых норм здачы. Яго памер залежаў не ад колькасці зямлі і жывёлы, а ад таго, колькі патрабавалася ўсяго акупантам для забеспячэння іх патрэб.

Акрамя гэтага былі ўведзены розныя грашовыя падаткі: падушны — па 50 руб. з кожнай душы, за дом і надворную пабудову — 150 руб., за ўтрыманне сабакі 100—150 руб., кошкі — 50 руб.

Падаткаў было так многа, што большасць сялян проста не маглі іх выканаць.

Неабходна зазначыць, што пэўная частка падаткаў збіралася акупантамі рэгулярна толькі да восені 1942 г. Са снежня 1942 г., калі раён быў поўнасцю вызвалены партызанамі, збор іх зусім спыніўся.

З мэтай падаўлення супраціўлення насельніцтва, запалохвання яго, ізаляцыі ад тых, хто актыўна змагаўся, а таксама падрыву эканамічнай базы партызан і падпольшчыкаў, акупантамі пастаянна праводзіліся карныя экспедыцыі. Гэтыя меры адначасова з'яўляліся сродкам загадзя запланаванага гітлераўцамі знішчэння насельніцтва.

Карныя экспедыцыі ажыццяўляліся войскамі вермахта, атрадамі паліцыі бяспекі і СД, часцямі СС, зондэркамандамі, паліцэйскімі і іншымі карнымі фарміраваннямі акупантаў.

У Докшыцкім раёне нямецка-фашысцкія захопнікі правялі буйныя карныя экспедыцыі ў верасні 1941 г., у маі—чэрвені 1943 г. пад кодавай назвай «Котбус», у снежні 1943 г. — «Карл», у красавіку 1944 г. — «Дождж, які імжыць», «Лівень», у маі—чэрвені 1944 г. —

«Баклан», у красавіку—маі 1944 г. «Свята вясны».

У час правядзення карных экспедыцый гітлераўцы чынілі нябачныя зверствы і гвалт над цывільным насельніцтвам. Дзесяткі вёсак сціраліся з твару зямлі, жыхары іх знішчаліся, уганяліся ў канцлагеры ці ў фашысцкае рабства, а іх маёмасць рабавалася. У Докшыцкім і Бягомльскім раёнах яны знішчылі 115 вёсак з колькасцю двароў 4654, расстралялі, спалілі жывымі, закатавалі 21 590 чалавек.

У пасляваенны час большасць спаленых вёсак раёна былі адноўлены на ранейшых месцах, але тры з іх — в. Шунеўка Бягомльскага пасялковага Савета, Азарцы і Залатухі Параф'янаўскага сельсавета — раздзялілі лёс Хатыні.

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму быў генацыд у адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Нашэсце нямецкіх войск на нашу краіну павінна было садзейнічаць «канчатковаму вырашэнню яўрэйскага пытання». Антысемітызм гітлераўцы зрабілі асноўным пунктам сваёй прапаганды, якая была накіравана на насельніцтва Беларусі. Акупацыя падавалася імі як ратаванне жыхароў рэспублікі ад «яўрэйскага бальшавізму».

Паводле распараджэння Гітлера фашысцкія кіраўнікі загадзя пачалі распрацоўваць план «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання», што азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў... Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Эйхмана, якому Гітлер даручыў выкананне гэтай праграмы, на акупаваных тэрыторыях было забіта 6 мільёнаў яўрэяў, што складала $^1/_3$ частку яўрэяў усяго свету.

Звярыную палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з небывалай жорсткасцю праводзілі на ўсёй часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Міншчыне. Сюды следам за войскамі вермахта прыбылі айнзацкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы, у абавязкі якіх разам з вермахтам уваходзіла і вырашэнне «яўрэйскага пытання». Усе гэтыя органы і часці былі ўкамплектаваны спецыяльна падабранымі асобамі, якія былі выхаваны ў духу нацызму і вызначыліся асаблівай жорсткасцю ў адносінах да людзей іншых нацыянальнасцей. Менавіта яны адразу ж аддзялялі яўрэяў ад мясцовых жыхароў, заганялі іх у гета.



На папялішчы в. Вітунічы, спаленай карнікамі.

Загады палявых і мясцовых камендатур па стварэнні гета выдаваліся паўсюдна: у Бабруйску, Баранавічах, Брэсце, Мазыры, Лідзе, Мінску, Докшыцах, Бягомлі, Параф'янаве і іншых месцах Беларусі. У асноўным ствараліся гета закрытага тыпу. Іх тэрыторыі былі абнесены калючым дротам, ахоўваліся гітлераўскімі салдатамі і паліцыяй.

Паводле распараджэння нямецкіх акупацыйных улад яўрэям забаранялася самавольна пакідаць гета, мяняць месца жыхарства і кватэры ў гета, карыстацца тратуарамі, грамадскім транспартам, паркамі і грамадскімі ўстановамі, наведваць школы.

Для яўрэяў уводзілася абавязковае нашэнне апазнавальных знакаў — акруглыя латы і шасціканцовыя зоркі жоўтага колеру, нарукаўныя павязкі з шасціканцовымі зоркамі.

Амаль да ліквідацыі гета яўрэі павінны былі прымусова выконваць работу для акупантаў, пры якой многія з іх паміралі з-за нечалавечых умоў жыцця і працы, з-за адсутнасці медыцынскай дапамогі.

У доўгім спісе злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі, у тым ліку і ў Докшыцкім раёне, асаблівае месца займае прымусовы вываз цывільных жыхароў на фашысцкую катаргу ў Германію. Для правядзення ў жыццё гэтай праграмы быў створаны спецыяльны апарат на чале з прызначаным Гітлерам «галоўным упаўнаважаным па выкарыстанні рабочай сілы» Заўкелем.



Жылыя баракі рабочага лагера ў г. Кёльн, Германія. 1943 г.



Жыхарка в. Кляпіцы М.І.Чарнецкая — былы вязень рабочага лагера ў г. Кёльн, Германія.

Каб ажыццявіць злачынныя планы масавага ўгону савецкіх людзей на катаргу ў Германію, нямецкія захопнікі станавіліся на шлях падману, пагроз, правакацый. Ужо ў 1941 г. яны распачалі на Беларусі, у тым ліку і ў Докшыцкім раёне, кампанію «добраахвотнай» вярбоўкі рабочай сілы на работу ў Германію. Людзей запэўнівалі, што ў Нямеччыне яны будуць мець добры заробак, жыллё, набудуць спецыяльнасць, «пабачаць Захад» і г.д.

Але поспеху гэтыя абяцанні не мелі. Убачыўшы, што «добраахвотная» кампанія сарвалася, акупанты, пачалі літаральнае паляванне на людзей. Гаспадарчай інспекцыі групы армій «Цэнтр» і Генеральнай акрузе Беларутэнія прадпісвалася кожны дзень пасылаць у рэйх 500—1000 рабочых.

Гітлераўцы ішлі на ўсё, каб выканаць план «мабілізацыі» рабочай сілы. Яны праводзілі масавыя аблавы, на вуліцах, на базарах арыштоўвалі працаздольных і гвалтоўна адпраўлялі іх у Нямеччыну.

На асобым уліку ў фашысцкіх захопнікаў былі жыхары, якія жылі ў партызанскіх зонах. Яны аб'яўляліся «бандытамі» ці «саўдзельнікамі бандытаў», ставіліся па-за законам і падлягалі знішчэнню ці пагалоўнаму вывазу ў рабства.

Усяго па тагачаснаму Докшыцкаму раёну гітлераўцамі было ўгнана на катаргу ў Германію 716 чалавек.

Умовы жыцця і працы савецкіх людзей у Германіі былі выключна цяжкія. Яны рэгламентаваліся спецыяльнай інструкцыяй, у якой гаварылася, што «ўсе рабочыя павінны атрымліваць такую ежу і такое жыллё і падвяргацца такому абыходжанню, якія давалі б магчымасць эксплуатаваць іх у самай высокай ступені і пры самых мінімальных затра-

тах». Непасільная праца, голад, антысанітарыя прыводзілі да ўзнікнення сярод вывезеных шматлікіх захворванняў і вялікай смяротнасці. Ратаванне савецкіх людзей ад вывазу ў фашысцкае рабства было адной з важнейшых задач падпольных партыйных органаў, партызан і падпольшчыкаў.

Усе правакацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў, накіраваныя на зняволенне беларускага народа, яго знішчэнне, закончыліся правалам. Працоўныя Докшыцкага раёна, як і ўсёй Беларусі, не сталі на калені перад акупантамі, не схілілі галавы ў рабстве, яны змагаліся.

*У.І.Лемяшонак.*

## Так пачалася акупацыя

22 чэрвеня стаяла сонечнае надвор'е, таму большасць жыхароў горада збіралася правесці дзень адпачынку ў лесе, на рэчцы павудзіць рыбу. Але ўжо ў 10 гадзін аднекуль прыйшла вестка, што пачалася вайна. Праўда, гаварылі аб гэтым ціхенька, баяліся, а раптам няпраўда. За распаўсюджванне падобных чутак у той суровы час маглі быць вялікія непрыемнасці. Але потым было аб'яўлена, што трэба ў 12 гадзін сабрацца ўсім гараджанам у клубе для таго, каб паслухаць паведамленне ўрада па радыё. Клуб тады знаходзіўся на сучаснай вуліцы Палявога. У 12 гадзін ля яго сабраўся ўвесь горад. Моўчкі праслухалі выступленне па радыё В.М.Молатава. Потым адбыўся мітынг.

23 чэрвеня было першым днём мабілізацыі насельніцтва ў Чырвоную Армію. Прызыўная камісія працавала ў памяшканні клуба. Толькі ўсё яшчэ не хацелася верыць, што пачалася вайна. Але вечарам гэтага дня паверылі ўсе: фашысцкая авіяцыя пачала бамбіць Круляўшчыну, Параф'янава. Адну бомбу з самалёта скінулі недалёка ад Докшыц на полі, дзе зараз знаходзіцца падстанцыя. Другую — на старую дарогу ля вёскі Рашкаўка. Потым самалёты абстралялі з кулямётаў статак кароў ля Чыстаполля. Такім было першае знаёмства з нямецкай зброяй. Вечарам пачалася эвакуацыя сем'яў савецкіх служачых на ўсход краіны. Правялі яе вельмі хутка, дзесьці за 2—3 гадзіны. А потым праз горад пайшлі бежанцы і адступаючыя часці Чырвонай Арміі, якія накіроўваліся на Лепель і Барысаў. Раніцай наступнага дня ў горадзе з'явіліся работнікі НКУС і міліцыі, якія потым начаваць хадзілі ў лес. Ва ўсім астатнім жыццё не змянілася. Выпякалі хлеб, працавалі магазіны і сталовая.

2 ліпеня мы з братам раніцай пайшлі за хлебам. Сталі на рынкавай плошчы (зараз плошча імя І.С.Палявога), чакаем, пакуль прывязуць хлеб. А насупраць плошчы стаяў двухпавярховы будынак гасцініцы, на даху якога з пачатку вайны пабудавалі пост паветранага назірання, паведамлення і сувязі. Там заўсёды знаходзіўся баец. Раптам бачым — ён некуды знік. А праз некалькі хвілін з вуліцы Пушкіна на плошчу выехалі тры легкавушкі, у кожнай сядзелі па пяць немцаў. Людзі спужаліся, разгубіліся, а немцы выйшлі з машын, праўда не ўсе, і адзін пачаў клікаць: «Ком, ком!». Адгукнуўся на запрашэнне малады яўрэй і загаварыў з ім. Убачыўшы, хто перад ім, немец схапіўся за аўтамат і закрычаў: «Юдэ, вэк!» Усе аслупянелі. Яўрэй кінуўся наўцёкі. Тады да салдат падышоў пажылы грамадзянін, які ў першую сусветную вайну быў у немцаў у палоне і таму ведаў нямецкую мову. Яны трохі з ім пагутарылі, селі ў машыны і паехалі зноў на Даўгінава. А людзі разбегліся па хатах. Прыйшлі дадому і мы з братам. Жылі мы тады там, дзе зараз знаходзіцца тэрыторыя аўтабазы райспажыўсаюза. У гэты час работнікі міліцыі, НКУС, байцы Чырвонай Арміі ішлі з Чыстаполля, дзе яны начавалі, у горад. Падышлі да нашай хаты, запыталіся ў бацькі, што чуваць у горадзе. Ён ім, вядома, расказаў пра выпадак на плошчы. Начальнік міліцыі Тропкін гаворыць: «Пайшлі, таварышы, дадзім ім жару». І яны накіраваліся ісці па вуліцы Піянерскай, а тут насустрач сталі бегчы пагранічнікі, якія начавалі ў гасцініцы. Пагутарылі ўсе між сабой і шпарка пакрочылі ў лес. Потым стала зразумелым, чаму яны так зрабілі. У горад уваходзілі нямецкія рэгулярныя часці, якія праз Докшыцы ішлі на Глыбокае, Беразіно і Бягомль. Што маглі зрабіць вінтоўкі супраць танкаў і кулямётаў?

Дзесьці ў сярэдзіне ліпеня быў створаны першы транзітны лагер ваеннапалонных на плошчы ля клуба, дзе зараз знаходзіцца парк і царква. Размясцілі ваеннапалонных і ў самой царкве, а таксама на былым школьным агародзе ў канцы вуліцы Ленінскай. Тым часам на полі паміж сучасным стадыёнам і аўтавакзалам пачалі будаваць тры баракі і казар-



У час адкрыцця помніка ва ўрочышчы «Званок». 10.6.1986 г.

му для аховы. Да лістапада ўсё было гатова. Да таго палонныя знаходзіліся пад адкрытым небам. Калі чэрвень і ліпень былі цёплымі і сухімі, то жнівень — халодным і дажджлівым. Кармілі палонных два разы ў дзень, раніцай і вечарам. Давалі па кубку баланды і па сухару. Палонныя паміралі ад холаду, голаду і смагі дзесяткамі. Хавалі іх у тым самым месцы, дзе зараз брацкія могілкі. Тыя, хто мог яшчэ трымаць лапату ў руках, рылі вялікую і глыбокую яму. Мёртвых складвалі ў рады па 25—30 чалавек, затым закідвалі зямлёй і хлоркай. Такіх радоў было 4—5, а ўсіх магіл — чатыры. Хворых і аслабленых, якія раніцай не маглі падняцца, расстрэльвалі. А колькі загінула ваеннапалонных, якія спрабавалі ўцячы, калі іх гналі па дарогах! У Докшыцы калоны палонных прыводзілі з боку Лепеля бярэзінскім бальшаком і з Полацка — праз Глыбокае. А потым усіх адпраўлялі на Даўгінава. Жыхары вёсак і горада, праз якія праходзілі калоны, выбягалі на дарогу, перадавалі з рук у рукі або клалі паабапал дарогі ежу. Але не кожны канвой дазваляў забіраць яе. Прыносілі і прывозілі прадукты сяляне і гараджане і ў лагер. Немцы і паліцаі сабе забіралі, што лепшае, а астатняе аддавалі ў агульны кацёл. Многія жанчыны забіралі палонных да сябе ў сям'ю, выдаючы за радню або мужоў, і гэтым самым ратавалі іх ад немінучай смерці.

З першых дзён акупацыі немцы пачалі ўстанаўліваць «новы парадак». З усіх шчылін павылазілі здраднікі і проста нягоднікі. Комулька, былы польскі пагранічнік, узначаліў паліцыю. Паліцаі, жадаючы паказаць сваю адданасць немцам, з пылам пачалі палянанне за былымі служачымі савецкіх устаноў і актывістамі. Яны апазналі ў адной з калон з ваеннапалоннымі былога работніка міліцыі Сэпсула Левіна. Яго, мясцовую дзяўчыну Аню Пінцэвіч і невядомага камісара фашысты расстралялі ў павучанне ўсім жыхарам. Наступнай ахвярай немцаў стала яўрэйскае насельніцтва. Тысячы нашых землякоў сталі ахвярамі самай жудаснай з войнаў. Як хочацца верыць, што яна была апошняй.

*М.Дз.Чысцякоў.*

## Карныя аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызан Бягомльскага і Докшыцкага раёнаў

**«Котбус»** («Cottbus») — кодавая назва карнай аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызанскіх брыгад «Дзядзькі Колі», «Жалязняк», імя Кірава, Чашніцкай («Дубава»), «Народныя мсціўцы», «Штурмавая», асобных атрадаў «Смерць фашызму», «Гвардзеец», «За Радзіму» і інш. і цывільнага насельніцтва ў Бягомльскім, Лепельскім, Плешчаніцкім і Халопеніцкім раёнах 20.5—21.6.1943 г.

Праводзілася па ўказанні «ўпаўнаважанага Гімлера па барацьбе з партызанамі на Усходзе» обергрупенфюрэра СС, начальніка СС і паліцыі групы армій «Цэнтр» Баха-Зелеўскага спецыяльнымі карнымі часцямі СС, жандармерыяй, ахоўнымі войскамі, паліцыяй



Група былых партызан брыгады «Жалязняк» на адкрыцці помніка ва ўрочышчы Званок (злева направа): 1-ы рад — Е.С.Супрановіч, П.С.Руткоўскі, С.М.Шыла, А.М.Захарэвіч, П.А.Бартулеў, М.І.Захарэвіч; 2-і рад — А.А.Камінскі, А.Ф.Фрол, У.Л.Шыла, Ц.І.Шынкевіч. 10.6.1986 г.

пры падтрымцы рэгулярных войск з танкамі, артылерыяй, авіяцыяй (усяго больш за 80 тыс. карнікаў). У раёне Домжарыцкіх і Паліцкіх балот гітлераўцы акружылі партызанскія брыгады «Жалязняк», «Дзядзькі Колі», імя Кірава. Раніцай 10 чэрвеня 1943 г. асноўныя сілы брыгады «Жалязняк» прарвалі кальцо варожай блакады ва ўрочышчы Званок паміж вёскамі Улессе і Ліпск. Дзве другія брыгады выйшлі з баямі з акружэння ў ноч 19 чэрвеня ў раёне вёсак Крайцы і Пастрэжжа.

21 чэрвеня нямецкае камандаванне, не дасягнуўшы галоўнай мэты — знішчэння партызан, спыніла аперацыю. У час аперацыі карнікі спалілі дзесяткі вёсак, у тым ліку Будзеніцкая Рудня (загубілі 103 чалавекі), Жамойск (27 чалавек), Іканы і Гарэлы Луг (576 чалавек), Асавы (178 чалавек), Сасновая (96 чалавек) Бягомльскага раёна, Кветча (60 чалавек), Крайцы (21 чалавек) Лепельскага раёна і інш., а таксама вёскі Ідаліна, Слабада, Трысцень, Тхарніца, Шунеўка (гл. асобны артыкул), у г.п. Бягомль забілі 300 чалавек, загубілі каля 10 тыс. мясцовых жыхароў, вывезлі на катаржныя работы ў Германію 605 чалавек, захапілі 6500 галоў буйной рагатай жывёлы, авечак, свіней, 1618 шкур розных відаў, 38 ц ільнасемя і інш. сельгаспрадукты.

*В.С.Лазебнікаў, А.А.Фактаровіч.*

**«Веснавое свята»** («Frühlingfest») — кодавая назва карнай аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызан і мясцовага насельніцтва Полацка-Лепельскай партызанскай зоны (Докшыцкі, Лепельскі, Полацкі, Ушацкі раёны) 17.4—5.5.1944 г.

Праводзілася сіламі 12 палкоў СС і паліцыі, часцей 6-й асобай авіяпалявой, 5 пяхотных, 201-й ахоўнай і запасной дывізій, асобага батальёна СС Дырлевангера, 501-га танкавага палка, 2 палкоў брыгады Камінскага — каля 6 тыс. чалавек, 137 танкаў, 235 гармат, каля 70 самалётаў, 2 бронецягнікі. Кіравалі аперацыяй камандуючы 3-й танкавай арміяй генерал-палкоўнік Рэйнгарт і генеральны камісар акругі Генеральнай акругі Беларусь групенфюрэр войск СС і генерал-лейтэнант паліцыі Готберг.

У блакіраваным нямецка-фашысцкімі войскамі раёне дзейнічалі 16 партызанскіх бры-

гад, больш за 17 тыс. чалавек, на ўзбраенні якіх было 9344 вінтоўкі, 1544 аўтаматы, 721 кулямёт, 151 процітанкавае ружжо, 143 мінамёты, 21 гармата. Кіравала і каардынавала баявыя дзеянні брыгад аператыўная група ЦК КП(б)Б і БШПР на чале з У.Е.Лабанком.

Гітлераўцы планавалі прыціснуць партызан да чыгункі Маладзечна—Полацк, уздоўж якой сканцэнтравалі свае войскі з 2 бронецягнікамі. Галоўны ўдар наносіўся на паўднёвым участку абароны, дзе наступалі часці 2 дывізій і 2 палкоў.

Вялікую дапамогу партызанам аказвалі БШПР і ваенны савет 1-га Прыбалтыйскага фронту. Авіяцыя фронту зрабіла 354 вылеты, нанесла бомбавыя ўдары па скопішчах праціўніка, пераправіла больш за 250 т грузаў, вывезла каля 1500 параненых і хворых. Адначасова войскі пачалі наступленне на полацкім напрамку. Адцягваючыя ўдары нанеслі брыгады Сенненска-Аршанскай і Барысаўска-Бягомльскай партызанскіх зон і партызаны Вілейскай вобласці.

Нягледзячы на стойкасць партызан, да канца красавіка гітлераўцам удалося звузіць кальцо акружэння да 20 км вакол Ушачаў. Але дасягнуць сваіх мэт акупанты не змаглі: у ноч на 5 мая блакада нямецка-фашысцкіх войск была прарвана, усе брыгады выйшлі з акружэння і вывелі каля 15 тыс. чалавек мясцовага насельніцтва. Пад выглядам барацьбы з партызанамі гітлераўцы загубілі 7011 чалавек, захапілі для вывазу ў Германію 11 тыс. чалавек, спалілі шэраг вёсак. *Р.Р.Кручок.*

**«Баклан»** («Kormoran») — кодовая назва буйнамаштабнай карнай аперацыі гітлераўцаў у аператыўным тыле 3-й танкавай і 4-й палявой нямецка-фашысцкіх армій. Праводзілася па загаду галоўнага камандавання групы армій «Цэнтр» і пад яго кіраўніцтвам з 25.5 да 23.6.1944 г. ў Барысаўскім, Халопеніцкім, Куранецкім, Крупскім, Лагойскім, Плешчаніцкім, Ільянскім, Радашковіцкім, Мінскім, Маладзечанскім, Смалявіцкім, Докшыцкім, Бягомльскім, Лепельскім раёнах. Спынена ў сувязі з пачаткам стратэгічнай Беларускай наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі. Мэта аперацыі — знішчэнне партызанскіх фарміраванняў паміж Лепелем і Докшыцамі і чыгункі Мінск—Орша, захоп насельніцтва для вывазу ў Германію і выкарыстання яго на абарончых работах.

Камандуючы групы армій «Цэнтр» генерал-фельдмаршал Буш упаўнаважыў камандаванне 3-й танкавай і 4-й палявой армій, камандуючага вермахта «Беларусь» і вышэйшага начальніка СС і паліцыі Расіі «Цэнтр» прыцягваць і выкарыстоўваць у аперацыі «Баклан» усе наяўныя ў распараджэнні сілы, незалежна ад роду і колькасці, з тым, каб забяспечыць такі ж поспех гэтай аперацыі, як і аперацыі «Веснавое свята». Камандаванню нямецкай паветранай арміі прапанавана па магчымасці буйнымі сіламі падтрымаць аперацыю. Непасрэднае кіраўніцтва «Бакланам» ажыццяўляў групенфюрэр войск СС, генерал-лейтэнант паліцыі Готберг. Аперацыя была падзелена на 3 фазы, яе задача — адцясніць партызан збежнымі з захаду і ўсходу ўдарамі ў раён на поўнач ад воз. Палік, а потым усіх, хто трапіць у «кацёл», поўнасцю знішчыць. Да 15.5.1944 г. ў раён аперацыі былі сцягнуты 4 баявыя і 3 загараджальныя групы. У склад груп 3-й танкавай і 4-й палявой армій уваходзілі ў поўным складзе 201-я і 286-я ахоўныя дывізіі, 5 паліцэйскіх палкоў, 5-ы полк брыгады Рускай вызваленчай арміі, адзін грэнадзёрскі і 3 асобныя ахоўныя палкі, 7 асобных паліцэйскіх і палявых батальёнаў, артылерыйскія і спецыяльныя падраздзяленні. Камандныя пункты груп знаходзіліся ў Вілейцы, Лепелі, Барысаве, Іўі, Пустаселлі.

Праз 2 тыдні пасля пачатку баёў намнога большым сілам праціўніка ўдалося адцясніць партызан у раён Домжарыцкіх і Паліцкіх балот. У партызан скончыліся боепрыпасы, прадукты, медыкаменты. Камандзірам брыгад і злучэнняў Барысаўска-Бягомльскай, Сенненска-Аршанскай і Полацка-Лепельскай партызанскіх зон быў дадзены загад атакаваць ворага. 6—7 чэрвеня брыгада «Жалязняк» прарвала блакаду ў раёне р. Цна за 3 км ад воз. Дамашэўскае. Да 15.6.1944 г. каля 20 партызанскіх брыгад прарвалі блакаду ворага, вырваліся з акружэння і нанеслі праціўніку сур'ёзныя страты. Штаб партызанскага злучэння Барысаўска-Бягомльскай зоны (камандзір Р.Н.Мачульскі, начштаба М.К.Садоўскі, упаўнаважаны БШПР А.Ф.Бардадын) разам з партызанамі, якія не выйшлі з акружэння, утрымлівалі пазіцыі на балотных астраўках каля воз. Палік. У крытычныя моманты баёў ім аказала дапамогу савецкая бамбардзіровачная авіяцыя.

23.6.1944 г. фашысты пачалі выводзіць свае войскі з раёна аперацыі ў сувязі з нас-

тупленнем савецкіх войск. Гітлераўцам удалося расчляніць партызанскія сілы, нанесці ім цяжкія страты, але ўсе партызанскія брыгады захавалі баяздольнасць і ўступілі ва ўзаемадзеянне з часцямі Чырвонай Арміі. Карнікі не дасягнулі і другой сваёй мэты: захоп і ўгон цывільнага насельніцтва. Камандуючы «Бакланам» Готберг у роспачы адзначаў, што фашысты захапілі ўсяго 200 мужчын і жанчын, у той час як у трох папярэдніх аперацыях «Веснавое свята», «Прагулка на сёмуху» і «Марабу» было захоплена 15 404 чалавекі для вывазу на катаржныя работы ў Германію. У час аперацыі была спалена в. Дальва. Гераізм і стойкасць партызан у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі сарвалі запланаваныя акупантамі карныя аперацыі «Чорны», «Чырвоны», «Сонцастаянне».

*У.С.Пасэ.*

## Дакументы сведчаць

### З ПАВЕДАМЛЕННЯ АКРУЖНОГА КАМІСАРА Ў БАРЫСАВЕ ГЕНЕРАЛЬНАМУ КАМІСАРУ Ў МІНСКУ АБ АБСТАВІНАХ У АКРУЗЕ ЗА ПЕРЫЯД з 1 ліпеня па 30 верасня 1942 года

1. Бандитская деятельность в отчетном периоде продолжала возрастать. Примерно $^4/_7$ территории района контролируется ими и находится в руках бандитов. Из волостей Бегомльского района, находящихся под управлением бандитов, значительная часть населения (примерно 500 чел.) бежали в Бегомль. Эти беженцы все время просят немецкие учреждения о защите оставленного ими на произвол судьбы урожая. То, что эти люди делают выводы из нашей несостоятельности помочь им, чувствуется по их поведению, в особенности молодого поколения. Последнее чувствует свое превосходство над немцами, в особенности после того, как троим бандитам, буквально под носом у жандармерии Бегомля, удалось поджечь районный комбинат, электростанцию, мельницу, лесопильный завод и столярную мастерскую... То, что в такой обстановке большая часть населения выжидательно настроена по отношению к нам, является вполне разумеющимся. К сожалению, такое пассивное отношение населения к нам усугубляется еще злоупотреблениями вермахта (избиение бургомистра района, самовольные реквизиции убойного скота, срыв жестяной крыши из здания школы и т.д.) (см. сообщение ст. 17.8 и 19.9)...

Назначенный новый окружной школьный инспектор провел в обоих районах* учительские конференции. Школы работают и во втором учебном году. Ощущается острый недостаток в школьных тетрадях и письменных принадлежностях...

Местные газеты читаются населением очень мало. Широкое распространение нашего вербовочного материала было предупреждено приказом бандитского руководства немедленно срывать все немецкие плакаты...

Жандармерия почти совершенно неспособна выполнять возложенные на нее задачи. Она даже не в состоянии обеспечить в полном объеме охраны урожая, так как ей не предоставляют достаточного количества вспомогательных сил полиции. Кроме того, местные полицейские не вполне надежны...

Многие бургомистры волостей уже 5 месяцев руководят своими волостями из районных центров, так как в своих волостях они преследуются бандитами. Некоторые старосты деревень убиты бандитами. В связи с вышеизложенным надлежащая работа волостных управ невозможна.

Поступление налогов вследствие бандитской деятельности, естественно, незначительное...

Возложенные на оба района налоги по сдаче зерна, картофеля, сена и т.д. при самом добром намерении всех заинтересованных лиц не могут быть выполнены. Так, например, из установленной для Бегомльского района квоты сдачи сена в 950 т, до сих пор сдано лишь 60 т, а в Плещеницком районе из 940 т сдано 450 т. На 6000 га в Бегомльском районе вследствие бандитской деятельности сено не скошено. В значительной части округа урожай убран бандитами, которые, кроме того, через женщин передали жандармерии, чтобы они не беспокоились о сборе налогов, так как таковые они соберут сами. При этом следует отметить, что бандиты сами эксплуатируют паровую мельницу в дер. Деделовичи Бегомльского района...

Население воздерживается от вербовки на работы в Германию, так как, мол, в Германии люди должны голодать и слишком велика опасность воздушных налетов.

* Маецца на ўвазе Бягомльскі і Плешчаніцкі раёны.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4683, воп. 3, спр. 970, л. 250—255.*

## З АПЕРАТЫЎНАГА ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ЖАНДАРМСКАГА ПАСТА Ў БЯГОМЛІ НАЧАЛЬНІКУ СС І ЖАНДАРМЕРЫІ БАРЫСАЎСКАЙ АКРУГІ Ў ПЛЕШЧАНІЦАХ

1.10.1942 г., около 23.00, неустановленным числом бандитов сожжен деревянный мост длиной 50 м и шириной 10 м через реку Поня возле дер. Небышино.

1.10.1942 г., около 24.00, бандитами сожжен деревянный мост длиной 40 м и шириной 10 м возле дер. Скураты. В связи с уничтожением этого моста дорога из Бегомля на Докшицы и из Докшиц на Лепель стала непроезжей.

6.10.1942 г. ...После того как в воскресенье 4.10.1942 г. деревня Мстиж была сожжена вермахтом, а на следующий день частично сожжена деревня Домжерицы, бандиты приняли решение устроить засаду и при новом появлении вермахта в дер. Броды напасть и уничтожить их. Численность партизан — 50 чел.

Вооружение: карабины и автоматические винтовки.

Бихль

Майстер жандармерии и начальник поста.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4683, воп. 3, спр. 970, л. 256—257.*

## З АПЕРАТЫЎНАГА ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ЖАНДАРМСКАГА ПАСТА Ў БЯГОМЛІ НАЧАЛЬНІКУ СС І ЖАНДАРМЕРЫІ БАРЫСАЎСКАЙ АКРУГІ

9.10.1942 г., около 13.00, дорожный мастер из деревни Осово сообщил, что неустановленное количество бандитов подожгло деревянный мост, примерно 10 м длины, возле дер. Студенка, примерно в 3 км от Бегомля в направлении Плещениц. Патруль жандармерии, усиленный полицейскими латышского батальона и местной комендатуры, направленный на место происшествия на велосипедах, потушил горящий мост, так что он остался проезжим.

9.10.1942 г., около 17.00, бандитами полностью сожжен деревянный мост длиной примерно 10 м возле дер. Углы (в 9 км от Бегомля в направлении Плещениц)...

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4683, воп. 3, спр. 970, л. 260.*

## РАСПАРАДЖЭННЕ НАЧАЛЬНІКА БЯГОМЛЬСКАГА РАЁНА СТАРАСТУ в. КВЕТЧА АБ ЗДАЧЫ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПАДАТКАЎ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ

**17 кастрычніка 1942 г.**

Прилагается при этом план сдачи госпоставок для д. Кветча. Одновременно предлагаю Вам выполнить все зерновые поставки не позднее 27 октября 1942 г.

Предупреждаю, что в случае невыполнения этого распоряжения 28 октября 1942 г. д. Кветча будет сожжена немецкими войсками.

Сообщаю план заготовок на Вашу деревню:

1) ржи — 2280 кг; 2) овса — 1900 кг; 3) ячменя — 2280 кг; 4) пшеницы — 304 кг; 5) гречихи — 760 кг; 6) бобовых — 77 кг; 7) картофеля — 13 821 кг.

Начальник района [подпись неразборчива]

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 2, спр. 1354, л. 113.*

## З АПЕРАТЫЎНАГА ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ЖАНДАРМСКАГА ПАСТА Ў БЯГОМЛІ НАЧАЛЬНІКУ СС І ЖАНДАРМЕРЫІ БАРЫСАЎСКАЙ АКРУГІ Ў ПЛЕШЧАНІЦАХ

**11 лістапада 1942 г.**

8.11.1942 г., около 21.00, из Докшиц через д. Небышино следовал обоз в 30 повозок, груженных солью. Соль должна была быть сдана в ЦТО Бегомля. За деревней внезапно появились 15 вооруженных автоматическими винтовками и карабинами бандитов, которые заставили возниц повернуть в д. Небышино, где они сняли с повозок 250 кг соли и раздали местным жителям. С оставшейся солью возницы были отпущены и продолжали следовать в Бегомль.

8.11.1942 г., около 20.00, примерно 300 бандитов, вооруженных автоматическими винтовками, пистолетами и ручными гранатами, окружили д. Верстей, а затем ворвались в некото-

рые дома, где забрали 3 коровы, 1 овцу и различное продовольствие. После часа пребывания в деревне бандиты ушли в двух различных направлениях. Одна часть бандитов ушла в направлении д. Василькова, а вторая часть в направлении д. Замосточье. Уходя, бандиты заявили жителям, пострадавшим от них, что они могут сообщить в жандармерию в Бегомль, что их налог забран партизанами и от них не должны больше требовать налога.

8.11.1942 г., около 10.00, в д. Мстиж появилось неустановленное количество вооруженных бандитов. Они приказали старосту деревни позаботиться о том, чтобы с каждого двора во всех деревнях волости было собрано и сдано на мельницу в д. Мрай по 32 кг ржи.

9.11.1942 г., около 23.00, 20 бандитов, в том числе 5 вооруженных карабинами, появились в д. Каменки. Они забрали у жителей 4 лошади, 3 овцы и 2 коровы, после чего ушли в направлении д. Горелый Луг.

10.11.1942 г., около 24.00, двое вооруженных автоматами бандитов проникли в дом крестьянина Данилы Канаша в д. Маковье и забрали 2 свиньи и предметы одежды. Перед уходом они сильно избили крестьянина, так как он поддерживал немецкие учреждения. Кроме того, у других жителей бандиты забрали 6 овец и подтелка. Ушли бандиты в неизвестном направлении.

Бихль
Майстер жандармерии и начальник поста.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4683, воп. 3, спр. 970, л. 248—249.*

## СА СПРАВАЗДАЧЫ НЯМЕЦКАГА ЧЫНОЎНІКА БЁЛЬТА АБ ЗБОРЫ ЖЫВЁЛЫ І СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДУКТАЎ У ВЁСКАХ ДОКШЫЦКАГА РАЁНА, ЗНІШЧАНЫХ ГІТЛЕРАЎЦАМІ ПАД ЧАС КАРНАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ Ў МАІ—ЧЭРВЕНІ 1943 г.

Во время операции моя задача состояла в том, чтобы собирать скот и сельскохозяйственные продукты. В связи с этим я побывал во многих деревнях. Каждому ясно, что там, где прошли бои, остаются следы опустошения. Непонятно, однако, такое явление, когда население, которое доверчиво начинает возвращаться из лесов в захваченные деревни, предлагая нашим частям свои услуги, спустя несколько дней подвергается расстрелу и сожжению.

В д. Осиновик я находился 25 и 26 мая. Там был расквартирован один из штабов СД. Жители деревни — кто был на работах, кто сидел перед своими домами. Когда же я 2 июня снова попал в эту деревню, то нашел на ее месте огромное пепелище. Деревня была сожжена. Как мне стало известно от товарищей, мужчины, женщины и дети из этой деревни были расстреляны. В одном из домов я нашел полуобгоревший труп, вид которого подтвердил, что я слышал от товарищей.

Таким образом были уничтожены следующие деревни, в которых я побывал: Новоселки, Осиновик, Пьяный Лес. Эта же судьба постигла, по официальным данным, и другие населенные пункты, как Витуничи, Будиловка, Бересневка и Бегомль.

24 мая на краю деревни Небышино я обнаружил сгоревший сарай, в котором находилось 6 обуглившихся трупов. Это было сразу же после занятия деревни. Такие вещи заставляют полагать, что люди были сожжены заживо.

Вместе с районными сельскохозяйственными уполномоченными Вортманном и Хартманном я собрал 727 голов крупного рогатого скота, 575 овец и более 1 вагона кож и шкур.

Районный сельскохозяйственный уполномоченный Бёльт.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 845, воп. 1, спр. 237, л. 70.*

*Пераклад з нямецкай мовы.*

## АКТ, СКЛАДЗЕНЫ ПАРТЫЗАНАМІ БРЫГАДЫ «ЖАЛЯЗНЯК» І МЯСЦОВЫМІ ЖЫХАРАМІ АБ ЗЛАЧЫННАЙ РАСПРАВЕ ГІТЛЕРАЎЦАЎ З ДОКШЫЦКАГА ГАРНІЗОНА НАД ЖЫХАРАМІ в. ДАЛЁКАЕ.

**10 красавіка 1943 г.**

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе: комсомольского работника бригады «Железняк» Андрея Федоровича Фрола, политрука взвода автоматчиков Анатолия Степановича Кулакова, граждан деревни Далекое Витуницкого сельсовета Бегомльского района Минской области, Я.Ф.Гавриловича, П.И.Парфенович составили настоящий акт в нижеследующем:

10 апреля с.г. немцы и полиция Докшицкого гарнизона учинили зверскую расправу над населением д. Далекое. Комиссия в составе вышеупомянутых представителей и граждан д. Далекое, спасшихся от смерти, установила следующее:

В то время, как окружалась деревня, большинство жителей деревни спаслось, из всего количества, т.е. 19 домов, сожжено 12, остались не сгоревшими или затушенными партизанами 7 домов. Причем, дома сгорели со всеми прилегающими постройками, продуктами питания, одеждой и различным хозяйственным инструментом и вещами. Все, что нравилось полиции и немцам из одежды и продуктов, взято полностью у населения, убито и сожжено живьем 13 человек, большинство из которых старики и дети. Вот, как, например, погиб старик 76 лет — Карпей Игнатьевич Коляго со своей дочерью Лидией Карпеевной Коляго и внучкой 2 лет Ниной. Старик и внучка были дома, его дочь Лида, бывшая учительница, вышла в деревню, чтобы побеседовать со своими соседями и, как ей казалось, разогнать этим тоску, которая часто господствовала в деревне в связи с тяжелой войной. В это время по деревне уже визжали пули и рвались мины. Лидия удрала из деревни и залегла на луге, покрытом мелким кустарником, в 150—200 м от деревни. Не сиделось и старику, он вышел из избы со своей внучкой, чтобы попросить милости и воли «божеской». В это время Лидия услышала голос своей дочери, моментально подбежала к отцу, схватила дочь и, не добежав 100 м до прежнего своего места, была убита вместе с дочерью вражеской пулей. Не умолил и старик «сынков», они тут же, возле дома, его расстреляли.

Невольно хочется плакать женщинам со слабыми сердцами, когда они рассказывают, как погибли 8-летняя Оля и 2-летний Коля, дети старосты деревни Далекое Петра Ивановича Парфеновича. Дело было так: староста ушел в ближайший партизанский отряд, чтобы получить инструкцию насчет организации в деревне весеннего сева, жена его Мария Антоновна ушла в деревню, чтобы размолоть зерно. Дома осталось трое детей: 8-летняя Оля, 6-летняя Лидия и 2-летний Коля. По деревне уже катился ружейно-пулеметный и минометный огонь. К детям матери бежать было невозможно, ибо мать уже находилась на краю гибели. Три малыша уже не раз слышали от папы и мамы, что полиция и немцы уничтожают людей, они себя тоже считали людьми и, когда узнали, в чем дело, приняли решение спасаться; и так, как все, бежали. 6-летняя Лидия бежала одна, но туда, куда и взрослые, отдавая всю свою силенку, так она и спаслась. 8-летней Оле было жалко бросить своего двухлетнего братишку Колю, и она решила бежать, неся его перед собой. Ясно, что Оле долго бежать было невозможно, в скором ее догнали какие-то черные люди и взяли в плен живьем. Оле думалось всяк и все потому, что хотелось жить, но среди этих черных людей не нашлось ни одного человека, который мог бы пожалеть детей, они заперли в один из домов детей и стариков и сожгли вместе с домом. Вместе со всеми взят в плен гражданин Иван Антонович Русакович 40 лет, совместно со своей женой Альжбетой 40 лет, дочерью Галей 6 лет, и сыном Колей 3 лет. Не помогли и объяснения Русаковича о том, что он остался, зная, что полиция и немцы — свои люди — и зря убивать не будут. Не удалось Русаковичу проверить совесть извергов, но зато все убедились, что это не люди, а человеческие отбросы. Доказательством этого может служить и тот факт, что они не пожалели лежащей в квартире 80-летней старухи Зоси Кондратьевны Парфенович. Правда, изверги сделали предсмертные услуги старухе. Старуха не могла идти из дома, чтобы не тревожить ее, они предпочли собрать всех задержанных в этот дом и сжечь не одну старуху, а всех вместе.

Не спаслась здесь гражданка деревни Веротейка Екатерина Стадольник 37 лет, со своей дочерью 13 лет, которые ненавидели немцев и решили избавиться от них и переехали на жительство в д. Далекое. Екатерина заболела и лежала в постели, 13-летняя дочь жалела бросить мать и так их обеих застало то, чего они боялись, их сожгли живыми.

Наглые бандиты зверски замучили 60-летнего старика Иосифа Дмитриевича Парфеновича, он не мог бежать и решил спрятаться под крыльцо своего дома, но звери обнаружили его. Перед смертью он говорил, что немецкие изверги кричали: «Вылезай, старый черт, а то тебя скоро подогреем!» и через несколько минут загорелся дом, сидеть живому дальше было невозможно, решил бежать — так и сделал. Правда, отбежал от своего дома метров 25 и его тяжело ранили, после этого прожил всего двое суток, после чего скончался.

Комиссия также установила, что все задержанные взрослые были избиты, проколоты штыками, а затем сожжены в доме Никифора Парфеновича, а дети сжигались живьем.

Акт составлен на небывалые еще в истории зверства и расправы над беззащитным населением д. Далекое Витуницкого сельсовета Бегомльского района, в чем и подписываемся.

Подписи.

С оригиналом верно:

Зам. комиссара бригады Дернушков.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 33а, спр. 496, л. 46.*

## АКТ

**13 красавіка 1943 г.**

Мы, нижеподписавшиеся, партизаны 1-го отряда бригады «Железняк» Минской области Петр Иванович Катеко, Алексей Опенко и граждане д. Вольберовичи Глинского сельсовета Бегомльского района Сергей Тихонович, Викентий Супраненок, Дмитрий Галка составили этот акт в нижеследующем:

Проверили, прибывши на место в д. Вольберовичи, трупы убитых и сожженных людей, а также сожженные дома, где зверски произвели расправу изверги — немецкие фашисты над мирным ни в чем не повинным населением. В результате проверки обнаружено: убитых мужчин — 7 чел., женщин — 7 чел., из них стариков — 4 чел., взрослых — 8 чел., детей — 2. Сожженных трупов — 26 чел., из них мужчин — 13, женщин — 13, из них стариков — 3, взрослых — 16, детей — 7. Итого убито и сожжено 40 чел.

Сожжено построек, жилых домов — 41, а также все имущество населения. В чем и составили настоящий акт.

Подписи:

Копия с оригиналом верна, зам. комиссара бригады

Дернушков.

## УБИТЫЕ И СОЖЖЕННЫЕ НЕМЦАМИ ЖИТЕЛЕИ ДЕРЕВНИ ВОЛЬБЕРОВИЧИ

1. Илинич София.
2. Демидович Мария и ее двое детей.
3. Юркевич Анна — 60 лет.
4. Селюк Михаил.
5. Селюк Петр — 46 лет.
6. Селюк Екатерина — жена Петра.
7. Селюк Надежда — их дочь.
8. Лепешко Надежда.
9. Лепешко Павел.
10. Лепешко Тимофей.
11. Махонь Елена.
12. Шиленок Екатерина.
13. Петрашенок Лука.
14. Селюк Юлия.
15. Селюк Вера.
16. Демидович Вера.
17. Демидович Михаил.
18. Супроненок Екатерина.
19. Супроненок Любовь.
20. Скурат Владимир — 7 лет.
21. Илинич Иосиф.
22. Кривичанин Михаил.
23. Кривичанина Клава.
24. Супроненок Петр.
25. Супроненок Сергей.
26. Супроненок Валентина.
27. Супроненок Александра.
28. Тихонович Елизавета — 65 лет.
29. Тихонович Антон.
30. Шиленок Анна.
31. Махонь София.
32. Дрозд София.
33. Дрозд Александра.
34. Дрозд Владимир.

С оригиналом верно: зам. комиссара бригады Дернушков.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 33а, спр. 496, л. 47.*

# АКТ

**29 лістапада 1943 г.**

Комиссия в составе комиссаров партизанских отрядов бригады Медведева: Ф.Н.Ивендикова, Н.В.Улановского, В.М.Лавриновича и членов комиссии сожженных: д. Старина — О.К.Ковалевой, А.С.Шеко, д. Нестеровщина — С.М.Хилько, д. Тумиловичи — В.А.Маркович, д. Черничка — М.Н.Шнитко, д. Шалаши — Г.Н.Хилько, д. Стенка — И.Т.Гмырак, д. Речные — С.В.Петько, И.А.Трус, д. Дедино — И.Н.Дайлидович, д. Торгуны — С.Желтовский, Г.Трус, хутора Даниловка — Н.Д.Гаманович сего числа составили настоящий акт о зверствах, учиненных фашистскими разбойниками в деревнях Докшицкого района Вилейской области.

С 19 мая 1943 г. гитлеровские разбойники только за 5 месяцев своего гнусного хозяйничания сожгли 10 деревень в количестве 548 дворов. В этих деревнях гитлеровские изверги за время своего пребывания заживо сожгли 10 человек стариков и детей.

Д. Стенка: Тит Казаченок 83 лет, Евгения Козаченок 87 лет, Фекла Дайлидович 83 лет, в этой же деревне гитлеровские мерзавцы зверски расстреляли 12-летнего мальчика В.С.Гмыряка. Женщине Дайлидович приказали лечь на дорогу и проехали через нее танком. С этой деревни немцы увезли в фашистское рабство 75 чел., хлеб и имущество сожгли.

Д. Речные: немецкие разбойники расстреляли Екатерину Аникович 60 лет, Евдокию Петько 78 лет, Степаниду Шулност 74 лет, Михаила Гмырака, 4 лет, Степана Подберезского, 58 лет, Василия Подберезского 25 лет, Минадорию Подберезскую 70 лет, Ивана Василевича 40 лет, Марию Кондратович 2 лет, заживо сожгли старуху Русецкую 110 лет; вывезено в Германию 6 человек молодежи, 25 голов рогатого скота. Деревня (80 дворов) сожжена полностью.

Хутор Даниловка (9 домов) сожжен полностью, на этом хуторе немцами зверски расстреляны Иосиф Сироцкий 70 лет, Степанида Сироцкая 60 лет, в Германию увезли 7 человек, весь хлеб сожгли.

Д. Торгуны (30 дворов) сожжена полностью, в этой деревне немецкие палачи зверски замучили 9 человек, в Германию увезли 18 человек, скот и имущество ограбили.

Д. Дедино (106 дворов) сожжена полностью, в этой деревне расстреляны: Галя Ковалевич 17 лет, Елена Ковалевич 9 лет, Иван Ковалевич 30 лет, Василий Подберезский 60 лет, Мария Подберезская 57 лет, Иван Подберезский 35 лет, Ольга Дайлидович 45 лет, Софья Дайлидович 22 лет, Евгения Дайлидович 24 лет, Даниил Аникович 40 лет; заживо сожгли Татьяну Рутько 80 лет, Марту Петрашкевич 76 лет, увезли в Германию Елену Синица 18 лет, ограбили деревню, забрали 12 лошадей, 55 коров, 35 голов мелкого рогатого скота, хлеб, оставшийся на поле сожгли.

Д. Шалаши (35 дворов) сожжена полностью, немецкие бандиты расстреляли Василия Козаченка 22 лет, В.А.Кожемяченка 20 лет, Степаниду Аникович 60 лет, в фашистское рабство угнали 17 человек, скот и имущество увезли полностью, хлеб и корма сожгли на поле.

Д. 2-я Черничка, расстреляны Е.Д.Портянко 41 года, А.Г.Портянко 21 года, П.Ф.Пуховский 21 года, Мария Передня 57 лет, в Германию увезли 4 человека молодежи.

Д. Тумиловичи (46 дворов) сожжена полностью, немецкие палачи избили 55-летнего старика, а потом расстреляли, 30 семейств угнали в Германию, хлеб и имущество ограбили.

Д. Старина (93 двора) сожжена полностью, во время пожара убили М.Д.Козлову 60 лет, в Германию увезли 49 семейств, 14 лошадей, 5 т хлеба, весь мелкий скот, домашнюю птицу, забрали у крестьян: костюмы, пальто, одеяла, нательное белье, подушки и прочие вещи.

Д. Нестеровщина (67 дворов) сожжена полностью, зверски замучены и расстреляны Василевич 53 лет, А.Р.Василевич 52 лет, А.М.Василевич 75 лет, Ульяна Хилько 60 лет, Фома Шуневич 75 лет, Федора Василевич 80 лет, М.О.Кострыкин 33 лет, Г.Ф.Василевич 24 лет. В этой же деревне немецкие стервятники, разозлившись неудачами боя с партизанами, поймали 8 чел. стариков и старух, отвезли в р-н Гечанцы, заподозрив их в партизанщине, отрыли яму, живыми бросили в яму всех 8 человек и 2 грудных ребенка, расстреляли из пулемета. С деревни Нестеровщина в фашистское рабство угнали 14 чел. молодежи, крупный рогатый скот, овец, свиней, домашнюю птицу, обувь, одежду разграбили.

Д. Гечанцы из 20 дворов сожжена полностью, все население деревни с имуществом увезли в Германию.

Кроме вышеизложенного, немецкие разбойники, поджигая деревни Стенка, Дедино, Шалагири, запирали в дома и поджигали стариков и старух, малых ребятишек.

В д. Дедино из расстреляных 11 чел. оказалось двое ребятишек. Население просило немцев не расстреливать малых ребят, но, несмотря на просьбы и слезы населения, немцы зверски расстреляли двух ребят, трупы их бросили в огонь.

С 19 мая 1943 года по октябрь месяц своими бандитскими налетами на вышеуказанные деревни Докшицкого района (комиссией установлено):

Сожжено 10 деревень, 548 дворов, зверски расстреляно 76 человек, заживо сожгли 10 чел., увезли 150 голов крупного рогатого и мелкого скота, около 100 т хлеба, в фашистское рабство угнали 156 семейств и 125 чел. молодежи.

Акт подписали члены комиссии: Ф.Н.Ивендиков, Н.В.Улановский, В.М.Лавринович, О.К.Ковалева, А.С.Шеко, С.М.Хилько, В.А.Маркович, М.Н.Шнитко, Г.Н.Хилько, И.Т.Гмырак, С.В.Петько, И.А.Трус, И.М.Дайлидович, С.Желтовский, Г.Трус, Н.Д.Гоманович.

Копию акта заверяет:

Секретарь Докшицкого РК КП(б)Б Уминский.

Комиссар бригады Медведева Пучкарев.

Командир бригады Медведев.

Печать и подписи.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 33а, спр. 265, л. 375—376.*

## ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА ЗАГАДЧЫКА АРГІНСТРУКТАРСКАГА АДДЗЕЛА БЯГОМЛЬСКАГА РАЙКОМА КП(б)Б ШАРАЕВА САКРАТАРУ МІНСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКОМА КП(б)Б Р.Н.МАЧУЛЬСКАМУ АБ ЗНІШЧЭННІ ГІТЛЕРАЎЦАМІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ І ЖЫХАРОЎ РАЁНА

**14 сакавіка 1944 г.**

На Ваш запрос от 11.3.1944 года сообщаем:

За весь период оккупации Бегомльского района немецко-фашистскими захватчиками совершены следующие злодеяния:

1. Расстреляно, сожжено и замучено мирных граждан 4071 чел. Так, например, в м. Бегомль расстреляно и сожжено до 200 чел., в д. Пьяный Лес расстреляно и сожжено до 100 чел., в д. Витуничи расстреляно и сожжено 115 чел.

в д. Мстиж расстреляно и сожжено свыше 300 чел., д. Клинники расстреляно и сожжено свыше 100 чел., д. Горелое расстреляно и сожжено свыше 150 чел.

[...]

2. Угнано в фашистское рабство 3500 человек.

3. Сожжено всего крестьянских дворов 4185. Многие деревни сожжены полностью. Из них крупнейшие:

Небышино — 204 двора, м. Бегомль свыше 300 дворов, построек 964.

Домжерицы — 120 дворов, Хмелевщина — 100 дворов, Ново-Вольберовичи до 100 дворов и ряд др.

4. Угнано скота — лошадей 1286, рогатого скота 2157 голов, мелкого скота (овцы, козы, свиньи) 3914 голов.

О всех учтенных злодеяниях в районе за период немецкого хозяйничанья имеются акты в отдельности по каждому населенному пункту.

Зав. оргинструкторским отделом РК КП(б)Б политрук Шараев.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 1341, воп. 1, спр. 37, л. 71.*

## АКТ

**2 июля 1944 г.**

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе председателя Домжерицкого с/с Константина Ивановича Пахомчика, уполномоченного деревни Домжерицы Антона Игнатовича Целица и члена комиссии Алексея Михеевича Вашкевича, составили настоящий акт о нанесенных материальных убытках немецкими оккупантами за время оккупации с 1941 г. по блокаду 25.5.1944 г.

Колхозных: жилые постройки 3, холодные постройки 15. Индивидуального пользования: жилых построек 105, холодных построек 218.

Угнано скота: коней 85, коров 96, инвентарь: повозок 12, плугов 17.

За время блокады с 25.5.1944 г. до прихода Красной Армии сожжено жилых землянок 10, угнано коней 16.

Комиссия (Подпісы)

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 1341, воп. 1, спр. 37, л. 122.*

## АКТ

**10 июля 1944 г.**

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе секретаря Березинского сельсовета П.С.Метлицкого и уполномоченного сельсовета дер. Липск и жены Василия Семеновича Хацкевича и Данила Лазара склали этот акт у наступным:

В 1942 г. убит немецкими оккупантами 1 человек.

В 1943 г. сожжены 3 человека.

В 1944 г. убиты 6 человек.

В 1944 г. насильно увезен немцами 1 человек.

В 1943 г. убиты немцами 3 человека.

Всего убитых, сожженных и увезенных немецкими разбойниками за 3 года войны 13 чел. (тринадцать человек).

О чем и склали настоящий акт

Комиссия (Подпісы)

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 1341, воп. 1, спр. 37, л. 104.*

## СПИСОК УБИТЫХ НЕМЦАМИ В ДЕРЕВНЕ ЛИПСК

В 1942 г. Хацкевич Дарья Васильевна, 1924 г.р.

В 1943 г. Мацкевич Улита, 1894 г.р.

Хомич Агата Борисовна, 1904 г.р.

Будревич Каролина, 1890 г.р.

Сожжены немцами в 1943 году:

Хомич Анна, 1868 г.р.

Хомич Ольга Исаковна, 1908 г.р.

Лазар Агапа, 1856 г.р.

Убиты в 1944 году:

Хомич Кондратий Лавренов, 1868 г.р.

Автушка Степан Андреев, 1907 г.р.

Гульяков Федор, 1904 г.р.

Галавенька Григор, 1925 г.р.

Шульгат Володя Михайлов, 1935 г.р.

Насильно увезен в 1944 г. Василь Федорович Севрук, 1890 г.р.; уехали добровольно с немцами Костусь Козленок, 1899 г.р. и Петр Костусев Козленок, 1922 г.р.

Староста деревни Хацкевич.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 1341, воп. 1, спр. 37, л. 105.*

## АКТ

**10 июля 1944 г.**

Мы, комиссия в складе секретаря Березинского сельсовета П.С.Метлицкого и членов комиссии этой деревни Василя Прохоровича Автушко и Бонадыся Ник. Хацкевича склали этот акт в наступным:

При блокировании партизанского района фашистские варвары в 1943 г. в деревне Улессе Березинского сельсовета сожгли с самолетов 23 двора (двадцать три).

А в 1944 г. сожгли из самолетов 16 дворов (шестнадцать) дворов. Всего сожжено 39 дворов.

Аб чым и склали настоящий акт.

Комиссия (Подпісы)

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 1341, воп. 1, спр. 37, л. 106.*

## АКТ

**10 июля 1944 г.**

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в складе секретаря Березинского сельсовета Павла С. Метлицкого и членов комиссии дер. Улессе Василя Прохоровича Автушко и Бонадыся Ник. Хацкевича склали акт в наступным,

В 1942 г. убит немецкими фашистами 1 человек.

В 1943 г. — 12 человек.

В 1944 г. — 6 человек.

В 1944 г. увезено в Германию на каторгу 13 человек.

Всего убито и увезено немецкими фашистами за 3 года 32 человека.

Аб чым и склали этот акт.

Комиссия (Подпісы)

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 1341, воп. 1, спр. 37, л. 111.*

## РАШЭННЕ ДОКШЫЦКАГА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

**2 чэрвеня 1969 г.**

### Об утверждении уточненных данных населенных пунктов, уничтоженных во время Великой Отечественной войны немецко-фашистскими захватчиками

Рассмотрев представленные исполкомами сельских Советов уточненные данные населенных пунктов, уничтоженных во время Великой Отечественной войны немецко-фашистскими захватчиками, исполком Докшицкого райсовета депутатов трудящихся отмечает, что по сведениям, предоставленным исполкомами сельских Советов, накануне войны в районе числилось 11 311 дворов с населением 40 909 человек.

Во время войны немецко-фашистскими захватчиками уничтожены 115 населенных пунктов (4654 двора), уничтожено 2159 человек.

За послевоенный период восстановлены на прежних местах 114 населенных пунктов, не восстановлено полностью уничтоженная деревня Шуневка Бегомльского поселкового Совета.

Угнано в фашистское рабство 716 человек, возвратились 496 человек.

Погибло на фронтах Великой Отечественной войны 1424 человека.

Погибло в партизанских отрядах и подполье 632 человека.

Исполком Докшицкого районного Совета депутатов трудящихся решает:

1. Уточненные данные, представленные исполкомами Советов по учету населенных пунктов, уничтоженных во время Великой Отечественной войны немецко-фашистскими захватчиками, утвердить.

Председатель исполкома Докшицкого райсовета депутатов трудящихся

М.Кошелев.

Секретарь исполкома Докшицкого райсовета депутатов трудящихся

Н.Сажина.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4683, воп. 3, спр. 750, л. 88.*

## СТРАТЫ ГОРАДА ДОКШЫЦЫ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

До войны было жителей — 5300 чел.; количество жителей, уничтоженных гитлеровцами — 4200 чел.; количество жителей, вывезенных на каторжные работы в Германию, — 13 чел.; количество населения на 1.1.1969 г. — 3100 чел.; количество погибших на фронтах Великой Отечественной войны — 18 чел.; погибших в партизанских отрядах и подполье — 9 чел.

2.6.1969 г. Председатель исполкома Докшицкого горсовета депутатов трудящихся Е.Филиппова.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4683, воп. 3, спр. 750, л. 90.*

## Аблава

— Хальт! Хендэ хох!

З-за куста выйшаў здаравенны немец у зялёным плямістым маскіровачным халаце, гумавых ботах вышэй каленяў, з аўтаматам, прыстаўленым да жывата.

Хвіліну Шура стаяў як укопаны. У вачах замітусіліся, забегалі зялёныя, сінія кругі. Немец, убачыўшы, што перад ім хлапчук, не рынуўся да Шуры, а пайшоў павольна, з цяжкасцю выцягваючы ногі з гразі. У руцэ ў яго быў доўгі лазовы дубец. Збоку шаснулі кусты, захлюпала гразь — прама на немца наляцелі дзядзька Мікалай, Андрэй, некалькі хлапчукоў. Ад нечаканасці яны аслупянелі. Немец крута павярнуўся і з размаху трэснуў лазовым дубцом дзядзьку Мікалая па галаве. Потым кінуўся да Андрэя. Андрэй закрыў твар рукой, і ўдар дубца прыйшоўся па руцэ...

— Хальт!

Перад Шурам стаяў немец, ужо другі, худы, з мяшкамі пад вачыма, старэйшы і крыху вышэйшы за першага. Ён быў таксама, як і першы, у маскіровачным халаце. На грудзях вісеў аўтамат. Ён стаяў перад Шурам, як прывід... У душы Шуры ёкнула, нібы штосьці абарвалася...

У лесе трашчала — немцы ганяліся за людзьмі і білі дубцамі. Людзі кідаліся хто куды, правальваліся ў гразь. Немцаў было вельмі многа — сышліся два сустрэчныя ланцугі.

Нарэшце ўсіх злоўленых сагналі ў гурт, акружылі і пагналі. «Што з намі зробяць?» — трывожна шапталі жанчыны. Малыя дзеці ледзь спраўляліся ісці за маткамі, збівалі пачарнелыя ад гразі ногі аб карэнні, аб карчы.

— Шнэль! Шнэль, партызан! — падганялі немцы.

Шура бег збоку. Перад ім, сагнуўшыся, рыўкамі мітусіўся дзядзька Мікалай. Збоку ад дзядзькі Мікалая ішоў Андрэй Брэйт. Правая рука яго была ў крыві.

Гушчар расступіўся, і перад людзьмі адкрылася нешырокая, але доўгая ўправа і ўлева лугавіна, перарэзаная ўздоўж рэчкай.

— Ваўчэнская рэчка, — сказаў дзядзька Мікалай.

Ля рэчкі было многа жанчын і дзяцей, іх злавілі раней. Калі падышлі бліжэй, Шура пазнаў многіх аднавяскоўцаў. Але больш тут былі людзі з іншых вёсак — Вускрам'я, Брадка, Ваўчы. Былі і з Бягомля. Людзі стаялі, панура апусціўшы галовы.

У абодва канцы лугавіны, як акінуць вокам, было процьма немцаў. Адны галёкалі, лавілі коней і кароў, што выбягалі з лесу, іншыя, распрануўшыся да пояса, мыліся ў рэчцы.

Чатыры немцы з ручнымі кулямётамі заляглі кругом людзей. Загаласілі жанчыны. Некаторыя пачалі развітвацца.

Блізіўся вечар. Ад лугавіны патыхала халадам. Над рэчкай дрыжэў туман. Лес, які абступаў лугавіну, пачаў зліваццa ў адну суцэльную масу, стаў суровым, непрыступным.

Немцы пастроілі людзей у калону. Жанчыны бралі на рукі дзяцей.

Вялікая калона мужчын, жанчын і дзяцей расцягнулася па вільготнай дарозе ўздоўж Ваўчэнскай рэчкі. Абапал калоны — немцы. Іх многа, многа. Узброеныя, на тварах сеткі ад камароў.

Хутка сцямнела. Ноч росная, халодная. Дарога пайшла лесам, пад гару.

Мінулі невялікае поле, зноў ішлі лесам, але толькі вельмі рэдкім — на дваццаць — трыццаць метраў сасна ад сасны.

Неўзабаве ступілі на шашу. Увайшлі ў вёску. У мяккім блакітным змроку летняй ночы цямнелі хаты, зямлянкі.

— Ваўча... — сказаў дзядзька Мікалай.

На вуліцы раўлі грузавікі, танкі, бронемашыны, трашчалі матацыклы. Уся вёска была запруджана нямецкімі салдатамі. «Адгэтуль нялёгка будзе ўцячы», — думаў Шура.

Калону падагналі да невялікага возера, якое было ў цэнтры Ваўчы. Загадалі спыніцца.

Шура прыглядаўся да людзей — шукаў Юрку. Юркі не было.

Немцы сабраліся ў гурт, загаманілі — аб нечым раіліся. Затым узрушыліся, разбегліся, пачалі заганяць людзей — каго ў хаты, каго ў хлявы.

Шура трапіў у невялікі хлеўчык, што стаяў каля возера. Там было цёмна і смуродна. Шура праціснуўся да дзвярэй — яны былі высока ад зямлі, лёг на бок, тварам да вуліцы. Дыхаць стала лягчэй. Падклаў пад галаву бацінкі. На двары Шура ўбачыў двух фашыстаў. Яны ляжалі за ручнымі кулямётамі. Адзін кулямёт быў наведзены на хату, другі — на хлеў. Стомленасць, голад, усё перажытае за дзень настолькі прытупілі пачуцці Шуры, што ён глядзеў у дула кулямёта і страх зусім не кранаўся яго душы.

Прачнуўся Шура, калі сонца было высока над хлеўчыкам. І прачнуўся ён не ад таго, што выспаўся, адпачыў. Ад пакут і трывог ён

не ведаў ні стомы, ні бадзёрасці, — прачнуўся ён таму, што дзверы хлеўчыка былі расчынены, і зыркія промні сонца лезлі яму проста ў вочы. А яшчэ не давалі спакою людзі. Яны то выходзілі з хлеўчыка, то заходзілі туды. І амаль кожны чапляўся нагамі за Шуру.

Шура ўзняўся, страсянуў пясок з кажуха і выйшаў на двор. Тут было поўна людзей. Адны хадзілі па двары, другія сядзелі на траве. Жанчыны кармілі малых. Кармілі хто чым мог.

Кроках у пяці ад хлява сядзела цётка Сарахвіна са сваімі дзецьмі. Зводалля яна сваім выглядам нагадвала квактуху, акружаную куранятамі. Яна жавала сухар і мякіш давала Алёшку і Міколку. Яны елі жавалку. Піліп грыз сухар сам.

Цётка Сарахвіна ўзяла з хатуля кацялок і накіравалася да возера. Двор быў на пагурку, і ўсё возера віднелася адтуль як на далоні. З-за хлеўчыка выйшаў немец і перагарадзіў цётцы дарогу, а як убачыў, што яна хоча абысці яго, злосна адштурхнуў яе. Хлапчукі закрычалі, заплакалі і кінуліся да маці.

— Пан, вады дзеці просюць! — паказала цётка Сарахвіна на хлапчукоў і на возера.

— Цурук! — загадаў немец і прыцэліўся на яе з вінтоўкі.

Цётка Сарахвіна паспяшыла назад.

— Пацярпіце, дзеткі!

На вуліцы, наўпроць двара, спыніліся крытыя брызентам машыны. З машын высыпала многа немцаў з аўтаматамі і ручнымі кулямётамі. На рукавах у іх былі нашыты чарапы, пад чарапамі — крыж-накрыж косці... Немцы акружылі двары.

Убачыўшы чарапы і косці, Шура закалаціўся ад страху. Ён ведаў, што такія нашыўкі на рукавах насілі карнікі. Гэта яны летась спалілі жыхароў вёсак Вольберавічы, Асінавік, П'яны Лес, расстралялі вускрамскіх мужчын. А ў вёсцы Шунеўка людзей кідалі ў калодзеж, заганялі ў хаты, палілі. У Бягомлі на Паштовай вуліцы людзей сагналі ў хлеў, замкнулі і падпалілі. Усчаўся жудасны крык жанчын і дзяцей. Але мацней усіх завірашчэў парсюк, — нейкім чынам апынуўся там. Карнікі расчынілі вароты, аблажылі людзей з аўтаматаў і кінуліся лавіць парсюка, які выскачыў з хлява, ірвануў на вуліцу. Хлеў гарэў. Соню Герасімёнак кулі не зачапілі. Яна падпаўзла да выхада, — немцаў няма, — азірнулася: «Мама... Мама... Дзе ты?». Маці прыўзнялася: «Бяжы... Уцякай, дачушка, адна... Я паміраю. Забілі мяне». Соня выпаўзла ў бульбу, праляжала там да цёмнага. Уночы знайшла ў лесе бягомльцаў.

Шура бачыў, як немцы схапілі некалькі мужчын, загадалі насіць з машын ахапкі саломы і класці кругом будынкаў. Па вуліцы бегаў з каністрай немец, у якога правае вока было завязана. Ён абліваў бензінам платы, вароты сяліб, сцены пабудоў. Карнікі пачалі заганяць людзей у хаты і хлявы.

— Шура, Юрка, Піліп, Міколка, Алёшка! — гукнула цётка Сарахвіна. — Будзьце са мной! Мусіць, нас паліць будуць!

Алёшка і Мікола заплакалі.

«Калі страляць пачнуць, то павалюся першым, да стрэлу... — падумаў Шура. — Можа, застануся жывы. Выпаўзу. Дабяруся да лесу. Прыб'юся хоць да каго...»

Да варот падляцела легкавая машына. Адтуль выскачыў афіцэр, выхапіў з кабуры наган і стрэліў угору. Некалькі немцаў падбегла да яго. Ён штосьці сказаў ім, паказваючы наганам у напрамку Бягомля, сеў у легкавушку і паехаў...

Немцы выгналі ўсіх людзей на вуліцу, паставілі ў чатыры рады. Двое хадзілі перад радамі і на выбар бралі людзей, загадвалі ісці за сабой. Адводзілі да возера, давалі рыдлёўку, — на беразе ляжала іх цэлая груда. Шуру таксама павялі, далі рыдлёўку. Загадалі садзіцца ў машыны.

Шура трапіў у адну машыну з Андрэем і дзядзькам Хведарам. Тут крыху ачухаўся. З мужчынамі ён не прападзе. Толькі невядома яшчэ, куды іх павязуць... Можа, прымусяць капаць для сябе магілу?

Ад'ехаўшы кіламетры тры ад Ваўчы, машыны спынілся. Далей ехаць нельга было: уся дарога была перакапана. Немцы загадалі людзям вылезці, закапваць перакопы.

У Ваўчы Шура зноў апынуўся на тым самым двары. Знайшоў цётку Сарахвіну з дзецьмі і Юрку.

Ноч. Другая ноч у палоне. І зноў Шура быў у хлеўчыку. Там былі Андрэй і дзядзька Хведар. Дзядзька Мікалай, цётка Сарахвіна з малымі пайшлі начаваць у хату. Юрка спаў на двары, недалёка ад хлеўчыка.

Шура засынаць не думаў. Ён намерыўся прасачыць, калі будуць уцякаць Андрэй і дзядзька Хведар, тады ён пазаве Юрку, і яны пойдуць за мужчынамі. Але як ні стараўся Шура, каб не заснуць, — нічога з гэтага не выйшла. Апоўначы яго змарыў сон. Прачнуўся раніцай ад моцных штуршкоў. Тармашыў яго дзядзька Мікалай.

— Уставай! Усіх выганяюць на вуліцу! Многа немцаў панаехала...

Дарослым мужчынам і жанчынам, а таксама падлеткам немцы загадалі стаць па адзін

бок вуліцы; старым і дзецям — па другі. Хадзілі між людзей і самі выбіралі, каго куды паставіць. Шура апынуўся разам з дарослымі. Тут быў і дзядзька Мікалай.

Цётка Сарахвіна з малымі і Юрка былі на другім баку вуліцы. Ім загадалі вяртацца назад у двор.

Да Шуры падбегла цётка Сарахвіна.

— Во рукавок гароху. Я табе насыпала, а ты не ўзяў. Вазьмі. Дзе-небудзь голад параб'еш. Вас, мусіць, некуды пагоняць, а невядома што з намі будзе... — і пачала цалаваць Шуру.

Падышоў немец, адштурхнуў цётку, паказаў ісці ў двор, куды сагналі ўсіх старых і малых.

На вуліцы засталося чалавек паўсотні. Тут былі людзі з розных вёсак. Стаялі доўга.

Апоўдні людзей пастроілі ў калону і пагналі. Уперадзе гналі жывёлу — коней, кароў, тарахцелі падводы. На падводах было ўсё: пасцілкі, мяшкі збожжа, адаробкі, калаўроты, дзежкі.

Каля вёскі Баяры недалёка ад лесу спынілі на прывал. Паселі хто як мог. З лесу выйшла згорбленая бабулька. У руках у яе быў невялічкі хатулёк. Яна падышла да людзей, развязала хатулёк — высыпала на траву праснакі і пачала раздаваць людзям. Раздала, пажадала здароўя і зноў пайшла к лесу.

Канваіры сядзелі паводдаль і ўміналі кансервы з хлебам.

Калі бабулька адышлася метраў на паўсотню, адзін з канваіраў ускочыў на ногі, выцер рукавом рот, схапіў вінтоўку, прыцэліўся. Грымнуў выстрал. Бабулька ўпала ніц. Упала ціха, нібы пакланілася зямлі...

Канваіры ўзнялі нявольнікаў, пагналі далей. Прайшлі Баяры, Дубавік, Асінавік, Вітунічы. Ва ўсіх вёсках не было ні душы.

Пад вечар перайшлі раку Поню.

Шура ўвесь час збіраўся ўцячы і спадзяваўся, што яму ўдасца вырвацца на волю. Але, калі перайшлі раку Поню, зразумеў, што ўцячы зараз будзе вельмі цяжка... За Поняй пачыналіся незнаёмыя мясціны, былая Заходняя Беларусь.

Каля Нябышына людзей спынілі на прывал. Сагналі ў гурт разам і людзей, і жывёлу...

Прыйшлі ў Докшыцы.

Людзей загналі ў двор касцёла на прывал. Двор касцёла быў абнесены каменнай сцяной. Жалезныя крацістыя вароты, каля варот два вартавыя з аўтаматамі. Астатнія канваіры пайшлі ў мястэчка.

Як толькі канваіры вярнуліся, выгналі ўсіх на плошчу, акружылі шчыльным кальцом, пагналі. Уперадзе мычалі каровы, скрыпелі падводы. Падвод было цяпер усяго некалькі, менш было і жывёлы — канваіры пакінулі ў Докшыцах. Местачкоўцы, убачыўшы нявольнікаў, спыняліся, спачувальна аглядалі кожнага. Хутка калона мінула апошнія хаты Докшыц, выйшла на асфальт.

Вечарэла, калі ўперадзе паказалася станцыя Параф'янава. Падводы і жывёлу канваіры пакінулі на ўскраіне станцыі, людзей пагналі па пясчанай дарозе, у абход.

Мінулі лажбіну. Наперадзе, злева ад дарогі, убачылі тры вялізныя пуні, абнесеныя калючкай. Каля высокіх варот, якія нагадвалі сабой велізарную раму з тоўстых рэек, густа заплеценую калючым дротам, канваіры загадалі спыніцца.

Ноч. Цёмная, густая. Здавалася, быццам неба, мутнае, чорнае, прадзіраўленае рэдкімі зоркамі, апусцілася на людзей, давіць на цемя. Вее холадам. Аднекуль цягне сырасцю. Золка. Бяруць дрыжыкі.

*А.С.Ставер.*

*Аўтар — малалетні вязень фашызму, у 1943 г. быў вывезены ў Германію.*

*Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Ставер А. Пад канвоем. Мн., 1969. С. 26—40.*

## Шунеўка — сястра Хатыні

Хатынь, Дальва, Шунеўка... Колькі іх на шматпакутнай беларускай зямлі... У горане вайны загінулі мільёны савецкіх людзей. У тагачасных Докшыцкім і Бягомльскім раёнах загінуў кожны трэці. Уся тэрыторыя раёна была зонай актыўнага супраціўлення ворагу. 19 снежня 1942 г. партызаны брыгады «Жалязняк» прагналі фашыстаў з Бягомля і ўзялі пад свой кантроль тэрыторыю плошчай 2 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 40 тыс. чалавек. Бягомль быў цэнтрам Бягомльска-Барысаўскай партызанскай зоны.

Усё насельніцтва раёна актыўна дапамагала партызанам у іх барацьбе з фашыстамі. Таму нямецкае камандаванне ў маі—чэрвені 1943 г. праводзіць карную аперацыю «Котбус», у якой робіць стаўку на знішчэнне мірных жыхароў. У раёне было спалена 99 вёсак, 3 927 двароў, знішчана больш як 20 тысяч мірных жыхароў. Чатыры вёскі —

Шунеўка, Азарцы, Залатухі, Папоўкі (тэрыторыя, на якой знаходзілася гэтая вёска, пасля вайны адышла да Лепельскага раёна) — так больш і не аднавіліся.

Да Айчыннай вайны ў Шунеўцы налічвалася 28 двароў. У гады польскай інтэрвенцыі ў 1920 жыхары вёскі Аляксандр Іванавіч Шульгат, Раман Лявонцевіч Ананіч, Уладзімір Іванавіч Стэльмах, Пётр Сямёнавіч Руткоўскі ўліліся ў рады Чырвонай Арміі і змагаліся з ворагамі да поўнай перамогі. Пасля заключэння Брэсцкага міру Шунеўка аказалася на самай граніцы з Польшчай. Яе жыхары, асабліва моладзь, аказвалі вялікую дапамогу савецкім пагранічнікам у затрыманні парушальнікаў граніцы. Вясной 1930 г. ўсе вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Чырвоны воін». Першым старшынёй калгаса быў Іван Сямёнавіч Руткоўскі.

22 чэрвеня 1941 г. мірнае жыццё было перарвана нашэсцем фашысцкіх захопнікаў. 2 ліпеня немцы былі ўжо на тэрыторыі нашага раёна. 12 жыхароў вёскі, у іх ліку Вікенцій Лявонцевіч Ананіч, Антон Сяргеевіч Ананіч, Уладзімір Іосіфавіч Ананіч, Павел Сямёнавіч Руткоўскі, Уладзімір Іванавіч Ананіч, Уладзімір Аляксеевіч Бажок, Іван Сямёнавіч Руткоўскі і іншыя, пайшлі на фронт і са зброяй у руках сталі на абарону нашай Радзімы. Усе яны, акрамя Івана Сямёнавіча Руткоўскага, загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Не скарыліся ворагу і жыхары вёскі, якія трапілі пад фашысцкую акупацыю. Актыўна працавалі падпольшчыкі, якіх узначальваў старшыня Вітуніцкага сельсавета, потым сакратар Бягомльскага райвыканкома Пётр Сямёнавіч Руткоўскі. У далейшым ён стаў камісарам артбатарэі брыгады «Жалязняк» і членам бюро Бягомльскага падпольнага РК КП(б)Б. Яны сабралі і перадалі партызанам 2 станкавыя і 10 ручных кулямётаў, 15 вінтовак, 5 тысяч патронаў і 2 скрынкі гранат. Актыўнымі памочнікамі П.С.Руткоўскага былі Спірыдон Яфімавіч Кірвель, Уладзімір Пятровіч Ананіч і Мікалай Яфімавіч Ананіч. У партызанскіх атрадах змагалася 8 чалавек. Уладзімір Аляксеевіч Бажок быў кулямётчыкам, ён загінуў у баі ля в. Восава. Усе жыхары вёскі дапамагалі партызанам прадуктамі харчавання, вопраткай і абуткам, у некаторых выпадках забяспечвалі партызан фурманкамі, праваднікамі і сувязнымі.

22 мая 1943 г. на досвітку, пасля таго як на шашы непадалёк ад Шунеўкі на партызанскай міне падарвалася аўтамашына з нямецкімі салдатамі, у вёску ўварваліся фашысцкія



Мемарыяльны комплекс «Шунеўка». Фрагмент «Калодзеж».




Мемарыяльны комплекс «Шунеўка». Фрагмент.




Мемарыяльны комплекс «Шунеўка». Агульны выгляд.

карнікі. Частка жыхароў хавалася ў лесе побач з вёскай, але ўцячы яны не паспелі. Неўзабаве вёска была ахоплена шчыльным колам гітлераўцаў. З аўтаматамі ў руках фашысты ўрываліся ў хаты, білі сялян, выштурхоўвалі іх на вуліцу. Затым сагналі жанчын, падлеткаў і старых у вялікую калгасную пуню, зачынілі дзверы і падпалілі. Плач, крыкі, праклёны ў адрас катаў далёка разносіліся ў тую вясновую раніцу. Іх чулі нават жыхары суседніх вёсак Дабрунь, Нябышына, Рашкаўка.

Другая група вылюдкаў занялася малымі дзецьмі. Іх пагналі да калодзежа. Да дзяцей кінулася настаўніца Нябышынскай школы Ніна Сямёнаўна Руткоўская і яе вучаніца, сямікласніца Надзя Каляга. Ніна Сямёнаўна на нямецкай мове (яна выкладала яе ў школе) спрабавала ўпрасіць салдат і афіцэраў злітавацца над малымі. Калі ж просьба не памагла, яна стала разам з Надзяй абараняць дзяцей. Але што яны маглі зрабіць удваіх супраць гэтых звяроў у чалавечым абліччы? Знявечаных, беспрытомных, фашысты кінулі іх у калодзеж. Услед за імі гітлераўскія вылюдкі пакідалі туды дзяцей і закідалі калодзеж гранатамі...

Над пуняй з зачыненымі там людзьмі ў гэты час ужо шугала полымя. Тых, хто спрабаваў неяк вырвацца з агню, расстрэльвалі з аўтаматаў.

У той страшны дзень у Шунеўцы загінула 66 чалавек, у тым ліку 15 дзяцей ва ўзросце да 6 гадоў. Цудам засталіся ў жывых толькі Канстанцін Ананіч з сямігадовай дачкой Соняй, якім пашчасціла застацца незаўважанымі, калі фашысты выганялі жыхароў Шунеўкі з лесу, і Валодзя Руткоўскі, сын партызанскага камісара Пятра Сямёнавіча Руткоўскага і стрыечны брат Соні Ананіч, яе аднагодак, якому ўдалося выратавацца з ахопленай полымем адрыны. Задыхаючыся ад дыму, пакутуючы ад гарачыні, ён здолеў неяк знайсці дзірку пад сцяной і, раскалупаўшы яе, выбрацца з пекла і дабегчы да лесу. Карнікі стралялі яму ўслед, але куля не зачапіла яго.

Канстанцін Ананіч з дачкой, разумеючы, што нічым ужо не дапамогуць аднавяскоўцам, лесам дабраліся да суседняй вёскі Дабрунь і расказалі пра зверствы карнікаў. Хутка ўся вёска ведала пра трагедыю Шунеўкі: папярэджанне перадавалася з хаты ў хату. Таму, калі фашысты ўварваліся ў Дабрунь, іх сустрэў толькі брэх раз'юшаных сабак. Ніводнага жыхара ў вёсцы не засталося. У бяссільнай злосці фашысты спалілі тут 38 двароў. Але больш як 200 мірных жыхароў выратаваліся ад жудаснай смерці.

Сярод жыхароў Шунеўкі жывымі засталіся таксама Іван Сямёнавіч Руткоўскі, які быў у Савецкай Арміі, Пётр Сямёнавіч Руткоўскі, Аляксандр Канстанцінавіч Васількевіч, які быў вывезены ў Германію, Ірына Іосіфаўна Ананіч і Марыя Аляксандраўна Руткоўская.

Шунеўка так і не была адноўлена. Не было каму яе аднаўляць. Нешматлікія ацалелыя яе жыхары пасяліліся ў іншых месцах. Ананічы пасля вайны знайшлі сабе прытулак у Дабруні, Валодзю Руткоўскага лёс закінуў у Карэлію.

У 1967 г. на месцы трагедыі з'явіўся абеліск. Адным з ініцыятараў стварэння гэтага помніка быў старшыня калгаса «Іскра» Аркадзь Канстанцінавіч Голуб. Ён ні на хвіліну не сумняваўся: людзі не будуць супраць, а, наадварот, падтрымаюць, самі дапамогуць. Бо размова ішла не столькі пра абеліск, які абазначае месца трагедыі, колькі аб помніку канкрэтным людзям, імёны якіх належала аднавіць на мемарыяльнай пліце.

Не багаты быў калгас «Іскра» ў тыя гады. Але на такую справу грошы знайшліся. Кожны калгаснік дапамагаў чым мог. Інакш і не магло быць.

Гэты абеліск захоўваў памяць аб трагедыі больш як дзесяцігоддзе. Пазней было вырашана ўзвесці мемарыял на месцы, дзе была Шунеўка. У стварэнні мемарыяльнага комплексу «Шунеўка» прымалі ўдзел амаль усе працоўныя калектывы раёна, вучні школ. Будаўніцтва было скончана менш чым за тры месяцы. 15 чэрвеня 1979 г. мемарыял быў адкрыты. Стылізаваныя бетонныя падмуркі на месцы спаленых хат. Застылы ў бетоне зруб калодзежа, у якім гітлераўцы загубілі дзяцей. Абеліск на месцы адрыны, у якой былі спалены жывымі старыя, жанчыны і падлеткі... Але свой канчатковы выгляд мемарыяльны комплекс займеў 3 ліпеня 1983 г., калі быў адкрыты цэнтральны манумент мемарыяла —

скульптурная выява жанчыны-маці з узнятымі ў праклёне фашысцкім нелюдзям рукамі ў праёме стылізаванай брамы. На гарызантальнай бэльцы брамы — тры званы, адзін з якіх расколаты.

...Калі б вы ні прыехалі сюды, вас сустрэне цішыня, падсвечаная фарбамі пэўнай пары года. Зімой — белая да галавакружэння. Восенню — таямніча-жоўтая з-за доўгіх лістападаў. Летам — сонечна-гарачая. А вясной — ярка-зялёная. Быццам хвіліна Маўчання пасялілася на гэтай зямлі назаўсёды. Цішыню парушаюць толькі рэдкія ўдары звону, напамінаючы людзям: «Яны любілі жыццё, але згарэлі ў полымі вайны... Людзі, будзьце пільныя, беражыце мір!»



Жыхар в. Шунеўка П.С.Руткоўскі.

## «Праклён фашызму»

Такую назву носіць мемарыяльны комплекс на ўшанаванне памяці жыхароў в. Шунеўка і іншых вёсак Докшыцкага раёна, знішчаных разам з насельніцтвам у 1941—44 гг. нямецка-фашысцкімі акупантамі. Адкрыты на месцы в. Шунеўка 3.7.1983 г. (скульптар А.Анікейчык, архітэктары Ю.Градаў, Л.Левін).

Цэнтральны манумент мемарыяла — бронзавая фігура жанчыны (вышынёй 4,75 м), якая стаіць з узнятымі ў праклёне рукамі ў праёме стылізаванай брамы (вышынёй 11,5 м). Да абламанага канца гарызантальнай перакладзіны брамы прымацаваны 3 званы, 2 з якіх звоняць, 3-і расколаты — як сімвал таго, што на Докшыччыне і Бягомльшчыне ў вайну загінуў кожны трэці жыхар — больш за 20 тыс. чалавек. Непадалёку ад цэнтральнага манумента бетонны зруб калодзежа, куды гітлераўцы кінулі жывымі дзяцей і настаўніцу. На ім бронзавая выява прабітага і абпаленага паветранага змея з імёнамі загінуўшых дзяцей, які сімвалізуе абарванае вайной дзяцінства. На месцы былых сялянскіх сядзіб 22 мемарыльныя знакі — падмуркі, над кожным з якіх трохпрыступкавы ганак, на верхніх прыступках бронзавыя кампазіцыі ў форме языкоў полымя з імёнамі былых гаспадароў — сімвал вечнай памяці пра тых, хто загінуў.

## У даўгу неаплатным

Цяпер цяжка сказаць, хто першы падаў ідэю стварыць помнік на месцы спаленай вёскі. Сяляне з суседніх вёсак, як умелі, пачалі будаваць комплекс. Захоплены гэтым былі і старыя, і малыя. Аднак самыя добрыя намеры не заўсёды ў такіх выпадках, на жаль, увасабляюцца ў мастацкай форме, па годнасці адлюстроўваюць падзею. Але ж такія помнікі павінны бударажыць душы людзей, закранаць у іх самыя патаемныя струны. Пабываў на месцы трагедыі я. Ездзіў не адзін, а са сваімі пастаяннымі сааўтарамі — лаўрэатамі Ленінскай прэміі архітэктарамі Леанідам Левіным і Юрыем Градавым. На былым папялішчы і нарадзілася ідэя скульптурнай кампазіцыі.

Там, дзе некалі быў цэнтр вёскі, ускінуўшы ўверх сціснутыя кулакі, застыла жанчына. Амаль пяціметровая фігура маці ў агні. Яна яшчэ жывая, і яна праклінае ворага. Комплекс так і назвалі: «Праклён фашызму». Галоўнае ў комплексе — непакорнасць ахвяр, нянавісць да вайны, да смерці, да фашызму. Я, як аўтар, пратэстую, імкнуся глянуць на трагедыю саракагадовай даўнасці з пазіцыі сённяшняга дня. Так нарадзілася думка стварыць помнік-пратэст.

Калі пачынаў работу, то, скажу сумленна, былі сумненні, — падобныя комплексы ёсць у іншых аўтараў. Але ў Беларусі сотні, тысячы месцаў, дастойных памяці народнай, і кожны помнік будзе непаўторны, калі ў яго

ўкладзена часцінка сэрца мастака. У дні акупацыі я жыў у дзеда ў Стаўбцоўскім раёне і быў сведкам зверстваў фашыстаў. Калі гітлераўцы палілі Шунеўку, мне было адзінаццаць гадоў — гэта ўзрост, калі ўражанні западаюць у душу назаўсёды. І я астатак жыцця буду адчуваць сябе ў неаплатным даўгу перад тымі, хто не вярнуўся з вайны, загінуў у яе агні. Я хачу, каб мае работы не толькі сёння, але і заўтра напаміналі людзям аб пільнасці, клікалі да барацьбы за мір.

*А.А.Анікейчык, скульптар, народны мастак Беларусі.*
*(З інтэрв'ю газеце «Вечерний Минск», 1983).*

## Ходараўская трагедыя

**З успамінаў Вітольда Станіслававіча Божалкі, былога кінамеханіка в. Дзядкі**

У тую чэрвеньскую раніцу 1944 г. ў нашай вёсцы Дзядкі было неспакойна. Па вёсцы паўзлі чуткі, што немцы ўцякаюць, што з дня на дзень трэба чакаць прыходу Чырвонай Арміі — вызваліцельніцы.

Трывога жыхароў вёскі тлумачылася зверствамі гітлераўцаў. Вымушаныя ўцякаць з захопленай савецкай зямлі, яны не спыняліся ні перад чым: рабавалі насельніцтва, палілі вёскі, гналі на катаргу моладзь. Пры падтрымцы франтавых армейскіх часцей праводзілі ў партызанскіх зонах буйнамаштабныя карныя аперацыі. Партызан ім, натуральна, знішчыць не ўдалося, і ўсю злосць за няўдачы і страты, якія яны неслі ў сутычках з народнымі мсціўцамі, карнікі вымяшчалі на цывільным насельніцтве. Як стала потым вядома, у ходзе аблаў і прачосаў лясоў фашысты хапалі жанчын, дзяцей, старых. У адных выпадках яны адразу знішчалі сваіх ахвяр, у другіх — адпраўлялі іх у канцлагеры і на катаржныя работы ў Германію.

Такі канцлагер быў створаны акупантамі вясной 1944 г. непадалёку ад ст. Параф'янава, на ўскрайку в. Лібараўшчына. Тут, на абгароджаным у некалькі радоў калючым дротам полі, пад дуламі кулямётаў і злым рыканнем аўчарак, пакутавалі пад адкрытым небам, без харчу і вады многія сотні савецкіх людзей з шэрагу раёнаў Віцебскай, Мінскай, Вілейскай абласцей. Больш здаровых заганялі ў таварныя вагоны і адпраўлялі ў Германію, а ўсіх астатніх фашысцкія звяры перад сваімі ўцёкамі знішчылі ў бярэзніку паблізу фальварка Ходараўка, за 1,5—2 км ад в. Дзядкі. Мне давялося быць выпадковым сведкам гэтага злачынства.

У тую цёплую сонечную раніцу 27 чэрвеня ўсе ў нашай вёсцы пачулі глухі перастук гарматнай кананады. Гэта савецкія войскі гналі фашыстаў на захад, вызваляючы сваю зямлю. Аб тым, што ў немцаў справы зусім дрэнь, сведчыў і той факт, што іх аэрадромная служба ў Сітцах пачала падрываць узлётна-пасадачныя палосы, аэрадромныя збудаванні, склады. У нас, у Дзядках, ва ўсіх хатах павысыпаліся шыбы ад аглушальных выбухаў. Усё, што магло гарэць, было спалена і ў Сітцах, і ў Параф'янаве.

Па палявой дарозе з-пад Порплішча ў напрамку на Заборцы рухаліся падводы — гэта ўцякалі на Захад сем'і паліцаяў і іншых паслугачоў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Мужчынкі, — трывожна загаласілі дзядкоўскія жанчыны, — бярыце коней і ўцякайце ўсе ў лес, у кусты. А то пахапаюць немцы і коней і вас саміх. Як жа мы тады жыць будзем?»

Бацька мой быў ужо ў гадах. Таму ён вырашыў з вёскі не сыходзіць. «Што будзе, тое будзе, — сказаў ён рашуча. — А ты, сынку, бяры каня і бяжы з усімі ў ельнік пад Ходараўку. Баюся я за цябе, ды і каня шкада».

Бацькава трывога была недарэмная. Мне тады споўнілася 16 гадоў. Якраз такія маладыя хлопцы і патрэбны былі фашыстам для работы ў Германіі. І вось мы, моладзь і некалькі сталейшых сялян, збеглі ў ельнік. Неспакойна было на сэрцы. Смерць падпільноўвала тады на кожным кроку не толькі тых, хто са зброяй у руках ішоў партызанскай сцяжынай ці франтавой дарогай, але і цывільнае насельніцтва. Раптам да нас данесліся доўгія аўтаматныя і кулямётныя чэргі, гулкія выбухі. Стралялі дзесьці недалёка, з боку в. Вялікія Сітцы.

Прывязаўшы коней да дрэваў, мы асцярожна выйшлі на ўзлесак. Адсюль, з узгорку, добра было бачна наваколле. Справа была в. Дзядкі, а злева — дарога на Новую Вёску і наўзбоч дарогі жытнёвае поле. Астраўком сярод поля выступала густое драбналессе, злева ад якога быў хутар Івана Плюты, а з боку Вялікіх Сітцаў — хутар Аляксандра Кучыца. Стрэлы і выбухі гучалі з гэтага зарасніку. Сумненняў не было: там адбывалася нешта жахлівае, бесчалавечнае.

Нечакана з кустоў ад поля выйшаў мужчына і, разгублена азіраючыся, падышоў да нас. Мы пазналі ў ім Пятра Скрабнеўскага. «Там немцы нейкіх людзей забіваюць, — дрыжачым голасам прамовіў ён. — Я каля свайго хутара хаваўся. Як пачалася страляніна, папоўз жытам і прыкладна метраў са ста некалькі хвілін назіраў. Яны падганяюць да ямы людзей, загадваюць распранупца да ісподняга і страляюць. А потым кідаюць у яму гранаты. Гляньце, вунь па дарозе гоняць яшчэ...»

Мы ўсе павярнуліся ў бок Новай Вёскі, адкуль па дарозе да Ходараўкі канваіры з сабакамі гналі вялікую партыю людзей. На скрыжаванні калона звярнула ўлева і накіравалася туды, дзе ўсё яшчэ чуліся кароткія чэргі, адзіночныя стрэлы, гранатныя выбухі. Каб лепш было бачна, я і некаторыя мае сябры ўзабраліся на старыя елкі і адтуль доўга назіралі, як немцы гналі да пагібельнага месца ўсё новыя партыі людзей. Некаторых, напэўна, саслабелых ад голаду і збітых, гітлераўцы везлі на грузавіках. Назад у гэтых машынах ехалі толькі канваіры. Да самага вечара страляніпай і выбухамі, крыкамі і стогнамі людзей, якіх забівалі, напаўнялася наваколле Ходараўкі. Пабоішча працягвалася і на наступны дзень.

2 ліпеня, калі ўжо прыйшла Чырвоная Армія, мы, падлеткі, пабеглі ў той жудасны лясок. Страшэнная карціна паўстала перад вачыма. У розных месцах таго драбналесся жаўцелі свежай глінай і пяском спехам закіданыя голлем 5 ям памерам 3×4 м. Ка́ты так спяшаліся з крывавай работай, што не засыпалі ямы як мае быць: з-пад пяску і гліны былі бачны ногі і рукі расстраляных. Відаць, некаторыя ахвяры спрабавалі ўцячы і падалі, скошаныя кулямі, у баку ад ям. І тады забойцы цягнулі іх па зямлі ў яму.

Людзі потым расказвалі, што ка́ты ў зялёнай нямецкай форме некалькі разоў на працягу гэтых двух дзён прыходзілі на хутар Аляксандра Кучыца змываць з сябе людскую кроў і «падзапраўляцца» шнапсам.

На ўскрайку мы выявілі вогнішча. Тут валяліся абгарэлыя рэшткі чамаданаў, абутку, вопраткі і іншых рэчаў. Доўгі час ад запоўненых расстралянымі ям сыходзіў цяжкі трупны пах.

Як расказала жыхарка Ходараўкі Адэля Іванаўна Пашкевіч, яна 29 чэрвеня знайшла




Мемарыяльны комплекс «Ходараўка». Цэнтральны ўваход.

на месцы расстрэлу напісаную алоўкам запіску. «Адпомсціце за нас!» — заклікаў невядомы аўтар гэтай перадсмяротнай просьбы.

У пачатку верасня 1944 г. настаўнік Дзядкоўскай школы Сямён Міхайлавіч Сцепанец з групай школьнікаў накіраваліся добраўпарадкаваць магілы. Быў у той групе і я. Усе 5 ям, ад якіх усё яшчэ сыходзіў цяжкі пах, мы засыпалі тоўстым слоем зямлі. Над кожнай магілай насыпалі ўзгорачак. Скончыўшы работу, селі адпачыць. Я выпадкова ўдарыў рыдлёўкай аб пень. З яго адвалілася кара і вывалілася маленькая фанерка памерам прыкладна 8 × 10 см. Я падняў яе. На фанерцы алоўкам было напісана, што тут немцы расстралялі 600 грамадзян з Ушацкага, Бягомльскага, Лепельскага раёнаў і 200 італьянцаў.

Абедзве запіскі не зберагліся, але змест іх захаваецца ў маёй памяці да апошняга дыхання.

У канцы другога дня масавай расправы, як ужо пачало вечарэць, у Ходараўку ў хату Францукевіча (імя і імя па бацьку не памя-



Мемарыяльны комплекс «Ходараўка». Фрагмент.

таю) прыпоўз у адной бялізне скрываўлены італьянец. Ён быў цяжка паранены, але ў яме апынуўся ў верхнім пласце трупаў. Калі апрытомнеў, выкараскаўся з ямы і дапоўз да вёскі. Францукевіч выходжваў яго некалькі дзён.

Гітлераўцы і іх халуі не змаглі схаваць сляды свайго злачынства. Хутка тайнае стала яўным. Са знойдзеных запісак, расказаў відавочцаў і сведчанняў тых, хто ведаў пра трагедыю, у ходзе судовых працэсаў над здраднікамі Радзімы стала вядома, што ў Ходараўцы былі расстраляны 600 вязняў канцлагера «Лібараўшчына». Гэта жыхары Бешанковіцкага, Лепельскага, Ушацкага і Бягомльскага раёнаў. Яны былі схоплены ў ходзе карнай аперацыі супраць партызан Полацка-Ушацкай, Лепельскай і Бягомльска-Барысаўскай партызанскіх зон.

Калі ў жніўні—верасні 1943 г. ў Італіі быў скінуты фашысцкі рэжым дыктатара Мусаліні, немцы абяззброілі італьянскія войскі і скарыстоўвалі іх, як і ваеннапалонных, на цяжкіх фізічных работах. Адна такая каманда са студзеня 1944 г. знаходзілася на ст. Параф'янава. Італьянцы працавалі на будаўніцтве ваенных аб'ектаў грузчыкамі, ліквідавалі вынікі партызанскіх дыверсій на чыгунцы. Іх спасціг лёс вязняў канцлагера «Лібараўшчына». Толькі да іх фашысты ўжылі такі каварны прыём: італьянцам было аб'яўлена, што іх нібыта адправяць у Італію на транспартных самалётах з Сітцаў. Яны склалі ў чамаданы і ранцы свае рэчы і ахвотна пад канвоем пайшлі на Новую Вёску. Ніхто з іх не здагадваўся, што ідзе на смерць.

А хто ж былі забойцы? Савецкія следчыя органы ўстанавілі, што бойню ў Ходараўцы ўчынілі карнікі «Зондэркаманды-9» СД. Гэта каманда прыбыла надоечы ў Новую Вёску Сітцаўскага сельсавета. Частка катаў размясцілася ў хаце Веры Каротчык. У карнікаў быў своеасаблівы «падзел працы»: адна група капала ямы, другая кантралявала смертнікаў, трэцяя іх забівала. Акрамя немцаў там былі і рускія, якія прадаліся акупантам і старанна «адпрацоўвалі» юдавы срэбранікі. Не ўсе з іх змаглі ўцячы са сваімі гаспадарамі і пасля вайны атрымалі па заслугах.

У жніўні 1977 г. і 4 ліпеня 1978 г. ў Віцебску адбыліся судовыя працэсы па справе былых катаў з «Зондэркаманды-9». У якасці сведкі я выступаў на жнівеньскім працэсе, а на ліпеньскім, паколькі я быў хворы, фігуравалі мае пісьмовыя паказанні.

*Запісана ў ліпені 1978 г.*

## Знішчэнне Докшыцкага гета

Паводле перапісу 1939 г. насельніцтва Докшыц складала каля 3,6 тыс. чалавек, у асноўным гэта былі яўрэі. Большасць іх, калі пачалася вайна, не змагла або не пажадала эвакуіравацца, не верачы чуткам пра выключную жорсткасць нацыстаў у дачыненні да яўрэйскага насельніцтва. Аднак ужо ў першыя месяцы акупацыі ў Докшыцах было створана гета, у якім за час яго існавання былі знішчаны 2653 яўрэі. Апошнім днём для яўрэйскай абшчыны горада стала 29 мая 1942 г., калі гета было «канчаткова ліквідавана». Гэтым страшным падзеям прысвечана кніга «Памяць: Докшыцы – Параф'янава», выдадзеная ў 1990 г. на англійскай мове ў Ізраілі. У кнізе занатаваны ўспаміны тых докшыцкіх і параф'янаўскіх яўрэяў, якім удалося застацца ў жывых, апавяданні пра тыя жудасныя дні, слёзы і боль па родных і знаёмых.

Барыс Казінец – адзін з нямногіх вязняў Докшыцкага гета, якім выпала ацалець у час яго «ліквідацыі». Яму пашчасціла трапіць да партызан. Ён ваяваў, са зброяй у руках помсціў за пакуты і смерць родных і сяброў. У кнізе «Памяць: Докшыцы – Параф'янава» ёсць і яго ўспаміны.

Нарадзіўся я ў 1919 г. ў Докшыцах. У 1934 г. паступіў у польскую школу. Потым працаваў у швейнай майстэрні. У 1941 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Полк наш размяшчаўся ў мястэчку Зэльва, што пад Ваўкавыскам.

На світанку 22 чэрвеня 1941 г. нямецкія войскі парушылі мяжу і ступілі на зямлю Савецкага Саюза. Наш полк з баямі адступаў у напрамку Баранавіч. Дзесьці пад Мінскам мы трапілі ў акружэнне. З яго я выходзіў разам з маім сябрам Молі Уэндам і яшчэ двума салдатамі Чырвонай Арміі. Ішлі лясамі, начавалі ў стагах сена, елі толькі тое, што давалі сяляне. Я ўжо тады з размоў з некаторымі людзьмі ведаў, што немцы вельмі дрэнна адносяцца да яўрэяў.

Мне пашанцавала, і 29 ці 30 чэрвеня 1941 г. я змог вярнуцца ў родны горад. Аб'явы, якія ўжо на гэты час былі развешаны на многіх пабудовах горада, загадвалі ўсім былым салдатам з'явіцца да нямецкіх улад. Я быў апрануты ў сялянскую вопратку і таму мог хаваць тое, што быў салдатам у нядаўнім мінулым.

Першымі двума ахвярамі фашыстаў сярод яўрэяў былі Мазін, звар'яцелы чалавек, і Маркман, які быў застрэлены ва ўласнай хаце. У ліпені загад насіць жоўтую стужку датычыўся ўжо ўсіх яўрэяў.

У гэтыя дні я вярнуўся ў абшчыну і запісаўся на працу. Працуючых збіралі кожную раніцу невялікімі групамі і пасылалі на работу або ў часовыя лагеры. Дысцыпліна там была вельмі строгая. Калі Зальман Раскін на некалькі хвілін спазніўся на работу, яму загадалі паўзці, а нямецкі салдат біў яго 25 разоў. Мы бачылі, як моцны і здаровы Зальман уздрыгваў пры кожным удары. У душы мы пакляліся помсціць і не ўяўлялі, што ў хуткім часе ў горадзе не застанецца ў жывых ніводнага яўрэя.

Немцы пачалі адбіраць майстроў для стварэння груп рабочых. Мяне паслалі ў швейную майстэрню, дзе мы працавалі для іх арміі. Ад гэтай работы залежаў мой лёс на працягу ўсяго часу акупацыі. У Докшыцах была прызначана мясцовая адміністрацыя. Галоўным саветнікам немцы назначылі так званага Паўла Кавальскага, начальнікам паліцыі – Комульку, які служыў старшым сяржантам у Польскай Арміі. Ён быў родам з Познані, але гаварыў па-нямецку. У яго падпарадкаванні было 25 паліцэйскіх: браты Войнічы, браты Літвіны, Юхневіч і іншыя. Сваімі жорсткасцямі ў адносінах да яўрэяў яны пераўзышлі нават эсэсаўцаў. Комулька быў савецкім вязнем, немцы вызвалілі яго, і зараз ён аддана ім служыў. Ужо пасля вайны, у 1951 г. ён быў схоплены і павешаны паводле прыгавору суда ў Познані.

Бургамістрам быў прызначаны Яўген Рыгоравіч Спічонак, які хаваў яўрэйскую сям'ю Крамераў (зараз яны жывуць у ЗША). Гэтага добрага чалавека выпадкова застрэлілі партызаны, калі ён ехаў разам з камендантам Докшыц.

Як толькі ў горадзе з'явілася гестапа, у першую чаргу яно «паклапацілася» аб яўрэях, якія былі актывістамі савецкай улады. Гэта Гронам Клофт, Абрам Левітан, Зальман Цыклін і іншыя. Пасля чатырох дзён катаванняў яны былі вывезены з горада і расстраляны. Дзе іх магілы – невядома і сёння.

У жніўні 1941 г. фашысты падрыхтавалі наступную групу ахвяр. З таго часу мы сталі

атрымліваць усё больш частыя звесткі аб масавых забойствах яўрэяў у суседніх мястэчках, такіх як Беразіно, Бягомль. Чаканне жудаснага знішчэння яўрэйскага насельніцтва марудна, але настойліва ўваходзіла ў нашу свядомасць.

У верасні 1941 г. быў выдадзены загад аб стварэнні гета ў Докшыцах. Зона гета пачыналася ад саду сінагогі і ўключала ў сябе некалькі суседніх алей і частку галоўнай вуліцы імя Касцюшкі.

Усе спецыялісты, якія працавалі на немцаў, атрымалі дазвол (шайнен) займацца сваёй работай і мелі права выходзіць з гета. Мой бацька і я шылі адзенне для ўлады. Голад паціху падкрадваўся да трох тысяч душ, якія жылі ў гета. 300 г хлеба на чалавека — усё харчаванне, і тое выдавалася нерэгулярна. Каб не спецыялісты, якія маглі выходзіць з гета кожны дзень і купляць або абменьваць каштоўнасці на ежу, гета вымерла б з голаду яшчэ раней расстрэлу.

Першы пагром адбыўся ў красавіку 1942 г. Мясцовая паліцыя — адна, без дапамогі з боку немцаў — уварвалася ў гета і пачала помсціць яўрэям за гады, што былі пад савецкай уладай. На другую раніцу паліцэйскія загадалі групе моладзі выкапаць яму побач з яўрэйскімі могілкамі. Арыштаваных яўрэяў прывялі туды і расстралялі. Мы ў гета чулі водгукі шматлікіх аўтаматных чэргаў і адзіночных стрэлаў, якімі дабівалі параненых. Разам з маім дзядзькам Зальманам Фрэйманам былі забіты і многія нашы суседзі: Кацовіч, Фрыдман, Сосман, Блоч і іншыя.

Пасля гэтага пагрому многія яўрэі сталі будаваць сховішчы, каб хавацца на час наведвання немцаў.

Я працягваў працаваць, але на адпачынак я і мае родныя хаваліся ў бункеры. Пад кухняй, на глыбіні 2,7 м, была выкапана яма. Мы ўмацавалі яе тоўстымі палкамі, пад якія насыпалі шмат пяску. Уваходам у бункер быў дымаход. Выйсці з бункера можна было ў сад, праз гэты ход паступала паветра. Такім чынам многія яўрэі рыхтаваліся да другога пагрому.

Другая «акцыя» адбылася ў пачатку мая 1942 г. На світанку гета было акружана паліцыяй. Яўрэі ў большасці сваёй пахаваліся ў бункеры. Але гэта мала дапамагло. Многія сховішчы немцы пазнаходзілі і ўсіх, хто там быў, расстралялі. Нашай сям'і пашанцавала больш. У сховішчы мы адседзелі ўсю «акцыю». На наступны дзень выйшлі на вуліцы гета. Нашы вочы ўбачылі жудасную карціну. Забітыя ляжалі кучамі на вуліцах і дарогах, усё вакол было заліта крывёю, у дамах на пасцелях ляжалі забітыя людзі. На месце Песач Каплан сабіраў мазгі свайго маленькага дзіцяці, падарванага фашыстамі. Цельца маленькага больш не было, і хаваць, і плакаць бацьку не было над чым. Усе яўрэі, якіх злавілі ў бункерах або сваіх дамах, былі сабраны ў месца ля клуба. Там немцы праверылі, хто з прысутных мае дазвол на работу. Іх пакінулі, а ўсіх астатніх падвялі да агульнай магілы і расстралялі. У гэтым пагроме загінула 350 яўрэяў.

Ліквідацыя гета прыйшлася на канец мая 1942 г. Гэта здарылася ў суботу. У 4 гадзіны раніцы нас разбудзілі суседзі і паведамілі, што гета акружана, уцякаць не было куды. Як і раней, яўрэі вырашылі, што могуць ўратавацца, калі схаваюцца ў бункерах. У наш бункер схаваліся і суседзі, усяго 20 чалавек. Мы сядзелі ў яме, і нашы валасы краталіся на галовах ад жудасных крыкаў яўрэяў, якіх выганялі немцы са сваіх дамоў.

У 8 гадзін раніцы фашысты напалі і на наш след, пачалі пошукі бункера з боку печы. Праз некаторы час, які для нас казаўся самым доўгім у жыцці, пачуліся крыкі: «Жыды, выходзьце!» Ніхто не адказваў на гэтыя крыкі, і тады пачулася пагроза, што яны кінуць гранаты, калі мы не выйдзем. Заставацца ў сховішчы не было сэнсу. Я выйшаў першы. І адразу атрымаў удар палкай па шыі. Кінуўся бегчы, але быў збіты нагамі. Мяне акружылі гестапаўцы, білі, але я змог выскачыць у калідор і скочыць з балкона. Нечакана апынуўся каля групы людзей, і нас зноў акружылі гестапаўцы, потым сагналі ў адно месца, дзе ўжо знаходзілася некалькі дзесяткаў яўрэяў, і іх прыводзілі ўсё больш і больш. Некаторыя з маіх суайчыннікаў плакалі, іншыя ляжалі на зямлі, не маючы сіл падняцца. Да мяне падсеў Гдалія Левін і зашаптаў на вуха: «Уважліва паглядзі на гэтыя дрэвы і хаты, ты не ўбачыш іх больш. Усё гэта застанецца, але нас не будзе, нічога не зменіцца ў гэтым свеце, толькі не будзе нас». Я памятаю гэтыя словы да сённяшняга дня, яны адлюстраваліся ў маёй свядомасці назаўсёды. Калі нас назбіралася дзесьці чалавек 350, усіх пастроілі ў вялікую калону і пагналі да

ямы, дзе раней расстрэльвалі яўрэяў. Наша апошняя надзея на выратаванне знікала з кожным крокам на шляху да гэтай жудаснай ямы. Калі падышлі да месца расстрэлу, некаторыя з яўрэяў спрабавалі ўцякаць. Але нікому з іх не пашанцавала. Усе былі забіты. У гэты час да мяне падышоў зондэрфюрэр Гартман і адазваў убок. Ён адвёў таксама майго бацьку, маю мачыху Гіту і яе дачку Хаю. Да мяне падбегла наша суседка Сара Маркман. Яна сказала зондэрфюрэру, што яна мая жонка. Усіх нас ён павёў у горад. Як потым мы зразумелі, сваім уратаваннем павінны былі дзякаваць таму, што добра валодалі спецыяльнасцямі шаўца і краўца. А ў гэты час ля ямы пачаўся расстрэл. Яўрэям спачатку загадвалі распранацца, каб яны не сапсавалі крывёю вопратку і не змаглі схаваць каштоўнасцей, а потым забівалі.

Калі мы вярнуліся ў гета, то ўбачылі, што ўсё разбіта, разрабавана, а з розных сховішчаў, бункераў усё яшчэ працягвалі выводзіць яўрэяў. Некаторыя з няшчасных забівалі сябе і дзяцей загадзя. Адна жанчына дала дзецям атруту і прыняла сама. Я ўбачыў прыгавораных да смерці прыгожых сясцёр Шлейфер. Яны былі апрануты толькі ў вельмі кароткія начныя кашулі. Дзяўчаты ўвесь час іх абцягвалі, саромеліся. Так амаль голых іх і павялі на смерць.

Знішчэнне Докшыцкага гета працягвалася 17 дзён, паколькі многія людзі хаваліся, а іх упарта адшуквалі. Усе спецыялісты, якіх немцы пакінулі ў жывых па адным ад кожнай прафесіі, 9 дзён знаходзіліся ў адным доме, не пакідаючы яго. За гэты час нас ні разу не кармілі, вады таксама не давалі. Як мы пасля гэтага выглядалі, няцяжка ўявіць, але мы былі шчаслівыя, што засталіся жывыя.

У апошні дзень «ліквідацыі» была схоплена апошняя група яўрэяў, каля 20 чалавек. Іх таксама расстралялі. Пасля мы даведаліся, што яны пратрымаліся так доўга, бо ўцяклі з гета і хаваліся ў руінах яўрэйскіх дамоў на ўскраіне Докшыц, па шляху на Глыбокае. Іх знайшоў хлопчык-пастух і здаў у рукі паліцыі.

У чэрвені 1942 г. ў Докшыцах не засталося ніводнага яўрэя.

Докшыцы былі вызвалены ў чэрвені 1944 г. Рэшткі яўрэйскага насельніцтва горада, тыя, хто ваяваў у партызанах, паступова вярталіся. Сярод іх былі Іосіф Шапіра, я — Барыс Казінец, Я. і Б. Рэгіманы, Б.Фрыдман, сям'я Розавых і інш.

Пасля вызвалення ў горад пачалі прыходзіць лісты ад яўрэяў, якія ўцяклі ад нацыстаў. Ад яўрэяў — салдат Савецкай Арміі. Ад родных з ЗША, Ізраіля і іншых краін. Толькі адно пытанне было ў тых лістах — ці застаўся ў жывых хто-небудзь з родных? Яны прасілі знаёмых, суседзяў, добрых людзей напісаць, што здарылася з іх сем'ямі. Адказ быў адзін: «Нікога не засталося. Усе забітыя». Сам горад быў практычна поўнасцю разбураны. Было знішчана каля 90% пабудоў. Горад сам стаў могілкамі. Немагчыма было дыхаць у ім, немагчыма было жыць у ім аніводнага дня.

*Б.Казінец, Докшыцы—Тэль-Авіў.*

*Пераклад з англійскай мовы А.А.Кавалевіч і І.Б.Крукавай.*

## Дакументы сведчаць

### З ДАНЯСЕННЯ КАМІСАРА ГЛЫБОЦКАЙ АКРУГІ ГЕНЕРАЛЬНАМУ КАМІСАРУ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АКРУГІ БЕЛАРУСЬ ПРА ЛІКВІДАЦЫЮ ГЕТА Ў ДОКШЫЦАХ

**1 ліпеня 1942 г.**

29.5.42 г. было ліквідавана гета ў Докшыцах з 2653 яўрэямі. Яўрэі ўнутры гета змаглі так добра схавацца, што спатрэбіўся цэлы тыдзень, каб знайсці апошняга. У яўрэўскіх старэйшын знойдзена 15 рускіх патронаў.

Гебітскамісар (подпіс неразборлівы).

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 370, воп. 1, спр. 483, л. 15.*

*Пераклад з нямецкай мовы.*

### ПАВЕДАМЛЕННЕ КАМІСАРА БАРЫСАЎСКАЙ АКРУГІ Ў ГЕНЕРАЛЬНЫ КАМІСАРЫЯТ БЕЛАРУСІ АБ ВЫКАНАННІ РАСПАРАДЖЭННЯ ПРА ЎЛІК І РЭАЛІЗАЦЫЮ РУХОМАЙ МАЁМАСЦІ

г. Борисов

**9 августа 1942 г.**

Еврейские акции в переданных сейчас под гражданское управление районах моей области Бегомль и Плещеницы были проведены еще до установления там гражданского управления. Имеющимся движимым непромышленным еврейским имуществом, очевидно, его большей частью, распоряжались СД и вермахт. Остатки районные бургомистры реализовали в пользу районных касс. Движимое имущество, такое как мебель и предметы широкого потребления, все передано вермахту и прочим немецким учреждениям, так что из них ничего больше не осталось.

25 золотых рублей районными бургомистрами в начале декабря были переданы в германскую кредитную кассу в Минске. Какие-либо распоряжения с моей стороны в отношении конфискации и учета движимого непромышленного еврейского имущества в связи с таким положением не вызывались необходимостью.

Проводились ли конфискации и учет с помощью публичных объявлений, я не в курсе.

По поручению — Комиссар Борисовского округа

Подпись неразборчива

*«Нацистское золото» из Беларуси. Документы и материалы. Мн., 1998. С. 93.*

*Пераклад з нямецкай мовы.*

## Край, апалены вайной

Невялічкая вёсачка Вугольцы (Угольцы) на памежжы Ушацкага і Докшыцкага раёнаў. Гэта былы паўночны край Бягомльшчыны. Да 1939 г. ў гэтым месцы праходзіла дзяржаўная мяжа СССР з Польшчай.

Здаўна тут жылі беларусы па краі балота, якое цягнулася адсюль на поўдзень вузкай палоскай на сотню кіламетраў, амаль да Барысава. Бедная пясчаная глеба і дрэннае балотнае сена не давалі надзеі на заможнае жыццё. Гарох ды хлеб з асцюкамі былі вечнымі спадарожнікамі жыцця. Так бы і заставаўся гэты куточак невядомы, каб не вабіла заходніх захопнікаў магчымасць прайсці тут найкарацейшым шляхам з Польшчы і Прусіі на Лепель, Оршу, Віцебск і далей на Маскву. Тым самым шляхам яны беглі праз нейкі час і назад. Таму страшэнныя баі разгортваліся ва ўсіх войнах на стужачках сухой зямлі, сярод балот і лясоў. І кожны раз мясцовыя жыхары станавіліся ўдзельнікамі ваенных дзеянняў. Іх рабавалі, забівалі, бралі ў палон. Вельмі цяжка прыйшлося ў мінулую вайну, у час карных дзеянняў фашыстаў, асабліва з вясны 1943 г. Роўна 60 год назад тут прайшла самая вялікая і самая жорсткая карная аперацыя «Котбус» супраць партызан і насельніцтва. У ёй карнікі выкарыстоўвалі артылерыю, танкі і нават авіяцыю. Баі доўжыліся бесперапынна больш за сорак дзён. За мужнасць, у тым ліку і за гэтыя дні, партызанскім камандзірам Ціткову, Манковічу, Лабанку, Дуброўскаму і Мачульскаму прысвоены званні Герояў Савецкага Саюза.

Асноўны удар прыйшоўся па зоне, якую кантралявалі партызанскія брыгады «Жалязняк» і «Дубава» (У.Лабанка), штабы якіх знаходзіліся побач з Вугольцамі, каля возера Маскавіца. Вёска (больш за 40 гаспадарак) была цалкам спалена. Яе назва шмат разоў згадваецца ў нямецкіх і партызанскіх штабных дакументах таго часу, у мемуарах сведак, як адно з месцаў найбольш жорсткіх баёў. Жыхары ў асноўным паспелі сысці ў балота, каб не быць знішчанымі на месцы. Але немцы пачалі абстрэльваць і бамбіць прылеглыя балоты і лясы, прачэсваць іх з сабакамі. Карнікі, аснову якіх складалі эсэсаўцы, вымусілі партызан кінуць свае базы і адысці кіламетраў на 50 у бок Домжарыц. Жыхары нашай і суседніх вёсак засталіся сам-насам з раз'юшаным ворагам. Ні для каго не было сакрэтам, што партызан карміла, апранала і саграВала хатнім цяплом мясцовае насельніцтва, аддаючы ім апошняе: збожжа, скаціну, сена, цёплую вопратку. Усё размяркоўвалася і аддавалася партызанам па разнарадках, устаноўленых кіраўнікамі партызанскіх бры-

гад. У іх у той час не было іншага выйсця. Але трэба мець на ўвазе і тое, што партызаны мелі ў вёсках шмат радні і сваякоў. Па сутнасці, гэта была адна, непадзельная армія, якая супрацьстаяла захопнікам. Ведалі пра гэта і немцы. Таму да насельніцтва партызанскіх вёсак карнікі ставіліся, як да партызан: забівалі, палілі жывымі, кідалі ў турмы і лагеры, з якіх накіроўвалі далей у Германію, Польшчу і Аўстрыю. Жыхары вёсак, дапамагаючы партызанам, ведалі ступень рызыкі для сябе і сваіх дзяцей. Але гэта былі патрыёты, і яны не маглі зрабіць інакш. Здраднікаў у партызанскіх вёсках амаль не было.

Жорсткасць карнікаў у час «Котбуса» ўвайшла ў гісторыю і ў дакументы Нюрнбергскага працэсу як прыклад самага масавага на тэрыторыі Беларусі знішчэння насельніцтва ў час карнай акцыі супраць партызан: толькі па папярэдніх звестках саміх жа немцаў імі было забіта і закатавана 10 тыс. грамадзян і 6 тыс. накіравана ў рабства. Пры гэтым у баях у якасці трафеяў было ўзята ўсяго 400 адзінак зброі партызан. Па дакументах брыгады «Жалязняк», у яе зоне было знішчана 7 тыс. жыхароў і 2 тыс. гаспадарак спалена. Толькі дзяцей за гады вайны тут было забіта і спалена 1300 чалавек.

Не стала выключэннем і наша вёска Вугольцы, у якую ў снежні 1941 г. перабралася з Лепеля разам са мной мая маці. Нас таксама арыштавалі. Былі арыштаваны мае дзядулі і бабулі, цёткі і дзядзькі. Са 120 жыхароў Вугольцаў 52 чалавекі ва ўзросце ад 2 да 50 гадоў былі накіраваны ў рабства. Я памятаю свой палон. Нас пагналі ў невядомасць пехатой, падганяючы зброяй. Кожны нямецкі пост, кулямёты і свежавыкапаная зямля ўспрымаліся дарослымі як месца блізкай расправы. Над калонай стаяў лямант. Стаміліся і плакалі дзеці. Я і цяпер бачу таго немца, які трос пісталетам перад тварам маёй маці, якая дапамагала мне ісці. Я не магу забыць рыжыя рукі карніка, які здзёр з мяне кляёнку, якой маці мяне закрывала ад дажджу. Так прайшлі больш за 10 км, пакуль нас не прыгналі ў Кадлубішча. І зноў крык і слёзы. Нас сталі заганяць у хлеў. Усе ўжо ведалі, што хлявы ў той час часта станавіліся брацкімі магіламі. Але раніцай нас пасадзілі на машыны і прывезлі ў ваенны гарадок на ўскраіне Лепеля. Тут кінулі каго ў былыя казармы, каго ў баракі, а нехта застаўся пад адкрытым небам. Калі і ёсць на свеце пекла, то часціна яго была там, у гарадку, дзе мясціліся турма для сем'яў партызан і канцэнтрацыйны лагер пры ёй. Вязняў вадзілі на допыты, стралялі, вешалі, маладзейшых накіроўвалі ў Віцебск і Оршу, а потым у Германію. Тут пачала свой шлях у бяссмерце маці П.У.Броўкі — Алена Сцяпанаўна, якая гераічна загінула потым у Асвенціме. Яна была схоплена ў час «Котбусу» ў тых самых балотах, у якіх былі і мы.

Вязняў амаль не кармілі. Кавалачак хлеба або нейкая бурда, звараная з кішкамі, разам з тым, што было ў іх. Людзі пухлі ад голаду. Вошы заядалі, асабліва дзяцей з каростай. Многія хварэлі на тыф і паміралі. Не ўсе вярнуліся дадому. У Лепелі адразу пасля вайны знойдзены пахаванні больш як 5 тыс. закатаваных і расстраляных, па раёне загінула каля 1500 чалавек. У Лепельскай зямлі засталіся ляжаць многія нашы землякі.

Мой дзядзька Хведар і чацвёра яго сяброў-юнакоў (па 17—18 гадоў) зрабілі няўдалую спробу збегчы з палону і былі забіты. Не вынесла страты апошняга сына (двое былі дзесьці за фронтам) і неўзабаве памерла мая бабуля. Захварэў і памёр дзед. Пасля перажытага цяжка хварэла маці. Я не памятаю яе здаровай. І так у кожнай сям'і.

Пасля вайны дзяржава дапамагала аднаўляць страчанае і знішчанае. Але ўлады паглядалі скоса на тых, хто прайшоў блакады і палон: ім нават не дазвалялася працаваць на калгаснай ферме. Папялішчы, бедната і прыніжанасць палонам прывялі да таго, што маладыя, асабліва дзяўчаты, усё часцей сталі пагладаць у бок гарадоў, дзе і ўмовы жыцця былі лепшыя, і заробкі больш прывабныя, ды і іх мінулым ніхто асабліва не цікавіўся. І пацягнуліся ў гарады самыя працаздольныя. Праз нейкі час вёскі сталі імкліва пусцець. Так сталася і з Вугольцамі. Сёння тут дажываюць век 10 жыхароў, усім за 80 гадоў. А якія чулыя і працавітыя тут жылі людзі, не зламаныя фашысцкімі турмамі і канцлагерамі. Напрыклад, Вольга Георгіеўна Кажамячонак, якую памятаюць усе, хто вучыўся ў яе ў пачатковай школе ў першыя пасляваенныя гады, усе яе вучні з Вугольцаў і Чарніц. Альбо Вольга Мікалаеўна Міхаль, якая перажыла жахі лепельскай турмы, а потым канцлагераў у Оршы і Дахаў, а пасля, вярнуўшыся, шмат гадоў працавала калгасным брыгадзірам у Вугольцах і была ўзнагароджана ордэ-



І.В.Жаваранкаў.



Р.Я.Лазабееў.



К.А.Аўтушка.

нам Працоўнага Чырвонага Сцяга за тое, што на нашых небагатых глебах збірала ўраджаі збожжавых да 25 і болей цэнтнераў з гектара.

У думках я значна часцей бываю на Вугольцах, чым наяву. Калі прыязджаю туды, на могілках знаходжу значна больш новых знаёмых імёнаў і фотакартак, чым сустракаю на вёсцы дарагіх мне людзей. Цяжка думаць і пісаць пра гэта. Але трэба. Трэба ведаць пра гераізм нашых вяскоўцаў і пра тое, да чаго вядзе вайна. Нават у самых, здавалася б, глухіх закутках. Трэба таксама ведаць, што і тут з восені 1942 г. быў створаны і дзейнічаў «другі фронт» з партызан і мясцовых жыхароў. Мала хто ведае, што менавіта ў нашым краі была паралізавана 3-я танкавая армія немцаў, у пачатку вайны нацэленая толькі на Маскву, але паступова вымушаная ўцягнуцца ў барацьбу з партызанамі і мясцовым насельніцтвам. Таму, відаць, і не здолела яна супрацьстаяць Чырвонай Арміі ў 1944 г. Яе салдаты яшчэ з месяц блукалі па балотах і лясах пасля нашага вызвалення ў чэрвені 1944 г. Тут гінула дапамога вермахта, якая ішла з Германіі на Усходні фронт. Таму ў перамогах на Волзе і пад Курскам, у Беларусі і ў Берліне ёсць кропля мужнасці нашых продкаў, якія не скарыліся, аддалі сваё жыццё, сваё здароўе за свабоду, за нашу будучыню.

*У.І.Майсеенка,*
*доктар тэхнічных навук,*
*былы малалетні вязень фашызму.*

## Падпольны і партызанскі рух

У цяжкія дні акупацыі Бягомльскага і Докшыцкага раёнаў арганізацыю партызанскага руху ўзялі на сябе савецкія ваеннаслужачыя, якія ў выніку розных абставін апынуліся тут пасля адступлення Чырвонай Арміі, і мясцовыя партыйныя і камсамольскія арганізацыі.

У ліку пачынальнікаў партызанскай барацьбы на Бягомльшчыне былі групы воінаўакружэнцаў, якія дзейнічалі тут са жніўня 1941 г. Іх узначальвалі І.В.Жаваранкаў і С.П.Каралькоў. У гэты ж час аформілася і група Р.Я.Лазабеева.

У снежні 1941 г. з груп М.Г.Мармулёва і М.Х.Балана быў арганізаваны атрад, у склад якога таксама ўваходзілі ваеннаслужачыя-акружэнцы. Ён дзейнічаў у Бягомльскім раёне да ліпеня 1942 г.

Зімой 1941—42 гг. у Бягомльскім раёне дзейнічаў групамі арганізаваны ў 1941 г. ў Лагойскім раёне па ініцыятыве камуністаў і ваеннаслужачых, што трапілі ў акружэнне, атрад «Рамана» (камандзір Р.А.Дзякаў, камісар С.С.Манковіч). 17.3.1942 г. партызаны разграмілі валасную ўправу ў в. Асецішча, 28 сакавіка разагналі паліцэйскі гарнізон і валасную ўправу ў в. Домжарыцы. 17.4.1942 г. атрад быў афіцыйна зацверджаны і на яго аснове восенню 1942 г. створана буйная партызанская брыгада «Жалязняк». 19.9.1942 г. яе байцы знішчылі масты цераз р. Поня каля вёсак Гліннае, Нябышына і Юхнаўка, 17 лістапада 2-і атрад у раёне в. П'яны Лес у ходзе бою з акупантамі знішчыў 4 немцаў і 8 паліцэйскіх. З боку партызан страт не было.



Група камандзіраў і партызан атрада Дзякава—Манковіча. 1942 г.

Вясной 1942 г. развіццё партызанскага руху актывізавалася. Ішлі ў лес і пачыналі ўзброеную барацьбу падпольныя групы. Невялікія і разрозненыя, яны аб'ядноўваліся, раслі колькасна. У выніку ў Бягомльскім раёне ўзнікаюць новыя атрады. У красавіку 1942 г. з жыхароў вёсак Замошша (група Я.Я.Жукоўскага) і Ліпкі (група К.К.Бадзюлі) быў створаны атрад імя В.І.Чапаева. Камандзірам яго стаў Жукоўскі, камісарам — Бадзюля, начальнікам штаба — П.І.Будзько. У маі 1942 г. патрыёты в. Саўскі Бор на чале з К.А.Аўтушкам арганізавалі атрад імя Ф.П.Юрчанкі, да якога далучылася група ваеннаслужачых. Камандзірам атрада быў прызначаны А.І.Драитусаў, камісарам — Юрчанка, начальнікам штаба — У.Я.Яроцкі. Ініцыятар стварэння гэтага атрада К.А.Аўтушка загінуў у баі з карнікамі. Атрад «Камсамол» арганізаваўся ў красавіку 1942 г. з ваеннаслужачых і былых ваеннапалонных, што ўцяклі з канцлагераў (камандзір М.М.Джагараў, камісар М.Р.Кузняцоў, начальнік штаба П.С.Вараб'ёў). У гэты ж час узнік атрад пад камандаваннем А.С.Бычкова. А з-за лініі фронту ў Домжарыцкія лясы прыйшла разведвальна-дыверсійная група ў складзе 67 чалавек на чале з І.М.Кузіным. Свае дзеянні яна пачала ў красавіку 1942 г.

Да сярэдзіны лета атрады набылі баявы вопыт, папоўніліся людзьмі і пачалі актыўна дзейнічаць супраць акупантаў. 7.6.1942 г. атрад «Камсамол» на шашы Бягомль—Плешчаніцы каля в. Замасточча ў час засады знішчыў 5 і параніў 2 фашыстаў.

У чэрвені 1942 г. гэтыя партызанскія атрады агульнай колькасцю 294 чалавекі накіраваліся за лінію фронту. 16 жніўня яны выйшлі ў раён «Суражскіх варот», дзе атрымалі загад вярнуцца на месца сваіх ранейшых баявых дзеянняў. Але ні адзін з іх назад не пайшоў. Атрады былі аб'яднаны ў 1-ю Мінскую партызанскую брыгаду і накіраваны ў Чэрвеньскі раён, а атрад «Буравеснік» — у Барысаўскі раён.

У канцы ліпеня — пачатку жніўня 1942 г. ў Докшыцкі раён ЦК КП(б)Б прыслаў «арганізатарскія групы» М.З.Умінскага (14 чалавек) і П.Ф.Рудава (13 чалавек) з мэтай актывізацыі баявых дзеянняў мясцовых партызан. Адразу пасля прыбыцця абедзве групы прыступілі да наладжвання засад і дыверсій на дарогах. У жніўні—верасні 1942 г. атрад Умінскага зрабіў 4 засады на дарозе Беразіно—Докшыцы (знішчаны 4 аўтамашыны і забіта 70 немцаў) і ўступіў у адкрыты бой з докшыцкай паліцыяй, у выніку чаго вораг страціў 6 чалавек забітымі і 4 параненымі. Атрад Рудава ў гэты час каля в. Беразіно падбіў 2 аўтамашыны і знішчыў 28 гітлераўцаў.

У сярэдзіне 1942 г. з брыгады «За Савецкую Беларусь» Віцебскай вобласці ў Док-



Група партызан брыгады «Жалязняк». 1942 г.

шыцкі раён быў накіраваны атрад імя А.Я.Пархоменкі на чале з А.Д.Мядзведзевым. 9.10.1942 г. ён аб'яднаўся з групамі Рудава і Умінскага ў 1-ы батальён, камандзірам якога застаўся Мядзведзеў. Камісарам спачатку прызначаны Ф.Я.Воранаў, а пазней — Ц.М.Бондараў, начальнікам штаба — І.А.Цяста.

Яшчэ адна група колькасцю 18 чалавек (камандзір Д.Л.Місуноў) была прыслана з-за лініі фронту ЦК КП(б)Б у Докшыцкі раён летам 1942 г. Тут яна вырасла ў атрад (каля 85 чалавек), камандзірам якога застаўся Місуноў. Камісарам быў прызначаны Ф.К.Лайкоў, начальнікам штаба — В.І.Бурачэўскі.

Са жніўня 1942 г. пачалі дзейнічаць Бягомльскія падпольныя райкомы КП(б)Б (сакратары С.С.Манковіч, Ф.І.Дзернушкоў) і ЛКСМБ (сакратары Дзернушкоў, А.Ф.Фрол). Першая ж падпольная камсамольская арганізацыя ў складзе 10 чалавек узнікла ў в. Домжарыцы (сакратар Т.Х.Вашкевіч). Падпольшчыкі падрыхтавалі для пераходу ў партызаны 17 чалавек моладзі (з іх 6 са зброяй). На пачатак красавіка 1943 г. ў раёне было створана 28 падпольных арганізацый і груп, якія налічвалі 117 членаў. Да студзеня 1943 г. патрыёты Бягомльшчыны падрыхтавалі да ўступлення ў рады народных мсціўцаў 950 чалавек.

З кастрычніка 1942 г. прыступіў да работы Докшыцкі падпольны райком ЛКСМБ (сакратары В.Т.Бацечка, М.У.Васілевіч, У.С.Свірыд, І.М.Лабецкі). Докшыцкі падпольны райком КП(б)Б пачаў дзейнічаць са жніўня 1943 г. Яго ўзначальваў спачатку М.З.Умінскі, потым — М.Т.Гарбаценкаў. У раёне барацьбу з ворагам вялі 17 падпольных арганізацый і груп.

З першых дзён акупацыі на тэрыторыі Бягомльскага і Докшыцкага раёнаў разгарнулася супраціўленне захопнікам. Актыўным удзельнікам яго была моладзь і камсамольцы. На тэрыторыі Докшыцкай зоны барацьбу супраць акупацыйнага рэжыму распачалі камсамольскія арганізацыі ў вёсках Шантары (кіраўнік А.А.Кухта), Вецяры (А.І.Навіцкая), Слабада (Ю.З.Таляронак), Свіное (М.І.Гушчык), Таргуны (І.І.Вайцяховіч), Казлы (В.Лаўцэвіч), Несцераўшчына (М.У.Васілевіч), Тумілавічы (І.С.Шэка), на ст. Крулеўшчына (А.А.Юнцэвіч). Спачатку яны дзейнічалі самастойна, а з кастрычніка 1942 г. — пад кіраўніцтвам Докшыцкага падпольнага РК ЛКСМБ. Прыступіўшы да непасрэднай работы, райком стварыў у раёне 18 камсамольскіх і 13 камсамольска-маладзёжных арганізацый і груп у 19 вёсках з агульнай колькасцю 58 членаў у іх.



У.Г.Ганчар.



К.Дз.Патапейка.



М.А.Печань.



У.А.Печань.

На тэрыторыі ўсходняй часткі Докшыччыны ў самім г.п. Бягомль падпольную камсамольскую арганізацыю стварыў і ўзначаліў настаўнік Бягомльскай СШ У.В.Таракан. Дзейнічаў ён пад непасрэдным кіраўніцтвам аднаго са стваральнікаў падпольнай партыйнай арганізацыі Я.А.Шаўцова. Бягомльскімі камсамольцамі-падпольшчыкамі з'яўляліся У.А. і М.А.Печань, У.Г.Ганчар, Ф.А.Буланда, С.Ісакаў, Г.Радкевіч, І.Міхайлаў, Г.Юхнавец, К.Дз.Патапейка, С.С.Хацкевіч, Н.І.Бычынская і інш.

У былой Асаўской воласці згуртаваў вакол сябе моладзь камуніст, старшыня Мсціжскага сельсавета У.В.Скакун. У яго «неаформленую» падпольную арганізацыю ўваходзілі А.А.Бусла, М.Я. і У.Л.Шылы, І.М.Гунько, І.М.Ціханенка, І., М. і М.Д.Астроўкі, З.Р.Бабаніна.

Падпольная група ў Глінскім сельсавеце складалася з дзяўчат-камсамолак А.А.Ніканавай, Г.Л.Навіцкай, М.В.Дземідовіч і М.А.Гаўрыловіч. Яны праводзілі работу па распрапагандаванні варожых салдат і афіцэраў.

У в. Нябышына групу камсамольцаў-падпольшчыкаў узначальваў былы сакратар Вітуніцкага сельсавета А.Ф.Фрол, членамі яе былі старшы лейтэнант, акружэнец М.А.Кузьміч, вясковыя камсамольцы Г.Ф.Фрол (Макорта) і М.М.Кукуля.

Домражыцкая камсамольская арганізацыя складалася з акружэнцаў салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі, а таксама мясцовай моладзі. Кіраўніком яе быў сакратар Бягомльскага падпольнага РК КП(б) С.С.Манковіч.

Ключавой аперацыяй 1942 г. стала вызваленне 19 снежня брыгадай «Жалязняк» Бягомля і Бягомльскага раёна. З гэтага часу на-



С.С.Хацкевіч.



Я.А.Шаўцоў.

родныя мсціўцы ўстанавілі кантроль над усёй тэрыторыяй Бягомльскага і паўночнай часткай Барысаўскага раёнаў (агульная плошча 2250 км$^2$), а да канца 1943 г. вызвалілі яшчэ каля 6 тыс. км$^2$ тэрыторыі шэрагу сумежных раёнаў. У выніку партызаны сталі кантраляваць на поўначы Мінскай вобласці вялікую зону, дзе была адноўлена савецкая ўлада. Дзякуючы партызанскаму аэрадрому ў Бягомлі (дзейнічаў з сакавіка 1943) з Вялікай зямлёй была наладжана рэгулярная і трывалая сувязь.

Летам 1943 г. камандаванне брыгады «Жалязняк» і Бягомльскі падпольны РК КП(б)Б, дзякуючы мэтанакіраванай агітацыі, ажыццявілі смелую аперацыю па распрапагандаванні і пераходзе на бок партызан буйнога непрыяцельскага фарміравання — 1-й Рускай нацыянальнай брыгады пад камандаваннем У.У.Гіль-Радзіёнава. Яна была перайменавана ў 1-ю Антыфашысцкую партызанскую




Мемарыяльная дошка на будынку Бягомльскай СШ №1 на ўшанаванне памяці бягомльскіх падпольшчыкаў.




Мемарыяльная дошка падпольшчыкам в. Гліннае.

брыгаду, першай аперацыяй якой стаў разгром варожага гарнізона ў Крулеўшчыне.

Акрамя брыгады «Жалязняк» у Бягомльскім раёне часткова дзейнічалі таксама партызанскія брыгады М.М.Нікіціна і «Дзядзькі Колі», створаныя летам 1942 г.

На тэрыторыі Докшыцкага раёна дыслацыраваліся і разгортвалі баявыя дзеянні брыгады імя К.К.Ракасоўскага, імя У.І.Леніна, імя Л.М.Даватара (створаны ў 1942) і імя ЦК КП(б)Б (створана ў 1943). Тут таксама пачынаў барацьбу супраць ворага асобны партызанскі атрад «Баявы». Ён быў сфарміраваны ў кастрычніку 1941 г. са спартсменаў-добраахвотнікаў для дыверсійна-разведвальнай работы.

Восенню 1943 г. асабліва жорсткія баі вяла брыгада імя ЦК КП(б)Б з фашысцкімі гарнізонамі, раскватараванымі ў Докшыцах, Таргунах і Камайску, а таксама са спецыяльнымі нямецкімі карнымі атрадамі, якія знаходзіліся ў раёне. Асноўныя баявыя аперацыі разгортваліся ў раёне вёсак Сценка, Дзедзіна, Тумілавічы, Шалашы, Стараселле. Сустрэўшы рашучы адпор народных мсціўцаў, фашысты ўводзілі ў дзеянне танкі, авіяцыю і артылерыю.

1 верасня разгарэўся бой на захад ад в. Сценка. Праціўнік накіраваў сюды атрад колькасцю больш за 80 чалавек. На ўзбраенні яго меліся 3 батальённыя мінамёты, 4 станковыя і 9 ручных кулямётаў, 2 бронемашыны, 3 танкеткі. Упарты бой працягваўся з 7 да 17 гадзін. Было забіта 7 і паранена 11 гітлераўцаў. Партызаны страцілі 1 чалавека забітым. Да зыходу дня непрыяцель адступіў у гарнізон у в. Таргуны.

9.9.1943 г. вораг пад прыкрыццём ранішняга туману калонай да 200 чалавек падышоў да вышыні 200,6, якая знаходзілася за 0,5 км ад в. Дзедзіна. Другой калонай (80 чалавек) фашысты наступалі на в. Стараселле. Аднак тут яны былі сустрэты кулямётным агнём баявой аховы 5-га атрада. Каля в. Дзедзіна адпор ворагу далі кулямётчыкі 1-га атрада. У ходзе бою праціўнік страціў 2 чалавек забітымі і адышоў у свае гарнізоны ў Тарганы і Камайск.

## Партызанская брыгада «Жалязняк»

Створана ў верасні 1942 г.

У снежні 1941 г. ў Лагойскім раёне па ініцыятыве камуністаў і ваеннаслужачых, якія трапілі ў акружэнне, арганізаваны атрад «Рамана». Зімой 1941/42 г. дзейнічаў групамі ў Бягомльскім раёне, 17.4.1942 г. быў адноўлены.

Камандзір атрада — Дзякаў Раман Апалонавіч

Камісар — Манковіч Сцяпан Сцяпанавіч

3.9.1942 г. загадам ваенна-аператыўнага цэнтра Барысаўскай зоны атрад «Рамана» разгорнуты ў брыгаду пад той жа назвай у складзе 2 атрадаў. Пазней арганізаваны атра-



Група аўтаматчыкаў брыгады «Жалязняк». Май 1943 г.



У час сустрэчы партызан Докшыцкага раёна ў г.п. Бягомль (3-і справа Герой Савецкага Саюза І.П.Шткоў). 18.12.1977 г.



Камандны склад брыгады «Жалязняк». Ліпень 1944 г.

ды 3-і, 4-ы (у верасні 1943 на аснове загада БШПР ад 4.8.1943 вылучаны з яе і перадыслацыраваны ў Свірскі раён Вілейскай вобласці, дзе праводзіў баявыя аперацыі самастойна), 5, 6, 7, 8, 9 і 10-ы вучэбна-рэзервовы. У кастрычніку 1942 г. брыгада названа імем героя грамадзянскай вайны Анатоля Жалязнякова («Жалязняк»).

Камандзіру брыгады І.П.Ціткову і камісару С.С.Манковічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Лагойскім і Бягомльскім раёнах.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 28.6.1944 г. ў складзе 8 атрадаў і роты аўтаматчыкаў агульнай колькасцю 2137 партызан.

Камандзіры брыгады: Дзякаў Раман Апалонавіч (верасень—кастрычнік 1942), Ціткоў Іван Піліпавіч (кастрычнік 1942 — чэрвень 1944); камісары: Манковіч Сцяпан Сцяпанавіч (верасень 1942 — снежань 1943), Дзернушкоў Феафан Ігнатавіч (снежань 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба: Бірукоў Леанід Паўлавіч (кастрычнік 1942 — чэрвень 1944).

## 1-ы атрад

Арганізаваны ў верасні 1942 г.

На дзень з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 374 партызаны.

Камандзіры атрада: Лунчаў Мікалай Цімафеевіч (верасень 1942 — ліпень 1943), Ахоненка Рыгор Емяльянавіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944); камісар — Барздыка Спірыдон Вікенцьевіч (верасень 1942 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Ахоненка Рыгор Емяльянавіч (верасень 1942 — ліпень 1943), Комар Дзмітрый Маркавіч (ліпень—жнівень 1943), Няфёдаў Аляксандр Сямёнавіч (верасень 1943 — сакавік 1944, загінуў), Табачнікаў Сяргей Міхайлавіч (сакавік — чэрвень 1944).

## 2-і атрад

Створаны ў верасні 1942 г.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 367 партызан.



Р.Е.Ахоненка.



С.В.Барздыка.



С.Дз.Гунін.



С.Я.Мальчык.



П.П.Юрчанка.



М.Л.Афанасьеў.



Партызаны 2-га атрада вядуць бой з карнікамі каля в. Грабяні. 1943 г.

Камандзір атрада — Гунін Сямён Дзмітрыевіч (верасень 1942 — чэрвень 1944); камісар — Мальчык Сцяпан Якаўлевіч (кастрычнік 1942 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Юрчанка Пётр Паўлавіч (студзень 1943 — чэрвень 1944), Балашоў Мікалай Мацвеевіч (чэрвень 1944).


Р.М.Кабачэнка.


Г.В.Шараеў.


І.Я.Герасімёнак.


П.Р.Піваварaў.

## 3-і атрад

Сфарміраваны ў канцы кастрычніка 1942 г. на базе партызан, вылучаных атрадам «Рамана», дыверсійнай групы Г.В.Шараева (15 чал.), якая прыбыла з савецкага тылу па заданні ЦК КП(б)Б, і групы М.Л.Афанасьева (46 чал.) з атрада «Буравеснік».

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 350 партызан.

Камандзіры атрада: Гонікман Ісак Хаімавіч (кастрычнік — лістапад 1942), Афанасьеў Міхаіл Лявонцьевіч (лістапад 1942 — май 1944); камісары: Шараеў Герасім Васілевіч (кастрычнік 1942 — чэрвень 1943), Машанаў Аляксей Мікалаевіч (чэрвень 1943 — сакавік 1944), Кабачэнка Рыгор Мінавіч (красавік — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Балабанаў Мікалай Сяргеевіч (кастрычнік—лістапад 1942), Табачнікаў Сяргей Міхайлавіч (лістапад 1942 — жнівень 1943), Кажэўнікаў Іосіф Сцяпанавіч (красавік — чэрвень 1944), Герасімёнак Ілья Ягоравіч (чэрвень 1944).

## Асобны атрад С.Р.Суслава

Арганізаваны ў снежні 1942 г. ў складзе брыгады «Жалязняк» Мінскай вобласці як 4-ы атрад. У верасні 1943 г. на аснове загада БШПД ад 4.8.1943 г. вылучаны з яе і перадыслацыраваны ў Свірскі раён Вілейскай вобласці, дзе праводзіў баявыя аперацыі самастойна.

Атрад дзейнічаў у Бягомльскім раёне Мінскай і Свірскім — Вілейскай абласцей.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі, 4.7.1944 г., налічваў 228 партызан. З іх: мужчын — 213, жанчын — 15, беларусаў —140, рускіх — 51, украінцаў — 5, інш. нацыянальнасцей — 32, членаў ВКП(б) — 10, кандыдатаў — 10, членаў ВЛКСМ — 49, беспартыйных — 159.

Камандзіры атрада: Піваварaў Пракоп Рыгоравіч (снежань 1942 — чэрвень 1943), Каўцюх Уладзімір Паўлавіч (чэрвень — жнівень 1943), Суслаў Сямён Рыгоравіч (жнівень 1943 — ліпень 1944); камісары: Кліманскі Іван Парамонавіч (снежань 1942 — жнівень 1943), Ларыёнаў Фёдар Іванавіч (жнівень 1943 — сакавік 1944), Мартыненка Даніла Іванавіч (сакавік — ліпень 1944); начальнікі штаба: Склярэнка Аляксей Васілевіч (снежань 1942 — ?), Карнееў (? — чэрвень 1943), Хахлоў Фёдар Цімафеевіч (чэрвень 1943 — ліпень 1944).

## 5-ы атрад

Створаны ў студзені 1943 г. як артбатарэя, якая ў чэрвені 1943 г. пераўтворана ў 5-ы атрад.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 455 партызан.



А.М.Касцяневіч.



П.С.Руткоўскі.



І.М.Карнееў.



П.І.Раманенка.



Р.А.Карніец.



І.П.Бабенка.

Камандзір атрада — Карніец Рыгор Анатолевіч (люты 1943 — чэрвень 1944); камісары: Руткоўскі Пётр Сямёнавіч (студзень — чэрвень 1943), Калашнікаў Аляксей Гаўрылавіч (чэрвень — лістапад 1943), Касцяневіч Андрэй Мікалаевіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Карнееў Іван Міхайлавіч (сакавік — верасень 1943), Балашоў Мікалай Мацвеевіч (верасень—кастрычнік 1943), Раманенка Палікарп Іванавіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944).

## 6-ы атрад

Арганізаваны 23.4.1943 г. на базе камендацкага ўзвода брыгады. З 28.6.1943 г. лічыўся як 6-ы атрад.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 258 партызан.

Камандзіры атрада: Цюрын Аляксандр Сямёнавіч (красавік—жнівень 1943), Балашоў Мікалай Мацвеевіч (кастрычнік 1943 — май 1944), Елісееў Пётр Яфімавіч (чэрвень 1944); камісары: Кулакоў Анатоль Сцяпанавіч (красавік—ліпень 1943), Шараеў Герасім Васілевіч (ліпень 1943 — сакавік 1944), Машанаў Аляксей Мікалаевіч (сакавік — май 1944); начальнік штаба — Хінаў Павел Аляксандравіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944).

## 7-ы атрад

Створаны ў маі 1942 г. ў паўднёва-заходняй частцы Вілейскай вобласці з групы ваеннаслужачых, якія не выйшлі з акружэння. Са жніўня 1942 г. дзейнічаў у Валожынскім і Івянецкім раёнах Баранавіцкай вобласці ў складзе Асобага злучэння партызанскіх атрадаў. У маі 1943 г. ўліўся ў брыгаду «Жалязняк». У жніўні 1943 г. ў яго склад уключаны ўзвод аўтаматчыкаў і атрад пераўтвораны ў разведвальны. 16 снежня аб'яднаны з вучэбна-рэзервовым атрадам (у канцы мая 1944 пераўтвораны ў роту аўтаматчыкаў; камандзір — Лапянкоў Павел Іванавіч).



Браты Сушко вядуць агонь з процітанкавага ружжа па самалётах.



І.М.Двужыльны.



М.С.Сялюк.



А.С.Бабарыкін.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі рота налічвала 137 партызан.

Камандзіры атрада: Браеў Васіль Захаравіч (май 1942 — жнівень 1943), Сямёнаў Іван Кузьміч (лістапад — снежань 1943); камісар — Кабачэнка Рыгор Мінавіч (жнівень — снежань 1943); начальнікі штаба: Двужыльны Іван Макаравіч (жнівень—снежань 1943), Бабенка Іван Паўлавіч, Гаркуша Аляксандр Піліпавіч.

## 8-ы атрад

Сфарміраваны ў лістападзе 1943 г. з мясцовага насельніцтва для аховы брыгаднага шпіталя.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 67 партызан.

Камандзір атрада — Клякін Пётр Сямёнавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944); камісар — Сялюк Мікалай Сямёнавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба — Істомін Андрэй Дзмітрыевіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

## 9-ы атрад

Дзейнічаў у Лагойскім раёне да верасня 1943 г. самастойна, затым — у складзе брыгады «Жалязняк».

Камандзір атрада — Сямёнаў Іван Кузьміч; камісар — Чайко Іван Максімавіч; начальнік штаба — Кажэўнікаў Іосіф Сцяпанавіч.

## 10-ы вучэбна-рэзервовы атрад

Арганізаваны 16.12.1943 г. з рэзерву брыгады і роты аўтаматчыкаў 7-га атрада. Колькасны склад на дзень арганізацыі — 300 чалавек.

Атрад расфарміраваны 21.5.1944 г.

Камандзір атрада — Бабарыкін Аляксандр Сцяпанавіч (снежань 1943); камісар — Кабачэнка Рыгор Мінавіч (снежань 1943); начальнік штаба — Гаркуша Аляксандр Піліпавіч (снежань 1943).



Партызаны брыгады «Жалязняк» вядуць бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на чыгунцы.



Брыгада «Жалязняк» на маршы.

Партызаны ў снежні 1942 г. разграмілі варожы гарнізон у Бягомлі, Бягомльскі раён стаў партызанскай зонай. Нападалі на варожы гарнізон у Докшыцах, разграмілі чыгуначную станцыю Параф'янава. У сакавіку 1943 г. напалі на гарнізоны ў в. Даўгінава Крывіцкага і в. Юхнаўка Бягомльскага раёнаў. У маі—чэрвені 1943 г. вялі баі супраць карнікаў, якія праводзілі аперацыю «Котбус». 12.12.1942 г. знішчылі 2 масты цераз Бярэзіну. У «рэйкавай вайне» падарвалі больш за 5,5 тыс. рэек, 5 чыгуначных мастоў. У жніўні 1943 г. ўдзельнічалі ў Докшыцка-Крулеўшчынскай аперацыі па разгроме гітлераўцаў у г. Докшыцы і на чыгуначнай станцыі Крулеўшчына. У чэрвені 1944 г. ўтрымлівалі да падыходу Чырвонай Арміі пераправу цераз Бярэзіну, пабудавалі 2 масты.

## Дакументы сведчаць

### З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б І.Ф.КЛІМАВА САКРАТАРУ ЦК КП(б)Б П.К.ПАНАМАРЭНКУ «АБ РАБОЦЕ МІНСКАГА АБКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ»

**15 верасня 1942 г.**

Обком КП(б)Б начал свою работу в двадцатых числах июля с/года. За отчетный период проделана следующая работа:

1. В области партизанского движения.

За истекший период удалось установить, пока еще не в полном объеме, наличие партизанских отрядов, действующих в Бегомльском, Плещеницком, Холопеничском, Логойском и Заславльском районах Минской области, а также на границе Плещеницкого и Заславльского районов с Вилейской областью. На этой территории по данным разведки действуют следующие партизанские отряды:

1. Партизанский отряд Дьякова Романа Аполлоновича — лейтенанта артиллерии. Приписник-окруженец, родом из Архангельской области. Комиссар Манкович С.С. — секретарь Бегомльского РК КП(б)Б. Отряд существует с марта месяца 1942 г. В отряде 64 человека, из них 14 членов и кандидатов ВКП(б), 13 комсомольцев. Созданы партийная и комсомольская организации. На вооружении — 3 ручных пулемета, 4 автомата и 38 винтовок. Район деятельности отряда: Бегомльский район. Базы — деревни Переходцы, Постережье Домжерицкого сельсовета.

*Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 1п, воп. 1а, спр. 212, л. 2—3.*

### СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМІСАРА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ЖАЛЯЗНЯК» МІНСКАЙ ВОБЛ. С.С.МАНКОВІЧА АБ БАЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ АТРАДА «РАМАНА» З 28 САКАВІКА ДА 11 КАСТРЫЧНІКА 1942 г.

**25 октября 1942 г.**

*Март 1942 г.*

28 марта 1942 г. — разгром полицейского гарнизона и волостного управления[1] в дер. Домжерицы. Трофеи: винтовок — 15, кобурного оружия — 2, хозяйственно-продовольственный склад — 1. Руководили: Манкович С.С., Машкевич И.А., Кузин А.[2]

17 марта 1942 г. — разгром волостного управления [в] дер. Осетище. Руководил Дьяков Р.

*Май 1942 г.*

8 мая 1942 г. на дороге Минск—Москва (2 км восточнее ст. Крупки) спущен эшелон противника с живой силой. Уничтожены 1 паровоз, 7 вагонов с живой силой. Повреждено 5 вагонов с живой силой. Состав группы: Чернов А.Е., Лунчев Н.Т., Полянский Ф.И., Штукарев П.Н., Машкевич И.А., Милованов...

18 мая 1942 г. на ж.д. Минск—Москва, 3 км западнее ст. Крупки, спущен эшелон противника. Уничтожено 5 вагонов с боеприпасами и другим военным имуществом. Повреждены 1 паровоз, 11 вагонов с боеприпасами и другим военным имуществом. Состав группы: Драптусов, Жаворонков, Кулешов, Герасименок, Шильников, Баландин.

[...]

*Июнь 1942 г.*

8 июня 1942 г. на ж.д. Молодечно—Минск, на участке Молодечно—Красное, у разъезда Волки, спущен эшелон противника. Уничтожены 3 вагона с живой силой, 7 платформ с автомашинами. Повреждены паровоз, 3 платформы с автомашинами, 8 вагонов с неустановленным грузом. Состав группы: Пивоваров, Матюнин, Бутюгин, Сыч, Морозов, Полянский.

11 июня 1942 г. — налет на гарнизон Латыголичи (Холопеничский район). Потери противника — 5 чел. убитых. Руководил Дьяков Р.А.[3]

20 июня 1942 г. на дороге Молодечно—Минск, 5 км восточнее ст. Красное, спущен эшелон противника. Уничтожены паровоз, 10 платформ с техникой. Повреждено 6 вагонов с живой силой и 4 платформы с техникой. Состав группы: Юрченко, Баландин, Герасименок, Мальцев, Милованов, Штукарев.

*Сентябрь 1942 г.*

9 сентября 1942 г. — действия засадных групп в районе мест. Березино с задачей блокировки немецко-полицейского гарнизона. Руководители Манкович С.С., Лунчев Н.Т.

17 сентября 1942 г. уничтожен мост через р. Березина на дороге Докшицы—Лепель (через мост Березино). Руководил Манкович С.С*.

19 сентября 1942 г. уничтожены мосты через р. Поня у дер. Глинное, Небышино, Юхновка. Руководил Пивоваров П.Г.

23 сентября 1942 г. уничтожен шлюз Березинского канала. Руководил Чернов А.Е.

7 сентября 1942 г. — засада на дороге Березино—Лепель. Уничтожено 2 автомашины, 17 солдат. Руководил Лунчев Н.Т.

24 сентября 1942 г. — засада на дороге Бегомль—Лепель. Уничтожено 8 солдат. Руководил Гунин С.Д.

29 сентября 1942 г. — засада на дороге Бегомль—Лепель. Уничтожено 7 солдат. Руководил Суслов С.Г.

*Октябрь 1942 г.*

11 октября 1942 г. — засада на дороге Бегомль—Лепель. Уничтожено 11 солдат противника. Руководил Гунин С.Д.

Комиссар бригады ст. политрук Манкович.

[1] В документе «волости».
[2] Фамилия «Кузин А.» дописана карандашом.
[3] Фамилия «Дьяков Р.А.» дописана карандашом.

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Документы и материалы в трех томах. Т. 1. Мн., 1967. С. 383—384.*

## З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДЗІРА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ЖАЛЯЗНЯК» МІНСКАЙ ВОБЛ. І.П.ЦІТКОВА Ў БАРЫСАЎСКІ АПЕРАТЫЎНЫ ЦЭНТР АБ БАЯХ З КАРНЫМІ АТРАДАМІ ФАШЫСТАЎ

**18 ноября 1942 г.**

17 ноября 1942 г. отряд Долганова из бригады «Дяди Васи» в районе дер. Бирули вел бой с противником численностью 80 чел. С прибытием подкрепления противнику Долганов отступил в направлении Березино. Наше подкрепление прибыло на место, когда противник зажег дер. Бирули. В результате короткого боя нам удалось эвакуировать население и не дать противнику проникнуть в район Отрубок и Б[ольшая] Черница.

17 ноября 1942 г. в 16.00 в районе Пьяный Лес с полицией и немцами вел бой 2-й отряд нашей бригады. В результате боя убито 4 немца и 8 полицейских. С нашей стороны потерь нет.

Обстановка в районе напряженная. Приняты меры.

Командир бригады капитан *Титков*.

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944 г.). Документы и материалы в трех томах. Т. 1. Мн., 1967. С. 443—444.*

## ЗАГАД № 49А ПА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЗЕ «ЖАЛЯЗНЯК» МІНСКАЙ ВОБЛ. АБ СТВАРЭННІ АРТЫЛЕРЫЙСКАЙ БАТАРЭІ

**12 января 1943 г.**

1. Сформировать в составе бригады «Железняк» артиллерийскую батарею: 76-мм пушек — 2, 45-мм — 1, вооруженная группа прикрытия — 12 чел. Формирование артбатареи

возлагаю на зам. командира бригады Дьякова Романа. Срок формирования — 17 января 1943 г. Пункт формирования — 3-й отряд, дер. Заольховье.

2. Командный состав, орудийные расчеты подобрать в отрядах из числа артиллеристов-специалистов, независимо от занимаемой должности в отряде, за исключением командиров и комиссаров отрядов. Орудийный расчет в составе 6 чел. с включением командира орудия. Группа прикрытия в составе 3 отделений численностью по 4 чел. каждое (командир отделения из числа 4).

3. Ремонт пушек 76-мм возлагаю на командира 3-го отряда Афанасьева, 45-мм — на нач. боепитания Воденкова. Общую ответственность за боеготовность артиллерии — на зам. командира бригады Дьякова Романа.

4. Конский состав для артбатареи подобрать из отрядного транспорта, отбор производить персональным осмотром всего конского состава, из расчета: 1-й отряд — 2 лошади, 2-й отряд — 4 лошади, 3-й отряд — 2 лошади, хозяйственный транспорт — 1 лошадь. Все имеющиеся седла в отрядах передать в артбатарею. За комплектность конского снаряжения[1] несут ответственность командиры отрядов.

5. Артбатарею считать[2] самостоятельной единицей, состоящей в подчинении непосредственно штабу бригады. Нач. интендантского снабжения личный состав батареи принять на довольствие.

Командир бригады капитан *Титков*.

Комиссар бригады ст. политрук *Манкович*.

Нач. штаба бригады лейтенант *Бирюков*.

---

[1] В документе «сооружения».

[2] В документе «значить».

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Документы и материалы в трех томах. Т. 2. Кн. 1. Мн., 1973. С. 106.*

## СА СПРАВАЗДАЧЫ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ЖАЛЯЗНЯК» ПА СТАНУ НА 15 СТУДЗЕНЯ 1943 г.

...Бригада за последнее время провела следующие операции: блокирование гарнизонов, находящихся на мостах, и знание этих гарнизонов, уничтожение двух мостов, в т.ч. деревянного моста длиной 230 м через р. Береза, изгнание немецкого гарнизона из мест. Бегомль, этим самым освобождение всего района от немецких оккупантов; сделана засада на дороге Лепель—Березино, где убито 22 человека; заминирована дорога Березино—Лепель. Засада на дороге Бегомль—Лепель.

Апрель месяц 1942 г.

Уничтожен Бузянский мост, движение противника задержано на 36 дней.

Заготовки, которые думал провести противник в районе, сорваны на 90% по отношению к его плану. План противника о наборе населения в самооборону сорван на 100%, а также другие мероприятия, проводимые немецкими властями в районе, партизанской бригадой сорваны.

За 1942 г. спущено 4 вражеских ж.-д. эшелона, из них с техникой и боеприпасами 2 эшелона и с живой силой 2...

Необходимо отметить, что за последнее время фактор мародерства в районе уменьшился со стороны бойцов и командиров нашей бригады. Но проезжающие группы других через территорию нашего района занимаются мародерством. Приходится эти группы обезоруживать и отправлять по назначению.

Получаемая литература и листовки из-за линии фронта силами бригады и специально выделенными людьми распространяются не только на территории нашего района, но также и на территориях районов, прилегающих к нам.

Секретарь Бегомльского РК КП(б)Б Манкович.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 33- а, спр. 496, л. 3—4.*

# З ДЗЁННІКА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ЖАЛЯЗНЯК» МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ АБ БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯХ З 3 ДА 29 ЛЮТАГА 1944 г.

| Дата | Боевые операции | Участники |
|---|---|---|
| 1944 г | | |
| 3 февраля | Засадой 5-го отряда силой в одну роту у д. Сивцы (12 км северо-восточнее Долгиново) убито 5, ранено 7 солдат противника.<br>Потери роты — 2 чел. убитыми (Кривко Павел Антонович и Севрюк Иван Васильевич). | |
| 6 февраля | Засадой 1-го отряда силой в 2 усиленные роты на дороге Докшицы—Лепель, участке Докшицы—Глинное (севернее дер. Заречицк), убито 18, ранено 5 солдат и офицеров противника.<br>Потери отряда — 1 чел. ранен (Костюк Павел Маркович). | |
| 10 февраля | Диверсионной группой 2-го отряда на дороге Докшицы—Будслав у дер. Малые Коляги уничтожен деревянный мост длиной 20 м (подрывом и разборкой). | Состав группы: Кулибанов, Зимницкий, Тимохин, Кудрин, Толстых (старший). |
| 12 февраля | Противник численностью 250 чел. при поддержке 3 средних танков, 2 батальонных минометов и дальнобойной артиллерии из района Пустоселье повел наступление по дороге Березино—Бересневка. В результате боя на рубеже обороны 5-го отряда (у д. Улесье) противник отошел.<br>Потери противника: убито 4, ранено 7 солдат. | |
| 17 февраля | Засадой 1-го отряда силой в 1 роту на дороге Докшицы—Лепель, участке Докшицы—Глинное (севернее д. Заречицк), уничтожена патрульная группа противника численностью 10 чел.<br>Потери роты — 3 чел. ранены: командир роты мл. лейтенант Тихоновец П.А., ком. отделения Гайдук А.А., Кулик И.У. | |
| 18 февраля | В 14.00 на дороге Докшицы—Лепель, участке Березино—Трамблин, 5-м отрядом сделана засада силою 3-го взвода. Огнем засады разбито 7 грузовых автомашин противника с живой силой. Машины были передовой группой колонны из 26 автомашин с живой силой.<br>В результате интенсивного огня с дистанции 15 м в течение 15 мин. разбита моторная часть 7 автомашин...<br>После развертывания противника, следовавшего на остальных 19 машинах, засада отошла.<br>Потери отряда — 1 чел. ранен. | |
| 19 февраля | 1-м отрядом разгромлен гарнизон противника в д. Дубовое (4 км восточнее Докшиц). В результате боя уничтожен штаб и техническая контора батальона саперного полка. Сожжено 5 грузовых автомашин, 1 мотоцикл. Помещение штаба вместе с сопротивлявшейся группой офицеров сожжено. Взято в плен 26 солдат строительной команды (быв. военнопленные). Захвачены документы технической конторы батальона.<br>Трофеи: 2 автомата, 2 винтовки, телефонный аппарат, нивелир, 2 гониометра, 4 фотоаппарата с техническими негативами, 50 комплектов обмундирования.<br>Помещения гарнизона, занимаемые противником, сожжены.<br>Потери отряда: ранен 1 человек. Командир отряда мл. политрук Борздыко Спиридон Викентьевич. | |

| Дата | Боевые операции | Участники |
|---|---|---|
| 19 февраля | 2-й отряд и рота автоматчиков проводили операцию с задачей разгрома гарнизона противника в д. Козики (5 км юго-восточнее Докшиц). Отряд занял деревню и блокировал дома, занятые противником. В результате боя убито 27 солдат и офицеров противника. Полностью уничтожить объекты гарнизона не удалось.<br>Потери отряда: ранено 8 чел., убито 4 чел. Убиты: командир взвода роты автоматчиков лейтенант Романовский Генрих Казимирович, Росляков Павел Степанович, Белькович Николай Тимофеевич, Левко Николай Иванович.<br>Ранены: Коростик Александр Петрович, Матюта Леон Александрович, Батура Илья Иванович, Дрозд Николай Константинович, сержант Стацевич Максим Игнатьевич, Соколенко Афанасий Федорович, Лынько Сергей Юльянович.<br>Потери оружия: автоматов — 2, винтовок — 1. | |
| 20 февраля | Засадой 6-го отряда силой в одну роту на дороге Докшицы — Лепель, участке Трамбин — Березино, подбиты 2 грузовые автомашины. Убито 7, ранено 11 солдат и офицеров противника. | |
| 22 февраля | Засадой 1-го отряда силой в 1 взвод на дороге Докшицы — Лепель, участке Докшицы — Глинное (севернее д. Заречицк), уничтожена патрульная группа противника численностью 9 чел. Трофеи: 2 винтовки, 6 гранат. Захвачены документы убитых.<br>Потери отряда — ранен Шиленок Петр Иосифович. | |
| 23 февраля | Засадой 6-го отряда силою в 2 роты на дороге Докшицы — Лепель, участке Березино — Кадлубище, уничтожена грузовая автомашина с живой силой и 3 повозки.<br>Убито 6, ранено 12 солдат и офицеров противника. | |
| 24 февраля | Противник численностью до 150 чел. пытался переправиться через р. Поня в р[айо]не д. Юхновка. В результате боя с 1-м отрядом противник отошел.<br>Потери противника: убито 3, ранено 7 солдат и офицеров.<br>Потери отряда: убит Шаркевич Г.К., ранен Кулик И.У. | |
| 27 февраля | Разведгруппой 6-го отряда при столкновении с группой противника у д. Лубень (17 км северо-восточнее Долгиново) убит 1 немецкий старший ефрейтор. Взяты документы и оружие убитого (1 винтовка). | Состав группы: Юрьев Ю.М., Саврицкий А.П., Белькович Г.Е. |
| 28 февраля | Засадой роты автоматичков у д. Козики (4 км юго-восточнее Докшиц) убито 3, ранено 6 солдат противника. Разбито 3 подводы. | |
| 29 февраля | Засадой 5-го отряда силой в одну роту на дороге Докшицы — Лепель, участке Березино — Кадлубище, уничтожена (сожжена) грузовая автомашина противника. Убито 10 солдат.<br>Всего за февраль 1944 г. уничтожено: паровозов — 1, вагонов с живой силой — 4, автомашин грузовых — 13, мотоциклов — 1, повозок — 6, мостов деревянных — 1 (20 м).<br>Повреждено: вагонов с живой силой, боеприпасами и другим военным имуществом — 10, автомашин грузовых — 2.<br>Трофеи: винтовок — 4, автоматов — 2, обмундирования — 50 комплектов, нивелиров — 1, гониометров — 2, телефонных аппаратов — 1, фотоаппаратов — 4.<br>Потери бригады: убито — 7 чел., ранено — 17 чел.<br>Потери оружия: автоматов — 2, винтовок — 1. | |

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Документы и материалы в трех томах. Т. 3. Мн., 1982. С. 115—118.*

## СА СПРАВАЗДАЧЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ БРЫГАДЫ «ЖАЛЯЗНЯК» ПАРТЫЙНАМУ ЦЭНТРУ БАРЫСАЎСКАЙ ЗОНЫ АБ ПРАРОБЛЕНАЙ РАБОЦЕ ЗА СТУДЗЕНЬ 1943 г.

**2 лютага 1943 г.**

...Район полностью очищен от немецко-оккупационных властей. В основном полностью выведены из строя все дорожные сообщения, на которых уничтожены мосты, сделаны рвы, ловушки и завалы. Таким образом создан искусственный заслон в продвижении немецким войскам.

Проводится работа по ликвидации изменников и предателей Родины.

Жизнь всего населения района переведена на военный лад и объявлено ему о мобилизационной готовности, с этой целью население привлечено к сооружению землянок и блиндажей в укрытых лесных массивах.

Весь конский состав объявлен мобилизованным и используется для военных нужд в партизанских отрядах или в группах самообороны.

Часть населения мобилизована в отряды, часть в дружины самообороны, часть используется на домашних хозяйственных работах и работах партизанских отрядов.

Экономика района на январь месяц удовлетворительная. Все заготовительные мероприятия в основном были проведены партизанскими властями и в очень малом размере, главным образом в Бегомле и прилегающих к нему населенных пунктах, немецкими властями. Сейчас все хлебные и мясные запасы района в основном исчерпаны, и поэтому заготовительные мероприятия приходится проводить в районах западной области...

С 16 по 24 января бригада имела множество стычек и несколько боев, обороняя деревню Пышно...

За январь месяц 1943 г. создан 4-й отряд и артбатарея. Розыскано вооружение и боеприпасы для артбатареи, во всех деревнях района созданы команды самообороны (не полностью проведена эта работа еще в Мстижском и Березинском сельсоветах). Личный состав команд самообороны является резервом партизанского движения в районе...

От секрпартбюро бригады «Железняк» политрук Чернов. Секретарь райкома КП(б)Б ст. политрук Манкович.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 33-а, спр. 496, л. 5—6.*

*Выявіў і падрыхтаваў да друку У.І.Лемяшонак.*

## З ЗАГАДА КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ЖАЛЯЗНЯК» МІНСКАЙ ВОБЛ. АБ ДОГЛЯДЗЕ БРАЦКІХ МАГІЛ ПАРТЫЗАН

**14 октября 1943 г.**

Несмотря на неоднократные указания, по-прежнему не обращено серьезное внимание на состояние братских могилок партизан, погибших в боях с немецкими фашистами в Бегомльском районе. До сих пор в отрядах не имеется единых мест похорон. Братские могилы 1-го отряда, 2, 5 и 3-го должным образом не оформлены и безнадзорны...

Приказываю:

§ 1

К 25 октября 1943 г. имеющиеся братские могилы привести в должный порядок. На местах похорон насыпать курганы и покрыть дерном. На каждой могилке установить монумент в виде шпиля с красной звездочкой. На шпиле, в квадрате, сделать надписи: фамилия, имя и отчество партизан, краткий адрес, год рождения, дату смерти, место гибели. Общее место похорон обнести штакетным забором.

§ 2

В каждом отряде иметь единое место похорон — жертв войны с германским фашизмом. Похороны партизан производить организованно, с отдачей воинских почестей по существующим законным положениям. Только в исключительных случаях разрешается выдавать трупы на похороны их родителям. Во всех остальных случаях, при общих похоронах, на похороны приглашать* родных и родственников погибшего.

* В документе «привлекать».

§ 3

Обязываю весь личный состав бригады при прохождении у братских могил отдавать воинские почести. При прохождении одиночек с оружием почести отдавать [в] положении «смирно» с поворотом головы в сторону монумента (памятника). Невооруженным — [в] положении «смирно» с прикладом руки к головному убору. При прохождении колонн старший команды подает команду «смирно!» с равнением в сторону монумента (памятника). Лиц, не отдающих воинской почести, привлекать к суровой дисциплинарной ответственности.

§ 4

Братскую могилу в районе аэродрома привести в порядок коменданту штаба бригады: могилу оградить и водрузить общий монумент, художественно оформить.

Настоящий приказ (параграф 3) зачитать перед строем всему личному составу. Персональная ответственность за выполнение настоящего приказа возлагается на комиссаров отрядов.

Командир бригады капитан *Титков*

Комиссар бригады ст. политрук *Манкович*

Нач. штаба бригады лейтенант *Бирюков*

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Документы и материалы в трех томах. Т. 2. Кн. 2. Мн., 1978. С. 313—314.*

## ЗАГАД № 220 ПА БРЫГАДЗЕ «ЖАЛЯЗНЯК»

**27 сакавіка 1944 г.**

1. На основании решения бюро Бегомльского РК КП(б)Б от 25 марта 1944 года в Бегомльском районе произвести заготовку зерна для нужд бригады.

2. Заготовку производить отрядам в пределах ранее закрепленных зон контролирования по норме: 60 кг с гектара засеянной площади.

3. Партизанские и красноармейские семьи сдают поставки в размере 50% установленной нормы.

4. Политработникам отрядов в зонах контролирования развернуть массово-разъяснительную работу по поводу проводимого мероприятия.

Командир бригады Герой Советского Союза капитан *Титков*.

Комиссар бригады *Дернушков*.

Начальник штаба бригады лейтенант *Бирюков*.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 1341, воп. 1, спр. 40, л. 7.*

## ЗАГАД № 230 ПА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЗЕ «ЖАЛЯЗНЯК»

**29 красавіка 1944 г.**

Немецкие оккупанты, предвидя неизбежность оставления ими территории Белоруссии, принимают все меры к срыву посевной кампании 1944 г. с тем, чтобы лишить население средств существования.

Еще в период карательной экспедиции 1943 г. преднамеренно вывозились и уничтожались средства производства и тягловая сила.

В проведении посевной кампании у крестьян имеются серьезные затруднения, заключающиеся главным образом в ограниченном количестве тягловой силы и инвентаря.

Учитывая важность данного мероприятия и настоятельную необходимость использования всей посевной площади района, приказываю:

1. Запретить отрядам и их заготовительным и прочим группам мобилизацию транспорта по любым причинам. Для нужд отрядов использовать лошадей, предусмотренных спущенным штатом.

Командиры отрядов могут мобилизовывать своим приказом транспорт только в исключительных случаях (срочная переброска подразделения, связанная с вылазкой противника, переброска раненых и др.). Количество подвод должно браться минимальное.

Партизан и комиссаров, мобилизующих транспорт без письменного приказания командира отряда, военным комендантом задерживать, транспорт возвращать крестьянам.

Командирам отрядов в каждом случае нарушения данного приказа принимать меры.

2. Разрешить предоставление отпусков личному составу в размере 5% (одновременно) сроком на 3 дня.

3. Имеющихся в отряде лошадей в случаях, когда это возможно, предоставлять населению, в первую очередь партизанским и красноармейским семьям.

4. Комиссарам отрядов населенные пункты района контролирования распределить между политсоставом для проведения массово-разъяснительной работы и всех организационных мероприятий по вопросам полной кампании (организация помощи лошадьми и инвентарем, выделения наделов семьям, выехавшим из района гарнизонов противника и т.д.).

5. Персональную ответственность за проведение массово-разъяснительной работы и мероприятий, связанных с весенней посевной кампанией, возлагаю на комиссаров отрядов, а контроль за выполнением пункта 1 на уполномоченных особого отдела.

Командир бригады Герой Советского Союза капитан Титков.

Комиссар бригады Дернушков.

Начальник штаба бригады лейтенант Бирюков.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 1341, воп. 1, спр. 40, л. 6.*

## Партызанская брыгада імя У.І.Леніна

Створана ў ліпені 1942 г. Паўночна-Заходняй аператыўнай групай ЦК КП(б)Б у савецкім тыле як Беларуская дыверсійная брыгада асобага назначэння з партызан, вылучаных брыгадамі 1-й Беларускай і 2-й Беларускай імя П.К.Панамарэнкі. Пры яе фарміраванні арганізаваны атрады 1-ы і 2-і, пазней 3-і. У лістападзе 1942 г. брыгадзе прысвоена імя У.І.Леніна. Асноўная база да снежня 1942 г. знаходзілася ў савецкім тыле, куды атрады перыядычна выходзілі на экіпіроўку. Згодна з распараджэннем БШПР у верасні 1943 г. з Віцебскай вобласці брыгада перадыслацыравана ў Вілейскую. Са снежня 1943 г. да красавіка 1944 г. знаходзілася ў складзе Полацка-Лепельскай аператыўнай групы БШПР.

Брыгада дзейнічала ў Суражскім, Талачынскім, Ушацкім раёнах Віцебскай, Дуніла віцкім, Докшыцкім, Плісkім, Глыбоцкім Вілейскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 1.7.1944 г. ў складзе 3 атрадаў агульнай колькасцю 315 партызан.

З іх: мужчын — 275, жанчын — 40, беларусаў — 252, рускіх — 48, украінцаў — 7, іншых нацыянальнасцей — 8; членаў ВКП(б) — 7, кандыдатаў — 12, членаў ВЛКСМ — 62, беспартыйных — 234.

Камандзіры брыгады: Баскакаў Аляксей Андрэевіч (ліпень 1942 — май 1943, загінуў), Гарбаценкаў Максім Трыфанавіч (май 1943 — ліпень 1944), Фурсо Яўген Усцінавіч (красавік—чэрвень 1944, в.а.), камісары: Лобараў Васіль Данілавіч (жнівень 1942 — студзень 1943), Гарбаценкаў Максім Трыфанавіч (люты—май 1943), Шастакоў Рыгор Фёдаравіч (май—снежань 1943), Умінскі Мікалай Захаравіч (студзень—люты 1944, в.а.), Свірыд Уладзімір Сяргеевіч (люты—май 1944, загінуў), Пучкароў Мікалай Рыгоравіч (чэрвень—ліпень 1944); начальнікі штаба: Падгорны Мікалай Пятровіч (лістапад 1942 — сакавік 1943), Сафонаў Сяргей Фёдаравіч (май 1943 — ліпень 1944).

## Партызанская брыгада імя К.К.Ракасоўскага

Створана ў ліпені 1942 г.

1.7.1942 г. па распараджэнні ваеннага савета 29-й арміі ў Расонскі раён Віцебскай вобласці прыбыў 17-ы атрад асобага прызначэння на чале з А.І.Петраковым. Да гэтага часу пад кіраўніцтвам Расонскага падпольнага райкома КП(б)Б у раёне дзейнічалі атрады імя І.В.Сталіна, імя К.Я.Варашылава, імя В.І.Чапаева, імя В.П.Чкалава і імя В.М.Молатава. Камандаванне 17-га атрада аб'яднала іх у брыгаду «За Савецкую Беларусь» (26.3.1943 г. перайменавана ў імя К.К.Ракасоўскага), уключыўшы ў яе і свой атрад. У склад брыгады потым увайшлі асобныя атрады імя Сяргея, імя М.А.Шчорса, а таксама імя М.В.Фрунзе, імя У.І.Леніна, імя Р.І.Катоўскага, імя Г.К.Жукава, імя Ф.Э.Дзяржынскага.

Паводле ўказання БШПР у ліпені 1943 г. брыгада імя К.К.Ракасоўскага перадыслацыравалася ў Вілейскую вобласць.

Камісару брыгады П.М.Машэраву і намесніку камандзіра атрада імя М.А.Шчорса па разведцы У.А.Хамчаноўскаму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Расонскім, Асвейскім, Дрысенскім, Полацкім раёнах Віцебскай, Себежскім, Ідрыцкім, Невельскім Калінінскай, Пастаўскім, Дунілавіцкім, Докшыцкім, Міёрскім, Глыбоцкім, Мядзельскім Вілейскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 3.7.1944 г. ў складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 915 партызан.

З іх: мужчын — 841, жанчын — 74, беларусаў — 594, рускіх — 253, украінцаў — 32, іншых нацыянальнасцей — 36; членаў ВКП(б) — 53, кандыдатаў — 89, членаў ВЛКСМ — 226, беспартыйных — 547.

Камандзіры брыгады: Петракоў Андрэй Іванавіч (ліпень—верасень 1942), Дорменеў Уладзімір Нічыпаравіч (верасень—лістапад 1942, в.а; верасень 1943 — студзень 1944), Раманаў Аляксандр Васілевіч (лістапад 1942 — сакавік 1943, в.а.; сакавік 1943 — ліпень 1944); камісары: Раманаў Аляксандр Васілевіч (ліпень 1942 — сакавік 1943), Нігамаеў Шайхуш Нігамаевіч (снежань 1942 — сакавік 1943, в.а.; лістапад 1943 — ліпень 1944), Машэраў Пётр Міронавіч (сакавік—лістапад 1943); начальнікі штаба: Дорменеў Уладзімір Нічыпаравіч (ліпень 1942 — сакавік 1944, май—ліпень 1944), Казарцаў Георгій Іванавіч (верасень 1943 — студзень 1944, в.а.), Шчуцкі Уладзімір Пятровіч (сакавік—май 1944).

## Партызанская брыгада М.М.Нікіціна

Створана ў канцы ліпеня 1942 г.

З лета 1941 г. і ў пачатку 1942 г. на тэрыторыі Чэрвеньскага, Мінскага, Рудзенскага, Пухавіцкага і Уздзенскага раёнаў дзейнічалі асобныя партызанскія групы Я.Д.Сухарукава, Раманава, Б.К.Чуланскага, Уколава, арганізаваныя з савецкіх ваеннаслужачых, якія трапілі ў акружэнне, ваеннапалонных і жыхароў в. Самахвалавічы, і партызанскія атрады П.І.Знака, А.В.Балікевіча. У сакавіку—маі 1942 г. па заданні Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б капітан М.М.Нікіцін аб'яднаў іх у адзін атрад (камандзір — Нікіцін Мікалай Міхайлавіч, камісар — Знак Пётр Ігнацьевіч, начальнік штаба — Васільеў). У маі 1942 г. ў яго ўліўся атрад Бачкарова (арганізаваны ў Чэрвеньскім раёне ў ліпені 1941; камандзір — Бачкароў Якаў Сямёнавіч). У ліпені 1942 г. атрад разгорнуты ў брыгаду. Пры яе фарміраванні створаны 1, 2, 3 і 4-ы атрады. У пачатку жніўня 1942 г. ў брыгаду ўліліся атрады І.К.Кузьміна і А.І.Каменева, якім адпаведна прысвоены нумары 5-ы і 6-ы.

Брыгада дзейнічала ў Рудзенскім, Чэрвеньскім, Дзяржынскім, Уздзенскім, Бягомльскім раёнах Мінскай, Івянецкім, Валожынскім Баранавіцкай і Ушацкім раёне Віцебскай абласцей. У верасні 1942 г. ў яе складзе налічвалася 41 партызан.

У лістападзе 1942 г. выйшла ў савецкі тыл, дзе была расфарміравана.

Камандзір брыгады — Нікіцін Мікалай Міхайлавіч (ліпень—лістапад 1942); камісар — Гваздзёў Аляксандр Мацвеевіч (ліпень—лістапад 1942); начальнікі штаба: Васільеў (ліпень—жнівень 1942), Панкратаў Нічыпар Сямёнавіч (жнівень—лістапад 1942).

## Партызанская брыгада «Дзядзькі Колі»

Створана ў жніўні 1942 г. паводле рашэння сходу камандзіраў партызанскіх атрадаў і прадстаўнікоў Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б на базе асобных атрадаў «Дзядзькі Колі» (пазней імя Ф.Э.Дзяржынскага), «Камунар», імя І.В.Сталіна, імя В.І.Чапаева, «Бура», «За Бацькаўшчыну» і дыверсійнай групы Г.Р.Каўзановіча. Пазней у брыгадзе арганізаваны атрады «За Савецкую Радзіму», «Ленінец» і імя М.Ф.Гастэлы.

Камандзіру брыгады П.Р.Лапаціну, разведчыцы Н.В.Траян прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Барысаўскім, Смалявіцкім, Бягомльскім, Лагойскім і Плешчаніцкім раёнах.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 28.6.1944 г. ў складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 1042 партызаны.

З іх: мужчын — 864, жанчын — 114, беларусаў — 517, рускіх — 345, украінцаў — 66, іншых нацыянальнасцей — 50; членаў ВКП(б) — 66, кандыдатаў — 86, членаў ВЛКСМ — 312, беспартыйных — 514. Дэмаграфічныя даныя на 64 чалавекі не ўстаноўлены.

Камандзір брыгады — Лапацін Пётр Рыгоравіч (жнівень 1942 — чэрвень 1944); камісары: Язубчык Аляксей Цітавіч (жнівень 1942 — ліпень 1943), Чуліцкі Мікалай Мікалаевіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Бальшакоў Віктар Паўлавіч (жнівень 1942 — чэрвень 1943), Валошын Андрэй Лявонцьевіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944).

## Партызанская брыгада імя Л.М.Даватара

Створана ў снежні 1942 на базе атрада Ф.С.Шляхтунова (пазней імя Я.М.Свярдлова). Пры фарміраванні брыгады з часткі асабовага складу атрада створаны 2-і атрад. 16.1.1943 г. загадам Штаба партызанскага руху пры Ваенным савеце Калінінскага фронту брыгадзе перададзены 1-ы батальён брыгады «За Савецкую Беларусь» Віцебскай вобласці (пазней партызанская брыгада імя К.К.Ракасоўскага Вілейскай вобл.). 1-я рота батальёна пераўтворана ў 3-і атрад імя А.Я.Пархоменкі, на базе 2-й і 3-й рот створаны 4-ы атрад. У канцы студзеня 1943 г. брыгада перадыслацыравалася з Докшыцкага ў Мядзельскі раён, дзе аб'ядналася з брыгадай імя К.Я.Варашылава. 16.3.1943 г. на падставе распараджэння Беларускага штаба партызанскага руху брыгада імя К.Я.Варашылава была расфармавана... 

З яе складу вылучыліся 1-ы і 2-і атрады, на базе якіх была адноўлена брыгада Ф.С.Шляхтунова. Пазней у брыгадзе Ф.С.Шляхтунова арганізаваны атрады імя Д.А.Фурманава, імя Ф.Э.Дзяржынскага, імя Г.К.Жукава, «Старынкі», «Іжа».

22.10.1943 г. загадам ваенна-аператыўнага аддзела пры Вілейскім падпольным абкоме КП(б)Б брыгадзе прысвоена імя Л.М.Даватара. Брыгада дзейнічала ў Докшыцкім, Куранецкім і Мядзельскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 2.7.1944 г. ў складзе 7 атрадаў агульнай колькасцю 568 партызан.

З іх: мужчын — 531, жанчын — 37, беларусаў — 475, рускіх — 56, украінцаў — 12, іншых нацыянальнасцей — 25; членаў ВКП(б) — 7, кандыдатаў — 33, членаў ВЛКСМ — 118, беспартыйных — 410.

Камандзіры брыгады: Шляхтуноў Фёдар Сазонавіч (снежань 1942 — кастрычнік 1943; з 31.1.1943 па 16.3.1943 Ф.С.Шляхтуноў быў камандзірам брыгады імя К.Я.Варашылава), Іваноў Іван Аўксенцьевіч (кастрычнік 1943 — ліпень 1944); камісары: Кадоўба Данііл Якаўлевіч (снежань 1942 — студзень 1943), Паўленка Павел Андрэевіч (красавік 1943 — кастрычнік 1943), Папок Васіль Фёдаравіч (кастрычнік 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Вашчыла Сцяпан Арцёмавіч (сакавік 1943 — верасень 1943), Дудкоўскі Барыс Восіпавіч (верасень 1943 — ліпень 1944).

## Партызанская брыгада імя ЦК КП(б)Б

Створана ў сакавіку 1943 г.

У верасні 1942 г. брыгадай «За Савецкую Беларусь» Віцебскай вобласці ў Вілейскую накіраваны атрад імя А.Я.Пархоменкі на чале з А.Д.Мядзведзевым. 9.10.1942 г. ён і асобныя партызанскія групы П.Ф.Рудава і М.З.Умінскага, якія прыбылі сюды летам 1942 г. з савецкага тылу па заданні ЦК КП(б)Б, аб'ядналіся ў групу атрадаў, пераўтвораную 20 кастрычніка ў 1-ы батальён (камандзір — Мядзведзеў Анатоль Данілавіч; камісары: Воранаў Фёдар Яфімавіч, Бондараў Ціхан Мікітавіч; начальнік штаба — Цяста Ігнат Аляксандравіч). Пры арганізацыі батальёна атрад імя А.Я.Пархоменкі пераўтвораны ў 1-ю роту, група П.Ф.Рудава — у 2-ю, М.З.Умінскага — у 3-ю. 26 кастрычніка ў склад батальёна ўключана група А.І.Шаўчэнкі, якая прыбыла ў Вілейскую вобласць з-за лініі фронту летам 1942 г. па



Група партызан 1-га атрада імя А.Я.Пархоменкі брыгады імя ЦК КП(б)Б.

заданні ЦК КП(б)Б. Да 16.1.1943 г. батальён уваходзіў у падпарадкаванне брыгады «За Савецкую Беларусь», затым перададзены брыгадзе Ф.С.Шляхтунова (пазней імя Л.М.Даватара). 1-я рота батальёна ў брыгадзе Ф.С.Шляхтунова пераўтворана ў 3-і атрад імя А.Я.Пархоменкі, з асабовага саставу 2-й і 3-й рот сфармірваны 4-ы. 16.3.1943 г. гэтыя атрады зноў аб'ядналіся ў самастойны батальён. 4-ы атрад быў расфарміраваны: групы П.Ф.Рудава, М.З.Умінскага, А.І.Шаўчэнкі вылучыліся для арганізацыі самастойных атрадаў. Адначасова з асабовага саставу, вылучанага атрадам імя А.Я.Пархоменкі, сфарміраваны 2-і атрад (пазней імя В.П.Чкалава), у маі 1943 г. – 3-і (пазней імя Г.К.Жукава), у чэрвені – 4-ы, які ў верасні 1943 г. перададзены брыгадзе імя К.К.Ракасоўскага. У чэрвені 1943 г. батальён перайменаваны ў брыгаду А.Д.Мядзведзева.

У жніўні 1943 г. ў яе склад уключаны 5-ы атрад М.З.Умінскага (імя Дзянісава), у сакавіку 1944 г. сфарміраваны 4-ы атрад імя Дз.А.Фурманава. У лютым 1944 г. брыгадзе А.Д.Мядзведзева прысвоена імя ЦК КП(б)Б.

Брыгада дзейнічала ў Пліскім, Докшыцкім, Глыбоцкім, Астравецкім раёнах Вілейскай і Ушацкім раёне Віцебскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 6.7.1944 г. ў складзе 5 атрадаў агульнай колькасцю 338 партызан.

З іх: мужчын – 304, жанчын – 34, беларусаў – 242, рускіх – 51, украінцаў – 18, іншых нацыянальнасцей – 27; членаў ВКП(б) – 9; кандыдатаў – 28, членаў ВЛКСМ – 96, беспартыйных – 205.

Камандзіры брыгады: Мядзведзеў Анатоль Данілавіч (сакавік 1943 – чэрвень 1944), Пучкароў Мікалай Рыгоравіч (верасень–кастрычнік 1943, в.а.), Фёдараў Мікалай Іванавіч (чэрвень–ліпень 1944); камісары: Бондараў Ціхан Мікітавіч (сакавік–чэрвень 1943), Воранаў Фёдар Яфімавіч (чэрвень–верасень 1943), Пучкароў Мікалай Рыгоравіч (верасень 1943 – чэрвень 1944), Шчуцкі Уладзімір Пятровіч (чэрвень–ліпень 1944); начальнік штаба – Цяста Ігнат Аляксандравіч (сакавік–чэрвень 1943).

## Асобна дзейны атрад «Баявы»

Створаны ў кастрычніку 1941 г. ў савецкім тыле са спартсменаў-добраахвотнікаў як дыверсійна-разведвальны атрад. 7.3.1942 г. накіраваны ў тыл ворага. Дзейнічаў у Расонскім, Полацкім, Дрысенскім раёнах Віцебскай, Докшыцкім, Мядзельскім, Ашмянскім Вілейскай абласцей і на поўдні Літоўскай ССР. Атрад не ўваходзіў у склад злучэння Вілейскай вобласці. Камандзіру атрада В.Л.Няклюдаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 20.6.1944 г. ў складзе 317 байцоў.

Камандзіры атрада: Гарачаў Анатоль Сяргеевіч (сакавік—жнівень 1942), Няклюдаў Валянцін Леанідавіч (жнівень 1942 — чэрвень 1944).

## Асобна дзейны атрад І.М.Кузіна

Створаны ў студзені 1942 г. ў савецкім тыле як дыверсійны атрад (67 чал.). У красавіку прыбыў у Бягомльскі раён. 16.8.1942 г. выйшаў у савецкі тыл.

Камандзір атрада — Кузін Іван Міхайлавіч (студзень—жнівень 1942).

## 1-я Антыфашысцкая брыгада

16.8.1943 г. на бок партызан перайшла так званая Руская нацыянальная народная армія, арганізаваная нямецка-фашысцкімі захопнікамі з ваеннапалонных. Яна атрымала найменне 1-й Антыфашысцкай партызанскай брыгады. 25 жніўня закончылася яе фарміраванне, у выніку якога былі створаны 5 стралковых атрадаў, рота аўтаматчыкаў, рота сувязі, артылерыйская батарэя, сапёрна-падрыўны атрад. У верасні арганізаваны вучэбна-рэзервовы батальён (9-ы атрад) з грамадзян Лагойскага, Плешчаніцкага і Смалявіцкага раёнаў. У сакавіку 1944 г. яго асабовы склад перададзены атрадам брыгады. У студзені 1944 г. створаны 10-ы атрад.

У красавіку—маі 1944 г. ў цяжкіх баях з карнікамі брыгада панесла вялікія страты (1026 чал.), перасталі існаваць 5 атрадаў (5, 6, 7, 8, 10-ы) і рота сувязі. У выніку перафарміравання ў брыгадзе створана 4 атрады.

Камісару брыгады І.М.Цімчуку ў студзені 1944 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Барысаўскім, Лагойскім, Плешчаніцкім раёнах Мінскай, Куранецкім, Пліскім, Пастаўскім Вілейскай, Лепельскім, Ушацкім Віцебскай абласцей.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 4.7.1944 г. ў складзе 4 атрадаў агульнай колькасцю 422 партызаны.

Камандзіры брыгады: Гіль-Радзіёнаў Уладзімір Уладзіміравіч (жнівень 1943 — май 1944, загінуў), Цімчук Іван Мацвеевіч (май—ліпень 1944); камісары: Касцяневіч Андрэй Мікалаевіч (верасень 1943, в.а.), Цімчук Іван Мацвеевіч (кастрычнік 1943 — май 1944), Яўмененка Іван Максімавіч (май—ліпень 1944); начальнік штаба — Панамарэнка Барыс Міхайлавіч (студзень—ліпень 1944).

## «Прывітанне «Хайль Гітлер!» адмяніць...»

...Пасля заканчэння ў 1939 г. Ваеннай акадэміі імя М.В.Фрунзе Уладзімір Уладзіміравіч Гіль (нарадзіўся ён 18.7.1906 у в. Дараганава Асіповіцкага раёна) служыў начальнікам штаба 229-й стралковай дывізіі. У бой з немцамі гэта фарміраванне ўступіла на Віцебшчыне, у раёне Сянно—Талачын. Там начальнік штаба быў паранены, трапіў у палон. Фашысты вывезлі Гіля ў лагер для ваеннапалонных у Сувалкі, што на польскай зямлі. Там у красавіку 1942 г. Гіль даў згоду фашысцкай адміністрацыі стварыць з савецкіх ваеннапалонных вайсковае фарміраванне. А яшчэ — праз 2 месяцы — стварыў антысавецкую арганізацыю «Баявы саюз рускіх нацыяналістаў», распрацаваў яе праграму. Для кіраўніцтва «Саюзам» арганізаваў камітэт у складзе 5 чалавек: Гіль, Гур'янаў, Рубанскі, Шапятовіч, Ягораў.

У студзені 1943 г. па ініцыятыве Гіля была склікана канферэнцыя, на якой абвясцілі пра стварэнне ўрада «Новай Расіі». У Сувалках Гіль схаваў сваё сапраўднае прозвішча пад псеўданімам Радзіёнаў.

Калі ў яго «дружыне» набралася каля тысячы чалавек, немцы накіравалі злучэнне ў Магілёўскую вобласць. Задачы радзіёнаўцам паставілі наступныя: ахоўваць чыгуначныя камунікацыі, весці барацьбу з партызанамі.

Сутыкаючыся з «дружынай» у розных баявых аперацыях, камандаванне партызанскай брыгады «Жалязняк» сумесна з Бягомльскім падпольным РК КП(б)Б праводзіла сярод радзіёнаўцаў агітацыю з мэтай іх пераходу на бок партызан. Якраз за гэта паплаціліся жыццём глінскія настаўніцы Навіцкая і Ніканава, якіх «дружыннікі» закатавалі.

Агітацыя партызанамі была распачата адразу, як толькі брыгада «Рускай нацыянальнай народнай арміі» з'явілася ў ваколіцах Докшыц. Праз сваіх сувязных і падпольшчыкаў, якія меліся ў вёсках Бягомльскага раёна, камандаванне брыгады «Жалязняк» пасылала радзіёнаўцам рознага характару лістоўкі. З часам шырылася кола радзіёнаўцаў, якія траплялі пад уздзеянне гэтай агітацыі. У пачатку чэрвеня 1943 г. партызанскія пасланні адрасаваліся непасрэдна ўсім камандзірам «дружыны» і нават самому Радзіёнаву, а таксама генералу Багданаву, які ўзначальваў у брыгадзе службу СД.

Прыблізна 5—6.7.1943 г. ў штаб брыгады «Жалязняк» на кані прыехаў сувязны Пётр Шамецька, бацька аднаго з партызан, і прывёз запіску ад самога Радзіёнава. Камбрыг І.П.Ціткоў разгарнуў паперку і прачытаў: «Бандыты! Пераходзьце на наш бок! Гарэлкай і хлебам накармлю!» Далей — неразборлівы подпіс. На адваротным баку гэтага паслання Ціткоў напісаў: «Савецкія войскі наступаюць. А куды вы, здраднікі, пабяжыце? Пад зямлёю знойдзем і прымусім трымаць адказ перад савецкім народам за ўсе вашы зверствы».

На другі дзень зноў прыскакаў П.Шамецька і прывёз пісьмо на двух аркушах. Унізе — выразны подпіс Радзіёнава. Ізноў ліст насіў ультыматыўна-пагрозлівы характар. Камандаванне адразу ж падрыхтавала адказ... Пакольні перапіска Радзіёнава з Ціткоўым набыла сталы характар, камандзір «дружыны» папрасіў, каб партызаны далі Шамецьку



І.М.Кузін.

«ахоўную грамату» — гарантыйнае пасведчанне, што Ціткоў і зрабіў. А Гіль, са свайго боку, пасадзіў сувязнога на добрага кавалерыйскага каня, выдаў сядло. Прыкладна 29 ліпеня ў штабе брыгады «Жалязняк» былі надрукаваны асабістыя пасланні Багданаву, Шэпелеву, Волкаву і Арлову. Партызаны даводзілі, што ў радзіёнаўцаў яшчэ ёсць шанц загладзіць сваю віну перад Радзімай. Жанчыну, якая перадала пасланне Багданаву, адлупцавалі розгамі. Але кожны з адрасатаў напісаў адказ. Генерал Багданаў выліў на партызан лавіну абраз. Патэтычна напісаў, што, пакуль будзе жыць, не кіне нястомную барацьбу з бальшавізмам. Палкоўнік Волкаў паведамляў, што гатовы служыць хоць чорту, абы толькі былі бабы і гарэлка. Палкоўнік Арлоў як быццам апраўдваўся: маўляў, з вяртаннем да сваіх расправы НКУС яму не мінуць. Сам Радзіёнаў напісаў адказ на трох аркушах. Ён працягваў даказваць, што партызанскі рух — гэта прымусовае аб'яднанне людзей, над якім пудзілам стаіць партыя. Не было б яе, даўно разбегліся б. У наступным пісьме партызаны прапанавалі правесці сустрэчу і перагаворы.

Радзіёнаў пагадзіўся і даслаў са свайго боку Багданава. Камандаванне брыгады «Жалязняк» камандзіравала на перагаворы начальніка штаба 2-га атрада капітана П.П.Юрчанку, які ў дзеючай арміі быў начальнікам аператыўнага аддзела злучэння, добра ведаў генерала Багданава, камандзіра 48-й стралковай дывізіі.

І гэтыя перагаворы нічога не далі народным мсціўцам. Багданаў запатрабаваў, каб партызаны ачысцілі тэрыторыю, якую кантралявалі радзіёнаўцы, і не перашкаджалі «дружыннікам» усталёўваць тут «новы пара-



Хата ў в. Будзілаўка, дзе адбываліся перагаворы аб пераходзе 1-й Рускай нацыянальнай брыгады на бок партызан.

дак». Пасля няўдалых перагавораў штаб партызанскай брыгады прыняў рашэнне ўзмацніць націск на гарнізоны 1-й Рускай нацыянальнай брыгады. Гіль, у сваю чаргу, разгарнуў маштабнае наступленне супраць народных мсціўцаў. Аднак тут жа яно, дзякуючы атакам партызан, было паралізавана.

Літаральна ў гэтыя ж дні абвастрэння супрацьстаяння камандаванне брыгады «Жалязняк» паслала Радзіёнаву пісьмо, што нібыта да партызан з Мінска прыйшоў сувязны Жорж. Па сваіх каналах яму ўдалося высветліць пра планы германскага камандавання адносна Радзіёнава. Немцы прынялі рашэнне, што ў сувязі з невыкананнем ускладзеных на плечы «дружыннікаў» задач іх камандзір будзе зняты з пасады і, магчыма, арыштаваны, камандзірам павінен стаць Багданаў. Гілю перадалі гэтыя звесткі ў чарговым пісьме. Камандзір «дружыны» як быццам азлобіўся, палічыўшы гэта правакацыяй камуністаў, і пачаў наступленне на Бягомль. А тым часам з брыгады пацягнуліся перабежчыкі і на бок партызан. У поўным складзе прыйшло аддзяленне Ушакова, рота станковых кулямётаў Насонава, афіцэры Іваноў, Балашоў, Хахлоў і шмат хто яшчэ.

13 жніўня 5-ы атрад брыгады «Жалязняк» і рота аўтаматчыкаў разграмілі радзіёнаўскі гарнізон у в. Юхнаўка. А за дзень перад гэтым разбілі і 2 невялікія гарнізоны — у Трамбіне і Загалаўі. У Юхнаўцы радзіёнаўцы поўнасцю страцілі батальён маёра Фефелава. З падраздзялення загінула 90 чалавек. У палон партызаны ўзялі 48 чалавек, захапілі вялікія трафеі. Адразу ж пасля разгрому батальёна Фефелава ў Юхнаўку прыбегла з Глінянага сувязная Ганна Фрол з пісьмом ад маёра Шапятоўскага. У ім гаварылася:

«Камандзіру брыгады «Жалязняк» капітану Ціткову.

Звяртаюся да вас, маючы на тое паўнамоцтвы камандзіра Рускай нацыянальнай брыгады. Падпалкоўнік Радзіёнаў прапанаваў паведаміць вам, што ім вядзецца падрыхтоўка для кантакціравання вашых дзеянняў з брыгадай, якой ён кіруе. Таму перш чым мы ўзгоднім з вамі і ажыццявім мерапрыемствы, прапаноўваю вам не праводзіць баявых дзеянняў супраць нас, не дапускаючы бакамі правакацыйных дзеянняў. Неабходна гэта, каб пазбегнуць бессэнсоўных страт з абодвух бакоў. Ён выказаў шкадаванне аб тым, што адбылося ў Юхнаўцы ў выніку немагчымасці своечасова папярэдзіць вас аб сваіх намерах. Далейшыя перагаворы падпалкоўнік пачне ў бліжэйшыя дні.

По даручэнні падпалкоўніка Радзіёнава маёр Шапятоўскі.

13 жніўня 1943 г.»

Пад асноўным тэкстам была прыпіска з просьбай трымаць змест пісьма ў тайне.

Камандаванне «Жалезняка» адказала вельмі сцісла:

«Камандзіру Рускай нацыянальнай брыгады падпалкоўніку Радзіёнаву.

Лічу неабходным напомніць вам аб правале перагавораў нашых прадстаўнікоў на месце паміж Будзілаўкай і Красным. Прапаную перагаворы весці асабіста. Сустрэчу прызначаю заўтра ў 8.00 у вёсцы Будзілаўка. Адказу чакаю тэрмінова.

Камбрыг «Жалезняка» Ціткоў».

І сувязная Г.Фрол панесла гэты адказ.

Штаб партызанскай брыгады трымаў (з дапамогай радыёграм) Цэнтр у курсе перагавораў з «дружынай». І сёння ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь можна азнаёміцца з арыгіналамі дакументаў, прысвечаных гэтаму пытанню.

14 жніўня ад Радзіёнава, рызыкуючы жыццём, прыляцеў матацыкліст. Нагрузіўшы «дружынніка» лістоўкамі, партызаны правялі яго за межы лагера. А праз дзень, 15 жніўня, у размяшчэнні брыгады «Жалязняк» з'явіўся ад'ютант Радзіёнава — капітан Цімафееў. Ён вусна паведаміў, што Радзіёнаў згодзен на асабістыя перагаворы з Цітковым. Тут жа былі абмеркаваны ўмовы. Перагаворы праводзіць у в. Будзілаўка. Радзіёнаў сам можа выбраць хату для перагавораў і вызначыць колькасць уласнай аховы. З партызанскага боку будзе патруль у складзе 12 чалавек.

16 жніўня ў 9 гадзін раніцы ў Юхнаўку прыехаў на матацыкле Цімафееў, забраў партызанскага камбрыга І.П.Ціткова і яго намесніка А.В.Склярэнку і адвёз іх у Будзілаўку. Там ужо знаходзілася ахова з двух бакоў. У адной з хат за сталом сядзеў Радзіёнаў. Шапяткоўскі прымасціўся каля печы. Цімафееў застаўся каля расчыненых дзвярэй. Там жа прысеў і Арлоў. Радзіёнаў падняўся, падаў руку Ціткову, Склярэнку і С.М.Табачнікаву (узначальваў партызанскі патруль на гэтых перагаворах).

Хутка ўсё абмеркавалі і прыйшлі да наступнага. 1-я Руская нацыянальная брыгада захоўваецца як баявое партызанскае фарміраванне пад камандай падпалкоўніка У.У.Гіль-Радзіёнава. Увесь камандны састаў застаецца на сваіх месцах.

Пасля гэтага Радзіёнаў дастаў з палявой сумкі загадзя надрукаваны тэкст і пачаў чытаць услых:

— Загад часцям 1-й Рускай нацыянальнай брыгады.

Існаванне нацыянальнай брыгады мела на мэце збіранне рускіх узброеных сіл для далейшай барацьбы за Радзіму, для ўсямернай перашкоды і недапушчэння чынгісханаўскай палітыкі закабалення народа.

Нягледзячы на працяглае існаванне першапачатковай малалікай «дружыны», з красавіка 1942 г. нямецкае камандаванне, баючыся рускіх нацыянальных сіл, на далейшае іх павелічэнне не ідзе, імкнучыся ператварыць існуючыя падраздзяленні і часці ў паслухмяную зброю для закабалення рускага народа.

Усе спробы нашай брыгады збоку перашкодзіць нямецкім фрыцам у спальванні сёл і знішчэнні рускага народа поспеху не мелі. Даючы абяцанні, фашысцкія каты ўвесь час праводзілі свае крывавыя расправы над бязвінным і бяззбройным мірным насельніцтвам.

Гітлераўскія бандыты, несучы смерць і знішчэнне ўсім народам, праводзяць расправы над рускім насельніцтвам. Рэальнасць паказала, што ні аб якой «Новай Расіі» немцы не думаюць. У імя выратавання Радзімы ад закабалення яе фашысцкімі захопнікамі

Загадваю:

1. З гэтага чысла брыгаду іменаваць Першай Рускай антыфашысцкай брыгадай.

2. Стаўлю ў абавязак кожнаму воіну брыгады бязлітасна знішчаць фрыцаў да поўнага іх выгнання з рускай зямлі.

3. З гэтага чысла прывітанне «Хайль Гітлер» адмяніць, вітаць прыкладаннем рукі да галаўнога ўбору.

4. Усе фашысцкія знакі — свастыкі, чарапы і іншыя — адмяніць.

5. Віншую афіцэраў і салдат з далучэннем да святой барацьбы за нашу вялікую Радзіму. Слава рускаму народу.

Камандзір 1-й Рускай антыфашысцкай брыгады падпалкоўнік Радзіёнаў.

Партызаны, прачытаўшы гэты загад, прапанавалі даць у Маскву радыёграму за подпісамі Ціткова і Радзіёнава. Камандзір «дружыны» адразу пагадзіўся. Толькі ўдакладніў, каму радыёграма: Сталіну? Жалезнякоўцы заўважылі, што П.К.Панамарэнку, а той ужо паведаміць І.В.Сталіну. І Ціткоў адразу ж склаў тэкст:

«Масква. ЦК Кампартыі Беларусі.

Панамарэнку.

Пасля сустрэчы з камандзірам брыгады «Жалязняк» аб'яўляю злучэнне партызан-

скім, распачынаю дзеянні. Напрамак: Докшыцы, Крулеўшчына, Глыбокае, Лужкі. Немцы, генерал Багданаў і іншыя агенты выведзены. Прашу вашых указанняў.

Ціткоў, Радзіёнаў».

Тэкст радыёграмы павезлі радысту ў в. Вялікае Поле. А камандзіры працягвалі абмяркоўваць дэталі. Партызаны патрабавалі перадаць ім генерала Багданава, кіраўнікоў Бягомльскай раённай управы. Прапанавалі адкамандзіраваць у брыгаду «Жалязняк» заштатных афіцэраў на камандныя пасады. І тут была таксама дасягнута згода.

У той жа дзень Радзіёнаў абвясціў усяму асабоваму саставу пра пераход на бок партызан. Салдаты і афіцэры сустрэлі гэту вестку крыкамі «Ура! Ура!»

Пакуль Радзіёнаў выступаў перад строем, арыштавалі генерала Багданава, палкоўніка Святаполк-Мірскага, 40 афіцэраў-белаэмігрантаў, кіраўнікоў Бягомльскай управы. Праз 2 дні ўсіх іх адправілі самалётам за лінію фронту.

Сярод арыштаваных не аказалася ніводнага немца. Выявілася, што іх загадаў павесіць у туалеце начальнік штаба маёр Блажэвіч. Агент СД і гестапа, ён баяўся, што, застаўшыся ў жывых, яны могуць выкрыць яго перад партызанамі.

Першай партызанскай аперацыяй «дружыны» супраць немцаў стаў напад на гарнізон у Крулеўшыне. Вораг ужо меў нейкія сумненні: з брыгады паспелі ўцячы многія паліцэйскія, нямецкія памагатыя. Ад іх фашысты даведаліся, што ў «дружыне» нешта адбылося. Каб увесці акупантаў у зман, Радзіёнаў загадаў расчахліць і разгарнуць палкавыя сцягі са свастыкай. Немцы як быццам супакоіліся і даволі блізка падпусцілі «дружыннікаў». Пакуль яны зразумелі, што радзіёнаўцы ідуць на штурм, час быў страчаны. Пачаўся гарачы бой. Вакзал тройчы пераходзіў з рук у рукі. Гітлераўцы пусцілі танкі і мотапяхоту. Адзін з палкоў «дружыны» не вытрымаў і пачаў адыходзіць. Тады Радзіёнаў, падняўшы ўгору аўтамат, сам павёў яго ў атаку... Брыгада перамагла. Знішчылі каля 600 немцаў. Узялі шмат палонных, безліч трафеяў.

Праз некалькі дзён з Масквы прыйшлі 2 радыёграмы. Першая — Ціткову і Манковічу:

«Віншую з вялікім поспехам па разлажэнні і арганізацыі пераходу злучэння Радзёнава. Аб'яўляю падзяку.

П.Панамарэнка».

І другая — Радзёнаву:

«Віншую з пераходам на бок партызан для актыўных дзеянняў супраць нямецкіх захопнікаў. Зацвярджаю найменне брыгады «Першая антыфашысцкая», зацвярджаю Вас камандзірам...

П.Панамарэнка».

На баку партызан брыгада У.У.Гіль-Радзіёнава правяла нямала паспяховых баявых аперацый супраць фашыстаў. А вясной 1944 г. на Ушаччыне радзіёнаўцы трапілі ў блакаду і панеслі вялікія страты. Тады ж 14.5.1944 г. загінуў і сам камбрыг...

*С.М.Табачнікаў, В.І.Скарахоd.*

## Дакументы сведчаць

**ПОСТАНОВЛЕНИЕ ЦК КП(б)Б**
**О 1-й антифашистской бригаде**

**26.VIII.43 г.**

1. Принять к сведению сообщение товарища Пономаренко о том, что 16 августа с.г. бригада Родионова (из т.н. «русской освободительной армии») численностью 2800 человек перешла на партизанские действия и, истребив немецких представителей, совместно с бригадой «Железняк» разгромили гарнизоны противника в Докшицах, Крулевщизне, Парафьяново. Арестованы и направлены в распоряжение советских властей: изменник, бывший генерал-майор, Богданов — начальник контрразведки соединения; белогвардеец, полковник Мирский и другие.

2. Отметить большую работу, проведенную по заданию Центрального Комитета КП(б) Белоруссии бригадой «Железняк» под командованием т. Титкова и Бегомльским райкомом партии (секретарь т. Манкович) по организации перехода на сторону партизан бойцов и командиров соединения Родионова.

3. Направить Члена ЦК КП(б)Б т. Ганенко, секретаря Минского обкома КП(б)Б т. Мачульского и 2—3 чекистских работников, по усмотрению т. Цанава, в район Бегомль, поручив им принять меры:

а) по дальнейшему разложению немецких формирований;

б) проведению в бригаде необходимой работы и очищению ее от агентуры гестапо;

в) усилению активных действий партизанских отрядов и бригад в районах Бегомль, Борисов, Плещеницы, Логойск.

4. В связи с тем, что в письме товарища Пономаренко от имени Центрального штаба партизанского движения командиру Первой антифашистской бригады исчерпаны все основные политические и практические указания, дополнительно письма ЦК КП(б)Б не направлять.

5. Поручить т. Ганенко выделить для бригады рацию.

6. Отделу пропаганды и агитации ЦК КП(б)Б организовать издание газеты в бригаде, подобрать квалифицированного редактора и представить его на утверждение ЦК. Разработать краткие указания о задачах работы газеты на ближайший период, направить для бойцов и командиров бригады центральные и республиканские газеты, политическую и художественную литературу. Разработать специальную листовку к советским гражданам, загнанным в антисоветские формирования.

7. После подробного сообщения тт. Ганенко и Мачульского принять дополнительное решение, связанное с направлением в бригаду политических работников.

8. Поручить Оргинструкторскому отделу ЦК КП(б)Б внести на бюро проект директивы-информации, освещающий факт перехода на сторону партизан соединения Родионова, обязывающие подпольные партийные органы, командиров и комиссаров отрядов и бригад всемерно усилить работу по разложению формирований противника.

Подпись Пономаренко.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4. воп. 3, спр. 1245, л. 148.*

## РАДЫЁГРАМА САКРАТАРА ЦК КП(б)Б, НАЧАЛЬНІКА ЦШПР П.К.ПАНАМАРЭНКІ КАМАНДЗІРУ 1-й АНТЫФАШЫСЦКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ У.У.ГІЛЬ-РАДЗІЁНАВУ

**17 верасня 1943 г.**

Правительство Советского Союза наградило Вас орденом Красной Звезды за мужественное и умелое руководство работой по возвращению наших бойцов и командиров, попавших в лапы кровавым захватчикам, в ряды защитников Советской Родины, за смелый и решительный переход к партизанским действиям.

Правительственная награда обязывает Вас к еще более активной борьбе против немецких захватчиков.

Поздравляю Вас с правительственной наградой.

Секретарь ЦК КП(б)Б. Начальник Центрального штаба партизанского движения генерал-лейтенант П.Пономаренко.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 23, спр. 37, л. 256.*

## З ПАЛІТЫЧНАЙ СПРАВАЗДАЧЫ 1-й АНТЫФАШЫСЦКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ЗА ПЕРШУЮ ПАЛОВУ КАСТРЫЧНІКА 1943 г.

**22 кастрычніка 1943 г.**

Численный состав бригады 1503 человека. Командного состава 106 чел., политсостава 24 чел. Агитаторов по бригаде 48 человек.

В бригаде имеется боевых отрядов — 8, учебно-резервный батальон, санчасть, группа снабжения, комендантский взвод, группа связи.

В бригаде издается газета «За Советскую Родину» и выпускаются листовки с оперсводками Совинформбюро. За первую половину октября месяца выпущено 2 номера газеты общим тиражом 400 экз.

В каждом боевом отряде выпускаются отрядные стенгазеты, а по взводам боевые листки.

Перед боевой операцией политработниками проводятся беседы на темы героических подвигов героев-партизан, Красной Армии и о героическом прошлом русского народа.

Численное изменение в бригаде: убито 41 чел., пропало без вести 6 чел., демобилизовано домой один человек.

Моральное состояние партизан и населения высокое. Партизаны и население представляют одно единое.

Единичные случаи мародерства имели место в комендантском взводе, после чего мародеры понесли наказание, и на этом факте заострено внимание всего личного состава путем проведения бесед. Всем командирам и комиссарам отрядов и отдельных групп дано указание... в корне пресекать малейшее проявление фактов мародерства, хулиганства и дебоширства.

Комиссар 1-й Антифашистской партизанской бригады старший политрук Тимчук.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 33-а, спр. 277, л. 384—385.*

### РАДЫЁГРАМА КАМАНДЗІРА 1-й АНТЫФАШЫСЦКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ У.У.ГІЛЬ-РАДЗІЁНАВА САКРАТАРУ ЦК КП(б)Б, НАЧАЛЬНІКУ ЦЭНТРАЛЬНАГА ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ П.К.ПАНАМАРЭНКУ

**25 кастрычніка 1943 г.**

Ваше письмо от 1 октября доведено до сведения всего состава бригады, оно вызвало огромный порыв к борьбе за окончательное освобождение нашей великой Родины от фашистских людоедов. Бригада готова к выполнению любого задания партии и правительства, каждый воин бригады считает своей священной обязанностью беспощадно истреблять фашистских варваров до полного изгнания их с нашей земли.

Высокая правительственная награда — награждение меня орденом Красной Звезды и ряда партизан медалями «Партизану Отечественной войны» 1-й и 2-й степени — еще больше укрепили нашу волю к борьбе и победе над кровавым врагом.

Да здравствует наша великая Родина, партия большевиков и ее вождь великий Сталин!

Радионов.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 23, спр. 21, л. 63.*

*Выявіў і падрыхтаваў да друку У.І.Лемяшонак.*

## Партызанскія біяграфіі

**БАСКАКАЎ Аляксей Андрэевіч.** Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці. Нарадзіўся 11.2.1923 г. ў в. Саннікава Канакоўскага раёна Цвярской вобласці, Расія. Напярэдадні вайны працаваў у раённай пракуратуры Цвярской вобласці. З чэрвеня 1941 г. камандзір камсамольска-маладзёжнага батальёна абарончага будаўніцтва. У ліпені 1942 г. — маі 1943 г. камандзір партызанскай брыгады імя У.І.Леніна. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Загінуў у баі 19.5.1943 г.

**БІРУКОЎ Леанід Паўлавіч.** Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся 18.2.1919 г. ў в. Нова-Быкава Чарнігаўскай вобласці, Украіна. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1941). У 1942 г. камандзір падраздзялення на Асобым беларускім зборы. У верасні 1942 г. накіраваны ў тыл ворага, камандзір арганізатарскай групы. З кастрычніка 1942 г. начальнік штаба, з 7.6.1944 г. в.а. камандзіра партызанскай брыгады «Жалязняк». З 1944 г. на адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце ў Беларусі, Расіі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, 8 медалямі. Ганаровы грамадзянін г.п. Бягомль. Памёр 1.10.1993 г.

**ГАРБАЦЕНКАЎ Максім Трыфанавіч.** Адзін з кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай і Вілейскай абласцях у Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся 6.7.1915 г. ў в. Вялікія Хутары Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1955), ВПШ пры ЦК КПСС (1958). З 1933 г. на савецкай рабоце. Напярэдадні вайны загадчык Докшыцкага райфінаддзела. У партызанах з лютага 1942; камандзір дыверсійнага атрада, у лютым—маі 1943 г. камісар, у маі 1943 г. — ліпені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады імя У.І.Леніна, адначасова член, з сакавіка 1944 г. сакратар Докшыцкага падпольнага РК КП(б)Б. У 1944—77 гг. на партыйнай і савецкай рабоце. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, 5 іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр 13.3.1981 г.


Л.П.Бірукоў.


М.Т.Гарбаценкаў.


Ф.І.Дзернушкоў.


Р.А.Дзякаў.

**ГІЛЬ-РАДЗІЁНАЎ Уладзімір Уладзіміравіч**. Адзін з кіраўнікоў партызанскай барацьбы (жнівень 1943 — май 1944). Нарадзіўся 18.7.1906 г. ў в. Дараганава Асіповіцкага раёна. У 1939 г. скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе, падпалкоўнік. У 1941 г. начальнік штаба 229-й стралковай дывізіі на фронце, паранены трапіў у палон. З 1942 г. па 15.8.1943 г. быў камандзірам «дружыны», палка, брыгады «Рускай нацыянальнай народнай арміі», створанай нямецка-фашысцкімі захопнікамі з ліку ваеннапалонных. Падрыхтаваў і арганізаваў пераход 16.8.1943 г. гэтага фарміравання ў поўным складзе на бок партызан. Фарміраванне атрымала назву 1-й Антыфашысцкай партызанскай брыгады і адразу ўключылася ва ўпартыя баі з гітлераўцамі, у т.л. па разгроме буйных нямецка-фашысцкіх гарнізонаў. 16.9.1943 г. ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, яму прысвоена воінскае званне палкоўніка. У красавіку—маі 1944 г. ў цяжкіх баях пры адбіцці карнай аперацыі «Веснавое свята» ў ходзе Полацка-Лепельскай бітвы 1944 г. брыгада панесла вялікія страты (1026 чалавек), У.У.Гіль-Радзіёнаў быў смяротна паранены і 14.5.1944 памёр.

**ДЗЕРНУШКОЎ Феафан Ігнатавіч**. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся 28.9(11.10).1914 г. ў в. Краснае Сяло Сенненскага павета Магілёўскай губерні. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1948), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1961). У 1933—41 гг. на савецкай і камсамольскай рабоце. З мая 1942 г. ў тыле ворага — намеснік камісара партызанскай брыгады, сакратар падпольнага Бягомльскага РК ЛКСМБ. З кастрычніка 1943 г. камісар партызанскай брыгады «Жалязняк» Мінскай вобласці, адначасова сакратар Бягомльскага падпольнага райкома КП(б)Б. У 1944—59 гг. на партыйнай рабоце ў Мінскай вобласці. Узнагароджаны 3 ордэнамі, медалямі.

**ДЗЯКАЎ Раман Апалонавіч**. Удзельнік і арганізатар партызанскага руху на тэрыторыі Докшыцкага раёна ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся ў 1910 г. ў в. Пярхушава Валагодскай вобласці. З лютага 1942 г. да верасня 1942 г. камандзір партызанскага атрада Рамана Дзякава. З верасня 1942 г. да кастрычніка 1942 г. камандзір партызанскай брыгады «Жалязняк». З кастрычніка 1942 г. да снежня 1942 г. намеснік камандзіра партызанскай брыгады «Жалязняк». У снежні 1942 г. быў адкліканы за лінію фронту і накіраваны камандзірам спецатрада №550. Пасля вайны працаваў у органах Міністэрства ўнутраных спраў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**ІВАНОЎ Іван Аўксенцьевіч**. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Вілейскай вобласці. Нарадзіўся 25.11.1910 г. ў г.п. Відзы Браслаўскага раёна. З 1928 г. рабочы. За рэвалюцыйную дзейнасць у Заходняй Беларусі зняволены польскімі ўладамі ў турму (1936—39). З 1940 г. працаваў у Відзаўскім райвыканкоме. У партызанах з чэрвеня 1942 г.: камандзір групы, узвода, з сакавіка 1943 г. камісар атрада, у кастрычніку 1943 г. — ліпені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады імя Л.М.Даватара. У 1944—75 гг. на савецкай і гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі.

**ЛАЗАБЕЕЎ Рыгор Яфімавіч**. Адзін з арганізатараў партызанскага руху на Бягомльшчыне ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся ў 1913 г. ў в. Клімаўка Гомельскага раёна. З 1936 г. працаваў у органах міліцыі Бягомльскага раёна. Да ліпеня 1942 г. ў партызанскім атрадзе «Барацьба», у ліпені 1942 г. — чэрвені 1943 г. ў партызанскім атрадзе «Мясцовыя» (спецатрад НКДБ СССР), потым з 4.6.1943 г. ў асобым атрадзе Разведупраўлення Чырвонай Арміі Заходняга фронту імя Калініна, начальнік асобага аддзела брыгады. Пасля вайны начальнік міліцыі Дунілавіцкага, у 1951—54 гг. — Докшыцкага раёнаў. Аўтар кнігі ўспамінаў «Лясныя пабрацімы» (Мінск, 1972). Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр у 1973 г.

**ЛАПАЦІН Пётр Рыгоравіч**. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай і Віцебскай абласцях, Герой Савецкага Саюза (1944). Нарадзіўся 5.1.1907 г. ў в. Ізлягошча Усманскага раёна Ліпецкай вобласці. З 1936 г. працаваў на чыгуначнай станцыі Мінск. З 1941 г. камандзір аддзялення, узвода партызанскага атрада спецыяльнага прызначэння «Міця», які дзейнічаў на чале з Дз.М.Мядзведзевым на тэрыторыі Магілёўскай, Смаленскай і Арлоўскай абласцей. З сакавіка 1942 г. кіраўнік партызанскай спецыяльнай разведвальна-дыверсійнай групы НКДБ СССР «Бывалыя», са жніўня 1942 г. да чэрвеня 1944 г. камандзір партызанскай брыгады «Дзядзькі Колі». З 1944 г. намеснік старшыні Барысаўскага гарвыканкома, на гаспадарчай рабоце. Яго імем названа Ганцавіцкая сярэдняя школа ў Барысаўскім раёне, вуліца ў Барысаве. Памёр 9.7.1974 г.

**МАНКОВІЧ Сцяпан Сцяпанавіч**. Герой Савецкага Саюза (1944). Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся 13.5.1905 г. ў в. Беразіно Докшыцкага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыў ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1946). З 1929 г. на савецкай і гаспадарчай рабоце, з 1939 г. сакратар Бягомльскага райкома КП(б)Б. У ліпені 1941 г. пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы. З сакавіка 1942 г. ў партызанах, з красавіка 1942 г. камісар атрада, у верасні 1942 г. — снежні 1943 г. — партызанскай брыгады «Жалязняк», адначасова са жніўня 1942 г. да снежня 1943 г. сакратар Бягомльскага падпольнага райкома КП(б)Б. Пасля вайны на савецкай і партыйнай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 2-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр 18.4.1978 г. Яго імем названы вуліца ў г.п. Бягомль, школа на радзіме, перад школай пастаўлены бюст.

### З успамінаў С.С.Манковіча

В ночь на 3 июля 1941 г. в Бегомль ворвались вражеские войска. С группой товарищей я ушел в деревню Бедино. Вскоре переселились в Федорки. Некоторое время вместе со мной находились инструктор Бегомльского райкома КП(б)Б Семен Филиппович Керко и секретарь райисполкома Петр Семенович Рутковский, потом мы разошлись по деревням. Семен Керко направился в Недальский, Петр Рутковский — в Глинский, а я — в Кадлубищенский сельсоветы. Определяли, на кого можно опереться, нацеливали надежных людей на сбор оружия и создание законспирированных групп.

Фашисты схватили С.Ф.Керко. За антигитлеровскую агитацию, сбор и хранение оружия его вместе с отцом расстреляли. Задержали и П.С.Рутковского. Но ему при содействии местных жителей удалось освободиться. Мой арест предотвратил Л.А.Янковский из Федорков. Перед войной его направили на работу в один из западных районов Белоруссии. Там он вступил кандидатом в члены партии, но в родной деревне об этом никто не знал. Земляки обманули оккупантов: сказали, что Янковский — кулак и сидел в тюрьме. Его назначили старостой. Как-то на совещании в Бегомле Леон Антонович узнал, что гитлеровцам дано задание разыскать и арестовать Манковича. Он сразу же предупредил меня об этом.

В августе 1941 г. мы перенесли свою базу на территорию Домжерицкого сельского Совета. Там до войны имелась партийная организация. В Домжерицах я наладил связь со многими патриотами, в том числе с коммунистом Михаилом Кульбой и Григорием Хацкевичем.

В сентябре 1941 г. в доме Михаила Лукьяновича Кульбы состоялось первое в условиях подполья партийное собрание. Всего присутствовало 11 человек. Договорились о сборе оружия, разъяснительной работе среди населения, засылке в учреждения противника верных советской власти людей.

Коммунисты начали создавать подпольные группы, вооружались, вели разъяснительную

работу и готовились к партизанской борьбе. Одну такую группу в деревне Березки возглавил участник I Всесоюзного съезда колхозников-ударников Франц Викентьевич Гуринович.

В пяти волостных управах работали подпольщики. Например, в Домжерицкой волости почти весь аппарат состоял из патриотов, от которых мы получали точные сведения о действиях оккупантов. Старостой Березковской волости являлся коммунист Илья Клементьевич Насенник.

Бесстрашной патриоткой показала себя Ольга Стрельчонок. Она установила связь со служащими паспортного стола в Бегомле, получала от них бланки паспортов и удостоверений. Когда создали партизанский отряд, Ольга помогла вступить в него красноармейцам, вырвавшимся из плена, приносила разведданные. В марте 1942 г. гитлеровцы выследили эту патриотку и расстреляли.

Наши связные вели агитационную работу среди населения, рассказывали о событиях на фронтах и в тылу врага. Мы обеспечивали их материалами, которые принимали по радио. Приемник находился в тайнике у бывшего директора школы в деревне Переходцы Григория Васильца. В октябре 1941 г. фашисты схватили его и расстреляли.

Сначала мы размножали сводки Совинформбюро от руки. В конце 1941 г. раздобыли пишущую машинку. В распространении листовок активно участвовали Татьяна Вашкевич — секретарь Домжерицкой комсомольской организации, Михаил Буяльский, Антон Хацкевич и Иван Хацкевич, Сергей Каминский, Иван Автушко из деревень Кветча, Домжерицы, Королино и Савский Бор, Яков Шевцов — руководитель комсомольской группы в Бегомле.

В ноябре 1941 г. И.М.Вашкевич, хозяин явочной квартиры, обнаружил в лесу у деревни Броды советские газеты и листовки, видимо, сброшенные нашим самолетом. Радостный и взволнованный, он сообщил подпольщикам о находке. Вести с Большой земли окрыляли. Патриоты распространили издания в населенных пунктах.

В декабре 1941 г. по инициативе наших коммунистов и военнослужащих, попавших в окружение, организуется отряд «Романа» (по имени командира Романа Аполлоновича Дьякова). Но всю зиму действовали группами. Они уничтожали линии связи, устраивали засады на дорогах, сжигали мосты. Партизанская группа сержанта И.В.Жаворонкова на мосту через реку Бузянка подорвала легковую и грузовую машины, уничтожила 11 вражеских солдат и офицеров. Группа В.А.Астапковича дважды разрушала небольшой мост на дороге Парафьяново—Лепель, а группа Р.А.Дьякова вывела из строя шлюзы на Сергучевском канале.

Скрывавшиеся в деревнях военнослужащие П.Г.Шильников, Я.А.Бутюгин, И.А.Кулешов, Н.К.Долженков, а также местные жители Юрий и Иван Хацкевичи, Петр Шаман, Владимир Белый и другие собирали вокруг себя патриотов для проведения диверсий на коммуникациях противника, разыскивали оружие. Многие из них погибли от рук гитлеровских палачей: Михаил Кульба, Иль Буяльский, Юрий и Иван Хацкевичи, Владимир Белый, Викентий Астапкович, Григорий Хацкевич, Леон Янковский.

В апреле 1942 г. отряд «Романа» воссоздан. Меня избрали комиссаром.

В это время из-за линии фронта сюда прибыл отряд И.М.Кузина, который имел рацию. Мы воспользовались ею и передали на Большую землю, что на Бегомльщине действует партизанский отряд «Романа». С И.М.Кузиным договорились о проведении совместных боевых операций против оккупантов. Первый удар решили нанести по вражескому опорному пункту в Домжерицах. Ни одному гитлеровцу не удалось спастись. Народные мстители расправились также с начальником домжерицкой полиции и его заместителем, которые находились в другом доме.

После этих операций партизан оккупанты ликвидировали свои гарнизоны и полицейские участки во многих деревнях. Оставили только в Мстиже, Березино и Бегомле. Правда, враг не раз на протяжении лета 1942 г. совершал оттуда бандитские налеты на населенные пункты. Мы не всегда могли давать решительный отпор карателям из-за недостатка боеприпасов.

В мае 1942 г. к нам прибыл довоенный секретарь Бегомльского РК ЛКСМБ Ф.И.Дернушков. Он доставил директивы руководящих органов о задачах партийных и комсомольских организаций в тылу врага.

В августе 1942 г. ЦК КП(б)Б утвердил состав Бегомльского подпольного райкома партии. Секретарем стал я, а членами райкома — С.В.Борздыко, Ф.И.Дернушков, А.Е.Чернов, С.Я.Мальчик, Г.В.Шараев, а в



С.С.Манковіч.



М.Р.Пучкароў.

июле 1943 г. и А.Н.Костеневич — редактор газеты «Советский патриот».

К сентябрю 1942 г. наш отряд значительно вырос. Его разделили на два и на их базе создали бригаду «Железняк».

*Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Партийное подполье в Белоруссии, 1941—1944: Страницы воспоминаний. Минская область и Минск. Мн., 1985. С. 307—310.*

**МАЧУЛЬСКІ Раман Навумавіч**. Партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі. Герой Савецкага Саюза (1944). Заслужаны работнік культуры БССР (1980). Нарадзіўся 30.11.1903 г. ў в. Крываносы Старадарожскага раёна. Скончыў Рэспубліканскую школу прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б (1937). З 1937 г. на партыйнай рабоце ў Грэску, Чэрвені, Плешчаніцах. У Вялікую Айчынную вайну ў тыле ворага, упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па Мінскай і Палескай абласцях, сакратар Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б, у кастрычніку 1942 г. — маі 1943 г. в.а. камандзіра Мінскага партызанскага злучэння, з жніўня 1943 г. камандзір партызанскага злучэння Барысаўска-Бягомльскай зоны. Пасля вайны на савецкай і партыйнай рабоце, з 1950 г. 1-ы сакратар Пінскага абкома КПБ, у 1954—59 гг. старшыня Брэсцкага аблвыканкома. Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у 1947—51 гг. Аўтар мемуараў «Старонкі бессмяротнасці» (1972), «Людзі высокага абавязку» (1975), «Вечны агонь» (3-е выд., 1978), «На вогненнай зямлі» (1983). Памёр 26.4.1990 г.

**МЯДЗВЕДЗЕЎ Анатоль Данілавіч**. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Вілейскай вобласці. Нарадзіўся 4.3.1907 г. ў в. Цюмінёўка Балашоўскага раёна Саратаўскай вобласці, Расія. Скончыў Варонежскі хіміка-тэхналагічны інстытут (1934). Працаваў у харчовай прамысловасці. Са снежня 1941 г. на Калінінскім фронце. У партызанах з красавіка 1942 г.: камандзір групы, роты, з ліпеня 1942 г. начальнік штаба Асвейскай партызанскай брыгады імя М.В.Фрунзе, камандзір атрада, з кастрычніка 1942 г. батальёна, аб'яднаўшага групу атрадаў, у сакавіку 1943 г. — чэрвені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады імя ЦК КП(б)Б, адначасова член Докшыцкага падпольнага РК КП(б)Б. У 1945—74 гг. працаваў у сістэме прамысловага будаўніцтва ў г. Чымкент, Казахстан. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі. Памёр 6.4.1980 г.

**НІКІЦІН Мікалай Міхайлавіч**. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці. Нарадзіўся 24.12.1907 г. ў г. Смаргонь. Скончыў Арлоўскую аўтабранятанкавую школу (1928). У 1920-я г. рабочы мінскага завода «Камунар». З 1932 г. на камандных пасадах у Кіеўскай і Беларускай ваенных акругах. У 1941 г. ўдзельнічаў у абароне Гомеля. Са студзеня 1942 г. ўдзельнік Мінскага патрыятычнага падполля, па заданні якога ў сакавіку—маі 1942 г. аб'яднаў асобныя партызанскія групы ў атрад. З мая 1942 г. камандзір атрада, у ліпені—лістападзе 1942 г. — партызанскай брыгады М.М.Нікіціна. Памёр 3.6.1957 г.

**ПЕТРАКОЎ Андрэй Іванавіч**. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці. Нарадзіўся 23.12.1910 г. ў Маскве. Скончыў Кіеўскі будаўнічы інстытут (1937). Працаваў інжынерам-канструктарам, брыгадзірам, галоўным інжынерам праекта Праектнай канторы ў Маскве. У Вялікую Айчынную вайну на Калінінскім фронце — камандзір атрада асобага прызначэння. У ліпені—верасні 1942 г. камандзір партызанскай брыгады імя К.К.Ракасоўскага. З 1946 г. галоўны інжынер праекта, начальнік аддзела праектнага інстытута ў Маскве. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 іншымі ордэнамі, медалямі.

**ПУЧКАРОЎ Мікалай Рыгоравіч**. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Вілейскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся 2.3.1913 г. ў в. Галі Шумілінскага раёна. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1953). З 1938 г. на савецкай рабоце ў Сіроцінскім раёне. У ліпені 1941 г. пакінуты ў тыле ворага. У партызанах з красавіка 1942 г.: радавы, палітрук узвода, роты, інструктар Сіроцінскага падпольнага РК КП(б)Б, у верасні 1941 г. — чэрвені 1944

г. камісар, адначасова ў верасні—кастрычніку 1943 г. в.а. камандзіра партызанскай брыгады імя ЦК КП(б)Б, у чэрвені—ліпені 1944 г. камісар партызанскай брыгады дыверсійнай Беларускай імя У.І.Леніна, адначасова член, у чэрвені 1944 г. сакратар Докшыцкага падпольнага РК КП(б)Б. З 1944 г. на партыйнай і адм.-гаспадарчай рабоце ў Полацкай і Віцебскай абласцях. Памёр 17.10.1975 г.

**РАМАНАЎ Аляксандр Васілевіч**. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай і Вілейскай абласцях. Нарадзіўся 25.6.1918 г. ў в. Максакава Чарапавецкага раёна Валагодскай вобласці, Расія. Скончыў ваенна-палітычнае вучылішча (1941), ВПШ пры ЦК КПСС (1956). З чэрвеня 1941 г. на Паўднёвым фронце. З кастрычніка 1941 г. камандзір узвода, камісар 17-га партызанскага атрада асобага прызначэння, у ліпені 1942 г. — сакавіку 1943 г. камісар, у лістападзе 1942 г. — сакавіку 1943 г. в.а. камандзіра, у сакавіку 1943 г. — ліпені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады імя К.К.Ракасоўскага, адначасова член Дунілавіцкага падпольнага РК КП(б)Б. Да 1978 г. на партыйнай і савецкай рабоце ў Маладзечанскай і Мінскай абласцях. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 іншымі ордэнамі. Аўтар кнігі «На зямлі непакоранай» (1962).

**ТАБАЧНІКАЎ Сяргей Міхайлавіч**. Нарадзіўся 20.10.1920 г. ў Магілёве. У 1928—39 гг. вучыўся ў сярэдняй школе і на рабфаку. Скончыў Ленінградскае ваеннае вучылішча (1941), Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1948), БДУ (1952). У час Вялікай Айчыннай вайны з лістапада 1941 г. камандзір узвода асобнага лыжнага батальёна. У верасні 1942 г. ў складзе дыверсійнай групы накіраваны ў тыл ворага ў Бягомльскі раён. У лістападзе 1942 г. — чэрвені 1944 г. начальнік штаба 3-га, 1-га атрадаў, потым намеснік начальніка штаба партызанскай брыгады «Жалязняк». Пасля вайны працаваў у Бягомльскім РК КП(б)Б. З 1948 г. ў органах дзяржбяспекі. У 1954—59 гг. і 1964—70 гг. служыў у ГДР. У 1959—64 гг. і 1970—73 гг. у КДБ БССР. З 1974 г. вучоны сакратар НДІ эканомікі і матэматычных даследаванняў Дзяржплана БССР, у 1980—87 гг. начальнік аддзела Мінскага аблсавета. Палкоўнік (1946). Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1-й ступені, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам ГДР, 18 медалямі, у т.л. 6 медалямі ГДР, знакам «Ганаровы супрацоўнік КДБ СССР». Жыве ў Мінску.



С.М.Табачнікаў.



А.Ф.Фрол.



І.П.Шіткоў.

**ФРОЛ Андрэй Фёдаравіч**. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху ў Докшыцкім раёне ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся ў 1915 г. ў в. Нябышына. З 20 ліпеня 1941 г. да 8 верасня 1942 г. з'яўляўся кіраўніком Нябышынскай падпольнай партыйна-камсамольскай групы. У 1942—44 гг. у партызанскай брыгадзе «Жалязняк». З лістапада 1942 г. сакратар Бягомльскага падпольнага РК ЛКСМБ, намеснік камісара брыгады «Жалязняк» па камсамольскай рабоце, з 1944—46 гг. — 1-ы сакратар Бягомльскага РК ЛКСМБ. Пасля вайны працаваў загадчыкам аддзела культуры Бягомльскага райвыканкама, у Бягомльскім лясгасе. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага сцяга, медалямі. Памёр у 2001 г.

**ЦІТКОЎ Іван Піліпавіч**. Герой Савецкага Саюза (1944). Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў

Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся 27.8.1912 г. ў с. Слабада Бялёўскага раёна Тульскай вобласці (Расія) у сялянскай сям'і. Скончыў Тульскі будаўнічы тэхнікум (1931), ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1950), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1953). У Чырвонай Арміі ў 1934—1936 гг. і з 1939 г. З чэрвеня 1941 г. на фронце. У чэрвені 1942 г. капітан І.П.Ціткоў накіраваны ў варожы тыл. У кастрычніку 1942 г. — чэрвені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады «Жалязняк». У 1945—1972 гг. на партыйнай і гаспадарчай рабоце. Аўтар кнігі «Брыгада «Жалязняк» (2 выд., 1982). Памёр 23.7.1982 г. Яго імем названа вуліца ў г.п. Бягомль.

## Камбрыг брыгады «Жалязняк»

Біяграфія Івана Піліпавіча Ціткова — багатая. Паловы яе іншаму хапіла б на два жыцці. На Магнітцы кляпаў каупера самай першай домны яшчэ ў 1930-м. Падымаў з руін Беларусь. Будаваў сочынскія палацы, тульскія жылыя дамы і цэлыя кварталы на Мангышлаку, нафтахімічныя прадпрыемствы Гур'ева. Вядома ж — будаўнік па прафесіі.

Хоць будаўнічая біяграфія І.П.Ціткова вымяралася 38-ю гадамі, былі ў яго свядомым жыцці два з паловай гады, цяжкіх, партызанскіх.

Першы бой Ціткоў прыняў недалёка ад заходняй граніцы ў складзе 11-га механізаванага корпуса. Паколькі на баку ворага была перавага ў сіле, корпус вымушаны быў адыходзіць. Іван Піліпавіч камандаваў ар'ергардам. На пяты дзень корпус апынуўся пад Мінскам і трапіў у акружэнне. Лейтэнант Ціткоў арганізаваў групу прарыву. Разведкай намацаў зручнае месца і вывеў без страт 700 чалавек. Вышэйшае камандаванне прызначыла яго пасля гэтага камандзірам разведатрада 30-й арміі, а неўзабаве яго накіравалі ў танкавую брыгаду. Пад Ржэвам быў цяжка паранены.

А ў гэты час Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР) прыступіў да стварэння груп і атрадаў для засылкі ў варожы тыл. Ціткова ўзялі ў склад адной з такіх груп па той прычыне, што меў ужо баявы вопыт і з 1939 г. служыў на тэрыторыі Беларусі. Як вылечыўся ад ранення, яго паклікалі ў ЦШПР на гутарку з П.К.Панамарэнкам. Сакратар ЦК КП(б)Б прапанаваў Івану Піліпавічу Бягомльскі раён як месца яго будучых баявых дзеянняў.

Група Ціткова праз «Суражскія вароты» пераадолела лінію фронту. Пры пераходзе чыгункі Полацк—Віцебск сутыкнуліся з немцамі і ўступілі ў першы бой. Не робячы адпачынку, накіраваліся і прыйшлі на Бягомльшчыну. З групай прыбыў у нямецкі тыл і сакратар Барысаўскага падпольнага міжрайпартцэнтра А.П.Жуковіч, які праз 2 месяцы па прыбыцці на бягомльскую зямлю і прызначыў І.П.Ціткова камандзірам брыгады «Жалязняк». Аснову яе склалі ўжо дзеючыя тут партызанскія сілы Р.А.Дзякава — С.С.Манковіча, якія налічвалі каля 200 байцоў. Да іх далучылі групу лейтэнанта М.Л.Афанасьева і групу Г.В.Шараева.

Першымі мерапрыемствамі, з якіх распачаў сваю дзейнасць Ціткоў як камбрыг, былі збор зброі і боепрыпасаў сярод насельніцтва, папаўненне асабовага складу брыгады, блакіроўка і знішчэнне варожых гарнізонаў на тэрыторыі раёна, поўнае авалоданне дарогамі і мастамі, што знаходзіліся ў межах раёна. 12.12.1942 г. існаванне нямецкіх гарнізонаў на бягомльскай зямлі было поўнасцю паралізавана.

Як камандзір брыгады Іван Піліпавіч праявіў шмат клопатаў, каб звязаць партызанскія брыгады, што дзейнічалі па суседству з брыгадай «Жалязняк», з Вялікай зямлёй праз Бягомльскі аэрадром. І мара яго збылася: у сакавіку 1943 г. да партызан у Бягомль прыляцелі першыя самалёты з боепрыпасамі і медыкаментамі.

Час ішоў. Брыгада вяла баявыя дзеянні супраць ворага, паяўляліся раненыя. Не абыходзілася і без іншых захворванняў партызан. Па гэтай прычыне І.П.Ціткоў і вырашыў арганізаваць у брыгадзе свой шпіталь. Спачатку ён дзейнічаў у вясковай хаце, а потым яго збудавалі ў цяжкадаступным месцы ў лесе; пад зямлёй зладзілі памяшканні з нарамі, запасам медыкаментаў, прадуктаў і вады. Для лячэння і догляду хворых былі прыцягнуты медыцынскія работнікі, што прыйшлі ў брыгаду з даваенных медыцынскіх устаноў раёна. Загадваў шпіталем ваенны ўрач Іван Дзмітрыевіч Кузняцоў, які ўцёк з нямецкага палону і прыйшоў у брыгаду, і ўрачы даваеннай Бягомльскай бальніцы муж і жонка Сырнікавы, яна — тэрапеўт, ён — хірург.

Добрага слова заслугоўвае Іван Піліпавіч Ціткоў і з нагоды дачынення да пераходу на бок партызан брыгады «Рускай нацыянальнай народнай арміі» пад камандаванне У.У.Гіль-Радзіёнава, якая ваявала на баку немцаў. Гэта Ціткоў вёў перапіску і перагаворы з падпалкоўнікам Гіль-Радзіёнавым і паскорыў яго рашэнне павярнуць зброю брыгады супроць фашыстаў.

У чэрвені 1944 г. пры прарыве брыгады «Жалязняк» з акружэння на р. Цна Ціткоў быў паранены і пакінуў пост камбрыга. А 28.6.1944 г. ў 7 гадзін 15 хвілін на Сінічынскую пераправу цераз Бярэзіну выйшаў з лесу танк камандзіра батальёна 35-й танкавай брыгады маёра Сухаверхава, які тут ужо чакалі партызаны брыгады «Жалязняк».

Вярнуўся ў брыгаду І.П.Ціткоў 30.6.1944 г. ў пагонах палкоўніка і з Зоркай Героя ўжо на расфарміраванне. *Г.Кулікоўская.*



Р.А.Сырнікаў.



І.Дз.Кузняцоў.

**ШЛЯХТУНОЎ Фёдар Сазонавіч**. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віленскай вобласці. Нарадзіўся 17.9.1896 г. ў в. Сінякова Бешанковіцкага раёна. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1952). З 1915 г. ў арміі, з 1917 г. ў Чырвонай гвардыі, Чырвонай Арміі. З 1921 г. на савецкай і адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. У партызанах з кастрычніка 1941 г.: камандзір групы, з чэрвеня 1942 г. — атрада, у снежні 1942 г. — студзені 1943 г. і сакавіку—кастрычніку 1943 г. камандзір партызанскай брыгады імя Л.М.Даватара, у студзені—сакавіку 1943 г. — партызанскай брыгады імя К.Я.Варашылава. З 1944 г. ў СНК БССР, у 1947—60 гг. на адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце ў Мінску. Узнагароджаны 4 ордэнамі, медалямі. Памёр 13.5.1972 г.

## Барысаўска-Бягомльская партызанская зона

У снежні 1942 г. партызанская брыгада «Жалязняк» вызваліла г.п. Бягомль. Да пачатку 1943 г. ўвесь Бягомльскі раён быў ачышчаны ад акупантаў. Партызаны ўстанавілі кантроль на тэрыторыі Бягомльскага і паўночнай часткі Барысаўскага раёнаў (плошча 2250 км$^2$), да канца 1943 г. вызвалілі каля 6 тыс. км$^2$ тэрыторыі Барысаўскага, Бягомльскага, Крупскага, Лагойскага, Плешчаніцкага, Смалявіцкага, Халопеніцкага і інш. раёнаў (каля 1100 населеных пунктаў). У выніку на поўначы Мінскай вобласці ўтварылася зона, якую кантралявалі народныя мсціўцы. Тут была адноўлена савецкая ўлада, выдаваліся газеты, у населеных пунктах дзейнічалі камендатуры.

Падтрымлівалася рэгулярная радыёсувязь з Вялікай зямлёй, з сакавіка 1943 г. ў Бягомлі дзейнічаў партызанскі аэрадром, на які з савецкага тылу дастаўлялі зброю, боепрыпасы, медыкаменты для партызан зоны і суседніх раёнаў Віцебскай, Вілейскай абласцей, Літвы.

Кіраўніцтва ў зоне ажыццяўлялі падпольныя Мінскі абком КП(б)Б, Барысаўскі міжрайпартцэнтр, райкомы партыі, штаб партызанскага злучэння Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны. Пасля зліцця зоны з Полацка-Лепельскай і Сенненска-Аршанскай партызанскімі зонамі вызваленая тэрыторыя склала каля 11 тыс. км$^2$. Зону абаранялі партызанскія брыгады «Жалязняк», «Народныя мсціўцы» імя В.Т.Варанянскага, «Дзядзькі Колі», «Штурмавая», «Смерць фашызму», імя Кірава, 1-я Антыфашысцкая і інш., што ўваходзілі ў партызанскае злучэнне Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны (усяго каля 10,5 тыс. партызан). Усе дарогі, што праходзілі праз зону, пастаянна кантраляваліся партызанамі, на танканебяспечных напрамках ствараліся фартыфікацыйныя ўмацаванні і перашкоды (равы, засекі, мінныя палі і інш.). У мэтах стрымлівання карна-грабежніцкіх вылазак нямецка-фашысцкіх акупантаў непасрэдна да гарнізонаў ворага былі высунуты дыверсійныя, разведвальныя падраз-



Барысаўска-Бягомльская партызанская зона. Партызан на палявых работах.

дзяленні, засадныя групы. Гэта вымушала праціўніка адцягваць значныя сілы для абароны камунікацый і апорных пунктаў гарнізонаў, перашкаджала прасоўванню карнікаў у глыб зоны і ў населеныя пункты, што кантраляваліся партызанамі. Дапамогу партызанам аказвалі падпольшчыкі Мінска, Барысава, Докшыц і інш., якія перадавалі інфармацыю аб намерах і сілах праціўніка. У час буйных карных аперацый нямецка-фашысцкіх захопнікаў вялікую дапамогу партызанам у абароне зоны аказвалі ЦК КП(б)Б і БШПР. Савецкія лётчыкі ў складаных умовах начных вылетаў дастаўлялі з Вялікай зямлі медыкаменты, боепрыпасы, эвакуіравалі параненых.

Гітлераўцы няраз спрабавалі ліквідаваць зону. У ходзе карнай аперацыі «Котбус» (май—чэрвень 1943) у баях пад в. Пышна, на рубяжах рэк Проня і Бярэзіна, каля партызанскага аэрадрома партызаны нанеслі праціўніку значныя страты: знішчылі больш за 2 тыс. салдат і афіцэраў, 24 танкі і бронемашыны, 73 аўтамашыны, 2 самалёты, адначасова з канца красавіка да сярэдзіны чэрвеня пусцілі пад адхон 43 варожыя эшалоны. Байцы брыгады «Жалязняк» 12.2.1944 г. каля в. Улессе адбілі наступленне карнага батальёна, узмоцненага 3 танкамі і мінамётна-артылерыйскімі батарэямі, 24.2.1944 г. каля в. Юхнаўка нанеслі страты праціўніку ў жывой сіле.

Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю партызан і цывільнага насельніцтва зоны ў час карных аперацый «Веснавое свята» і «Баклан» (красавік—чэрвень 1944). Займаючы кругавую абарону на балоцістых пляцоўках, партызаны толькі ў майска-чэрвеньскіх баях знішчылі 3735, паранілі 2400 і ўзялі ў палон каля 1 тыс. варожых салдат і афіцэраў, выратавалі жыццё тысячам людзей. Выніковае значэнне ў разгроме карнікаў адыграла імклівае наступленне Чырвонай Арміі і ўзаемадзеянне з ёю партызанскага злучэння зоны, якое не страціла сваёй баяздольнасці.

На месцы партызанскага аэрадрома пастаўлены абеліск, у в. Іканы Барысаўскага раёна ў гонар партызан Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны — помнік.

*У.С.Пасэ, Э.Ф.Языковіч.*

## Партызанскае злучэнне Барысаўска-Бягомльскай зоны

Пачало складвацца ў 2-й палавіне 1942 г., канчаткова аформілася ў жніўні 1943 г. Камандзір — сакратар Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б Р.Н.Мачульскі (жнівень 1943 — чэрвень 1944), начальнік штаба М.К.Садоўскі (жнівень 1943 — чэрвень 1944). Злучэнне дзейнічала на тэрыторыі паўночных раёнаў Мінскай вобласці: Барысаўскага, Бягомльскага, Крупскага, Лагойскага, Плешчаніцкага, Смалявіцкага, Халопеніцкага. З лета 1941 г. на гэтай тэрыторыі дзейнічалі партызанскія атрады І.А.Яраша, А.Я.Васілеўскага, М.Х.Балана («Буравеснік»), С.Н.Далганава («Барацьба») і шматлікія партызанскія групы, у лютым 1942 г. створаны атрад В.Т.Варанянскага («Мсцівец»).

У 1942 г. ў сувязі з хуткім колькасным ростам існуючых і ўзнікненнем новых партызанскіх атрадаў пачалося стварэнне партызанскіх брыгад. У жніўні 1942 г. на савеце камандавання атрадаў з удзелам прадстаўнікоў Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б створаны партызанскія брыгады «Дзядзькі Колі» і «Стары» (расфарміравана 8.5.1943, атрады вылучаны ў асобна дзейныя), у верасні — «Жалязняк» і «Народныя мсціўцы», у снежні — «Штурмавыя» і імя С.М.Кірава.

11.8.1942 г. ЦК КП(б)Б у мэтах узмацнення кіраўніцтва падпольнымі арганізацыямі і

Узлёт дэсантнага планера Б-11 на буксіры за самалётам-буксіроўшчыкам Як-2. 1943 г.



партызанскім рухам утварыў Барысаўскі падпольны міжрайпартцэнтр, а для забеспячэння кіраўніцтва баявымі дзеяннямі партызанскіх брыгад і атрадаў — Барысаўскі ваенна-аператыўны цэнтр (камандзір Г.І.Абрамаў, камісар В.В.Сямёнаў, начальнік штаба І.П.Ціткоў, з лістапада 1942 М.І.Каваленка), якія 5.10.1942 г. прыбылі ў Барысаўска-Бягомльскую партызанскую зону і прыступілі да работы (раён базіравання на поўнач ад воз. Палік). З ліпеня 1943 г. пасля скасавання міжрайпартцэнтра кіраўніцтва партызанскімі брыгадамі і атрадамі ажыццяўляў упаўнаважаны Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) П.А.Жуковіч (да жніўня).

На час аб'яднання з часцямі Чырвонай Арміі (27.6—3.7.1944) у партызанскае злучэнне ўваходзіла 10 брыгад — «Дзядзькі Колі», «Жалязняк», «Народныя мсціўцы» імя В.Т.Варанянскага, імя Кірава, «Смерць фашызму», імя П.К.Панамарэнкі, Лагойская, «Бальшавік», імя М.І.Калініна, «Штурмавая», 1-я Антыфашысцкая; 2 асобна дзейныя атрады — імя А.В.Суворава і імя М.І.Калініна; агульная колькасць партызан — 10 436. Камандзіру злучэння Р.Н.Мачульскаму, камандзірам брыгад П.Р.Лапаціну, І.П.Ціткову, Г.Ф.Пакроўскаму, камісарам брыгад С.С.Манковічу, І.М.Цімчуку прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

*А.Л.Манаенкаў.*

## Партызанскі аэрадром

Сіламі сялян Бягомльшчыны на заходняй ускраіне раённага цэнтра прыкладна ў 1935—38 гг. было зроблена лётнае поле аэрадрома. Пакарыстацца ім для сваіх патрэб у мірны час не паспелі. Так і пасвілася на роўным і гладкім як стол лётным полі свойская жывёла, пакуль партызаны не выгналі з Бягомля акупантаў у снежні 1942 г.

Пасля гэтага над аэрадромам амаль кожную ноч чуўся гул самалётаў. Рэгулярныя рэйсы пачаліся ў сакавіку 1943 г. Першым на Бягомльскі аэрадром прыляцеў планерыст, будучы заслужаны майстар спорту, заслужаны лётчык-выпрабавальнік СССР, Герой Савецкага Саюза, палкоўнік С.М.Анохін, другім — яго радыст. Анохін першы ажыццявіў пасадку і ўзлёт планера з цяжка параненымі партызанамі, за што быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Звычайна на Бягомльскім аэрадроме садзіліся двухматорныя ЛІ-2 і «Дугласы» са 101-га авіяпалка далёкага дзеяння, якім камандавала Герой Савецкага Саюза В.С.Грызадубава. Пілоты-планерысты толькі аднаго з двух авіяпланерных палкоў 1-й паветранай арміі за 1-е паўгоддзе 1943 г. зрабілі 556 вылетаў да партызан.

Спачатку аперацыю «Паветраны мост Бягомль — Вялікая зямля» абслугоўвалі 5 буксірных самалётаў і 20 планераў. Але хутка абстаноўка патрабавала павялічыць колькасць буксірных самалётаў да 11, а планераў — да 72.

Толькі за перыяд з 6 да 20 сакавіка авіяпланерная група зрабіла 96 баявых вылетаў, з іх 85 — паспяхова. У тыл праціўніка было адбуксіравана 65 планераў, перавезена 50 т баявога грузу, высаджана ў тыл 106 чалавек кіруючага саставу, 150 дэсантнікаў-дыверсантаў, 2 падпольныя абкомы КП(б)Б, парты-



К.П.Ласкутоў.



А.Кручкоў.



М.Мухамедгаліеў.



П.І.Юфераў.



Помнік на месцы партызанскага аэрадрома ў г.п. Бягомль.

занскае кіраўніцтва Літвы на чале з тагачасным 1-м сакратаром яе Кампартыі А.Ю.Снечкусам, некалькіх міжрайкомаў партыі з 10 радыёстанцыямі і 5 друкарнямі.

На самалётах і планерах з тылу вывезены 61 планерыст, шмат параненых партызан, хворых, дзяцей, 2 мільёны руб. савецкіх грошай і 800 кг каштоўных рэчаў у фонд абароны краіны.

Праз Бягомльскі аэрадром вялося забеспячэнне больш за 40 партызанскіх атрадаў і брыгад Мінскай, Віцебскай, Вілейскай і Баранавіцкай абласцей. Народным мсціўцам было дастаўлена 142 супрацьтанкавыя ружжы, 32 ручныя кулямёты, 33 ротныя мінамёты, 818 аўтаматаў, 98 вінтовак «СВТ», 1440 драгунскіх вінтовак, 950 мінамётных мін, 28,4 тыс. патронаў да супрацьтанкавых ружжаў, 815 тыс. вінтовачных і 407 тыс. аўтаматных патронаў, 16,2 тыс. кг узрыўчаткі і мін, 77 парашутных мяшкоў з медыкаментамі, іншы ваенны рыштунак.

На Бягомльскі аэрадром выляталі самалёты і буксіраваліся планеры ў асноўным з аэрадрома Старая Таропа, што знаходзіўся за 25 км на поўдзень ад г. Таропец (Цвярская вобласць). З гэтага аэрадрома і бліжэйшых узлётных пляцовак у тыл праціўніка было адпраўлена 142 планеры.

Абслугоўванне аэрадрома было ўскладзена на спецыяльна створаную для гэтай мэты групу партызан колькасцю 114 чалавек (камандзір І.П.Вадзянкоў, яго намеснік капітан І.І.Слабко). У яе склад уваходзіў узвод аховы, які ўзначальваў П.А.Бартулёў. Група займалася падрыхтоўкай аэрадрома да прыёму самалётаў і планераў, іх разгрузкай, маскіроўкай, адпраўкай у зваротны рэйс і інш. Да вывазкі дастаўленых з Вялікай зямлі зброі і боепрыпасаў, а таксама іншых работ пастаянна прыцягваліся дзесяткі падвод з Бягомля і навакольных вёсак.

У перыяд дзейнасці Бягомльскага аэрадрома (сакавік 1943 — чэрвень 1944) на яго прылятаЛі лётчыкі і планерысты Н.В.Аланоў-



Група лётчыкаў і планерыстаў, якія прылятаді на Бягомльскі партызанскі аэрадром; 4-ы злева — Герой Савецкага Саюза С.М.Анохін. Май 1985 г.

скі, І.Альбістэгі, С.М.Анохін, М.Асадчы, Бакланаў, Баранаў, Бардыкін, І.Барысаў, Батурын, Р.Л.Блюмкін, Б.А.Брадзіхін, Бурмістраў, В.Бухарын, Бушуеў, Бяззубаў, Бязрукаў, С.М.Бяляеў, Ю.А.Вадзяной, Варанцоў, Ватуцін, Г.Волгін, Галахаў, Ганеў, Говараў, Дзімакоў, Дзямідаў, Дудулін, Жалютаў, Законнікаў, М.Ільін, М.Калякін, Камалаў, Б.Г.Камісараў, Канавалаў, Канапкін, Кірычэнка, І.П.Кісялёў, Клапоўскі, Кочаў, А.Кручкоў, Кузьмінаў, Кураў, Н.Лагоўскі, К.П.Ласкутоў, Лахмацін, Лупанаў, Лысенка, І.Майчанка, Г.С.Маліноўскі, Мізін, В.Міланаў, Мішакоў, А.Мялешын, Навітачынаў, А.А.Позняк, Н.М.Пакідышаў, Паначэўны, Паноў, Паптоў, В.І.Паўлаў, Паўлычаў, Пашкоў, І.Пішараў, Пызін, П.Пятроў, І.Пяшчэраў, В.Сакалоў, Самсонаў, Селязнёў, Сідзякін, Д.Сільвестраў, Сінельнікаў, А.С.Сініцын, І.П.Смірноў, С.А.Сняткоў, Стрэльнікаў, Ю.Ф.Сушылін, Сцяцанаў, Трафімаў, Турзакоў, Турымаў, Фамін, Фукс (брат), Цітоў, А.Чабатароў, В.Чабукоў, С.Чарнаброўкін, Шадрын. Пры пасадцы на аэрадром і пералёце лініі фронту загінулі Агееў, Алямасаў, В.Выганаў, Галееў, В.Дзёмін, Кеўлін (Каўлін), Ю.Колесаў, Мінаеў, М.Мухамедгаліеў, Педчанка, Шуткін, П.І.Юфераў, Ягораў, А.Япішын.

За прайшоўшыя пасляваенныя дзесяцігоддзі не сцёрлася ў сэрцах народных памяць пра той далёкі і грозны час. На адной з вуліц Бягомля, адкуль бачны аэрадром, нашчадкі ўзвялі абеліск, на вяршыні якога — макет самалёта, а на гранях абеліска — выявы ордэна «Айчыннай вайны» і словы:

«Тут у 1943—1944 гг. дзейнічаў партызанскі аэрадром, праз які падтрымлівалася сувязь з «Вялікай зямлёй».

Адсюль пачала свой баявы шлях група арганізатараў партызанскага руху ў Літве».


К.П.Ласкутоў.


А.Кручкоў.


М.Мухамедгалієў.


П.І.Юфераў.


Помнік на месцы партызанскага аэрадрома ў г.п. Бягомль.

занскае кіраўніцтва Літвы на чале з тагачасным 1-м сакратаром яе Кампартыі А.Ю.Снечкусам, некалькіх міжрайкомаў партыі з 10 радыёстанцыямі і 5 друкарнямі.

На самалётах і планерах з тылу вывезены 61 планерыст, шмат параненых партызан, хворых, дзяцей, 2 мільёны руб. савецкіх грошай і 800 кг каштоўных рэчаў у фонд абароны краіны.

Праз Бягомльскі аэрадром вялося забеспячэнне больш за 40 партызанскіх атрадаў і брыгад Мінскай, Віцебскай, Вілейскай і Баранавіцкай абласцей. Народным мсціўцам было дастаўлена 142 супрацьтанкавыя ружжы, 32 ручныя кулямёты, 33 ротныя мінамёты, 818 аўтаматаў, 98 вінтовак «СВТ», 1440 драгунскіх вінтовак, 950 мінамётных мін, 28,4 тыс. патронаў да супрацьтанкавых ружжаў, 815 тыс. вінтовачных і 407 тыс. аўтаматных патронаў, 16,2 тыс. кг узрыўчаткі і мін, 77 парашутных мяшкоў з медыкаментамі, іншы ваенны рыштунак.

На Бягомльскі аэрадром выляталі самалёты і буксіраваліся планеры ў асноўным з аэрадрома Старая Таропа, што знаходзіўся за 25 км на поўдзень ад г. Таропец (Цвярская вобласць). З гэтага аэрадрома і бліжэйшых узлётных пляцовак у тыл праціўніка было адпраўлена 142 планеры.

Абслугоўванне аэрадрома было ўскладзена на спецыяльна створаную для гэтай мэты групу партызан колькасцю 114 чалавек (камандзір І.П.Вадзянкоў, яго намеснік капітан І.І.Слабко). У яе склад уваходзіў узвод ахоўы, які ўзначальваў П.А.Бартулёў. Група займалася падрыхтоўкай аэрадрома да прыёму самалётаў і планераў, іх разгрузкай, маскіроўкай, адпраўкай у зваротны рэйс і інш. Да вывазкі дастаўленых з Вялікай зямлі зброі і боепрыпасаў, а таксама іншых работ пастаянна прыцягваліся дзесяткі падвод з Бягомля і навакольных вёсак.

У перыяд дзейнасці Бягомльскага аэрадрома (сакавік 1943 — чэрвень 1944) на яго прыляталі лётчыкі і планерысты Н.В.Аланоў-



Група лётчыкаў і планерыстаў, якія прылятлі на Бягомльскі партызанскі аэрадром; 4-ы злева — Герой Савецкага Саюза С.М.Анохін. Май 1985 г.

скі, І.Альбістэгі, С.М.Анохін, М.Асадчы, Бакланаў, Баранаў, Бардыкін, І.Барысаў, Батурын, Р.Л.Блюмкін, Б.А.Брадзіхін, Бурміструў, В.Бухарын, Бушуеў, Бяззубаў, Бязрукаў, С.М.Бяляеў, Ю.А.Вадзяной, Варанцоў, Ватуцін, Г.Волгін, Галахаў, Ганеў, Говараў, Дзімакоў, Дзямідаў, Дудулін, Жалютаў, Законнікаў, М.Ільін, М.Калякін, Камалаў, Б.Г.Камісараў, Канавалаў, Канапкін, Кірычэнка, І.П.Кісялёў, Клапоўскі, Кочаў, А.Кручкоў, Кузьмінаў, Кураў, Н.Лагоўскі, К.П.Ласкутоў, Лахмацін, Лупанаў, Лысенка, І.Майчанка, Г.С.Маліноўскі, Мізін, В.Міланаў, Мішакоў, А.Мялешын, Навітачынаў, А.А.Позняк, Н.М.Пакідышаў, Паначэўны, Паноў, Паптоў, В.І.Паўлаў, Паўлычаў, Пашкоў, І.Пішараў, Пызін, П.Пятроў, І.Пяшчэраў, В.Сакалоў, Самсонаў, Селязнёў, Сідзякін, Д.Сільвестраў, Сінельнікаў, А.С.Сініцын, І.П.Смірноў, С.А.Сняткоў, Стрэльнікаў, Ю.Ф.Сушылін, Сцяпанаў, Трафімаў, Турзакоў, Турымаў, Фамін, Фукс (брат), Цітоў, А.Чабатароў, В.Чабукоў, С.Чарнаброўкін, Шадрын. Пры пасадцы на аэрадром і пералёце лініі фронту загінулі Агееў, Алямасаў, В.Выганаў, Галееў, В.Дзёмін, Кеўлін (Каўлін), Ю.Колесаў, Мінаеў, М.Мухамедгаліеў, Педчанка, Шуткін, П.І.Юфераў, Ягораў, А.Япішын.

За прайшоўшыя пасляваенныя дзесяцігоддзі не сцёрлася ў сэрцах народных памяць пра той далёкі і грозны час. На адной з вуліц Бягомля, адкуль бачны аэрадром, нашчадкі ўзвялі абеліск, на вяршыні якога — макет самалёта, а на гранях абеліска — выявы ордэна «Айчыннай вайны» і словы:

«Тут у 1943 – 1944 гг. дзейнічаў партызанскі аэрадром, праз які падтрымлівалася сувязь з «Вялікай зямлёй».

Адсюль пачала свой баявы шлях група арганізатараў партызанскага руху ў Літве».



Кіраўнікі ЦК Кампартый Беларусі і Літвы П.М.Машэраў (у цэнтры) і А.Ю.Снечкус (2-і злева) на ўрачыстасцях, прысвечаных адкрыццю помніка партызанскаму аэрадрому ў г.п. Бягомль. 1967 г.

Адкрыццё помніка-абеліска адбылося 20 жніўня 1967 г. Ва ўрачыстасцях удзельнічалі Героі Савецкага Саюза 1-ы сакратар ЦК КПБ П.М.Машэраў, 1-ы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР У.Е.Лабанок, былы камісар брыгады «Жалязняк» С.С.Манковіч, а таксама сакратар ЦК КПБ Ф.А.Сурганаў, загадчык аддзела ЦК КПБ Л.Г.Кляцкоў, кіраўнікі вобласці і раёна, вялікая група былых партызан. Шанаванымі гасцямі з боку нашых суседзяў-літоўцаў былі: 1-ы сакратар ЦК КПЛ А.Ю.Снечкус, партызаны-дэсантнікі Г.А.Зіманас, А.Б.Бараўскас, В.Ю.Уагентас, Я.Б.Наркевічутэ, В.Л.Сакавічус, Л.П.Рэшэляўскас, А.М.Мурніковас, А.В.Вайцекавічэне, І.Д.Нікіцін.

А.Ю.Снечкус падараваў Бягомльскаму музею народнай славы карціну «Партызанская маці», напісаную былым партазанам, літоўскім мастаком С.Розінасам.

*У.К.Герасімёнак.*

## «Бягомльская легенда»

У канцы сакавіка 1943 г. на Бягомльскім аэрадроме прызямліўся самалёт з Масквы, у якім знаходзілася група аператараў Саюзкінахронікі Іосіф Навумавіч Вейняровіч, Марыя Іванаўна Сухава, Атылія Баляславаўна Рэйзман і Сямён Школьнікаў. Яны мелі заданне зняць дакументальны фільм «Народныя мсціўцы». Партызаны сустрэлі іх як жаданых гасцей. Размясцілі ў асобнай хаце побач са штабам брыгады «Жалязняк».

Каб паказаць прыбыўшым сапраўдны бой, было вырашана правесці некалькі баявых аперацый. Партызаны зрабілі засаду на развілцы дарог Докшыцы—Даўгінава. Кінаапе-



Ваенныя кінааператары М.Сухава (3-я злева) і А.Рэйзман (1-я справа) сярод партызан брыгады «Жалязняк». 1943 г.

ратары са сваёй апаратурай высунуліся ўперад на дарогу якраз у такі час, калі з падбітай нямецкай аўтамашыны яшчэ гучалі стрэлы. Марыя Сухава пазней знайшла ў сваім кажушку 2 дзіркі ад куль. Затым кінааператары здымалі нападзенне партызан на ст. Параф'янава, дзе трапілі пад агонь. Хадзілі з падрыўнікамі на чыгунку, каб зняць узрыў эшалона. Іх жаданне ўсюды паспець не на жарт трывожыла камандаванне брыгады. Ужо пачыналася карная аперацыя «Котбус», варожыя самалёты часта паяўляліся над Бягомлем, а кінааператары ніяк не жадалі перабірацца ў в. Бабцы, каб схавацца ад бамбёжак.

У брыгадзе «Жалязняк» гэта група прабыла каля паўтара месяца, пасля чаго пайшла ў Чашніцкую партызанскую брыгаду «Дубава».

У 1944 г. ў час карнай аперацыі «Баклан» М.І.Сухава была смяротна паранена разрыўной куляй. Разумеючы, што жыць ёй засталіся лічаныя хвіліны, Марыя зняла замацаваныя на шырокім ваенным рамяні, якім была падпяразана, скураныя чахлы са знятымі плёнкамі і аддала іх партызану, што яе суправаджаў. Яна загадала яму даставіць фотаматэрыялы на партызанскі аэрадром і перадаць асабіста камандзіру лётнага экіпажа, які накіроўваўся ў Маскву. Праз паўгадзіны Марыя Іванаўна Сухава памерла.

Партызан выканаў загад кінааператара, але пры вяртанні з аэрадрома загінуў. Паколькі ніхто, акрамя загінуўшых Сухавай і партызана, не ведаў пра факт перадачы плёнак лётчыкам, то на працягу 16 пасляваенных гадоў лічылася, што ўнікальныя фотаматэрыялы страчаны назаўсёды.

І толькі ў пачатку 1960-х г. фотаплёнкі былі знойдзены ў музеі Рэвалюцыі СССР у Маскве. Як высветлілася, камандзір экіпажа самалёта палічыў музей найбольш надзейным месцам і даставіў іх туды.

Праз некаторы час частка фотаматэрыялаў М.І.Сухавай, а таксама іншых кінааператараў, якія знаходзіліся разам з ёй у партызанскай Беларусі, былі перададзены ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску і Бягомльскі музей народнай славы. Яны сталі асновай для хранікальна-дакументальнага фільма «Бягомльская легенда» пра партызанскую брыгаду «Жалязняк», створанага ў 1985 г. І.Н.Вейняровічам. Гэты

фільм — своеасаблівы помнік партызанам-жалязнякоўцам і мужнаму ваеннаму кінааператару Марыі Іванаўне Сухавай, для якой беларуская зямля стала апошнім прытулкам.

*Г.М.Аўтушка.*

## Вызваленне Бягомля

**З успамінаў С.М.Табачнікава, былога начальніка штаба 3-га партызанскага атрада брыгады «Жалязняк»**

Камандаванне партызанскай брыгады «Жалязняк» прыступіла да выканання дзвюх важных задач: знішчыць масты і вызваліць Бягомльскі раён ад акупантаў. Іх ажыццяўленне прывяло ў рух як партызан, так і насельніцтва раёна. Мужчыны рыхтавалі сані і збрую, жанчыны шылі маскіровачныя халаты. Была створана група партызан, якая разам з сялянамі шукала зброю. У месцах сур'ёзных баёў Чырвонай Арміі з немцамі было знойдзена шмат вінтовак, боепрыпасаў. Начштаба брыгады Л.П.Бірукоў паведамляў, што жыхар в. Кветча Фёдар Шаман здаў партызанам 15 вінтовак.

Барысаўскі падпольны міжрайпартцэнтр загадаў камандаванню брыгады імя С.М.Кірава перадаць брыгадзе «Жалязняк» 1 кулямёт і 5 аўтаматаў.

Збор зброі дазволіў за другую палавіну кастрычніка і лістапад 1942 г. амаль утрая павялічыць колькасць партызан.

Асноўная задача аперацыі па знішчэнні мастоў заключалася ў тым, каб стварыць гітлераўцам невыносныя ўмовы на занятых імі аб'ектах: рабіць пастаянныя засады, абстрэлы мастоў днём і ноччу, блакіраваць і перашкаджаць падвозу прадуктаў харчавання. Перш за ўсё трэба было адрэзаць гарнізон Бягомля ад бліжэйшага і больш буйнага Лепельскага гарнізона, дзе знаходзіліся тылы 3-й нямецкай танкавай арміі. Гэта задача была даручана 3-му атраду і выдатна ім выканана. 23.11.1942 г. на адлегласці 1,5—3 км ад мастоў у бок Лепеля на дарозе паставілі міны. На Кальніцкі мост з блізкай адлегласці рабіліся агнявыя налёты. Камандзір брыгады І.П.Ціткоў загадаў стварыць штурмавыя групы з партызан 3-га атрада і тых, што прайшлі 6-месячную падрыхтоўку на спецкурсах у Арахаўцы Уладзімірскай вобласці (Брухавецкі, Баталка, Мардачоў, Глазко і інш.). Як працяг гэтай аперацыі камбрыг Ціткоў прыдумаў правесці маскіровачны рэйд па вёсках, якія абкружалі Бягомль. Для гэтага ён даручыў мне падабраць 40 партызан, апрануць усіх у белыя халаты, пасадзіць на 35 фурманак і шпаркім тэмпам рушыць па населеных пунктах раёна. Наш рэйд працягваўся з 5 па 11 снежня.

У вёсках, па якіх праязджалі народныя мсціўцы, іх называлі дэсантнікамі. У першых двух населеных пунктах партызаны арыштавалі паліцэйскага і старасту, на якіх паскардзіліся людзі. З іншых вёсак нямецкія паслугачы ўцякалі ў Бягомль і паведамлялі фашыстам перабольшаныя звесткі пра колькасць партызан-дэсантнікаў, нібыта прыбыўшых у Бягомльскі раён.

У завяршальным этапе Бягомльскай аперацыі ўдзельнічалі ўсе 3 атрады брыгады. Пачалася яна 17.12.1942 г. ў 4 гадзіны раніцы. 3-і атрад меў на ўзбраенні 2 ручныя кулямёты, 10 аўтаматаў і 2 бязгучныя вінтоўкі. Ён атрымаў задачу штурмам авалодаць будынкам былой турмы, а таксама двухпавярховым будынкам школы, у якім размяшчалася камендатура, блакіраваць Дом Саветаў, дзе знаходзіліся немцы і паліцэйскія Бягомльскага гарнізона і збеглыя з іншых паліцэйскіх участкаў.

Атрад выйшаў з в. Бабцы. Партызаны прыбылі ў в. Маргавіца (за 2 км ад Бягомля), пакінулі тут штаб брыгады, а самі дайшлі да будынка лесапілкі на ўскраіне Бягомля, дзе спыніўся камандзір атрада М.Л.Афанасьеў са сваім штабам. Асноўныя сілы 3-га атрада на чале са мной рушылі па вуліцы Савецкай. Як падышлі да былой турмы, нікога там не выявілі. А ў камендатуры пачулі нейкі шоргат і закідалі яе супрацьтанкавымі гранатамі. Партызан Сеўрукоў кінуў іх аж дзве. Варожага агню ў адказ не пачулі. Тады я загадаў ісці да Дома Саветаў. Пачуўшы партызан, немцы адкрылі па атраду шквальны кулямётны агонь. Партызаны адказалі ім тым жа. Я параіў сваім кулямётчыкам часцей мяняць месца стральбы, каб увесці немцаў у зман адносна колькасці кулямётаў у партызан, — тое ж і з аўтаматчыкамі. У гэты час да мяне падбег партызан і паведаміў, што камісар атрада Г.В.Шараеў каля школы затрымаў паліцэйскага. Калі я прыйшоў туды, паліцэйскі ўжо ляжаў мёртвы. Паспяшаўся Шараеў

застрэліць яго. У паліцая трэба было даведацца пра адрасы кіраўнікоў нямецкай адміністрацыі раёна і расправіцца з імі, а заадно выпытаць і пра сакрэтныя пасты, і пра месцазнаходжанне банкаўскіх грошай. Але было ўжо позна.

Набліжаўся досвітак, і мы пачалі адыход на Маргавіцу. Там ужо сядзелі ў сёдлах усе тры брыгадныя начальнікі. Ціткоў зрабіў мне заўвагу, нібыта я крыху зацягнуў аперацыю ў часе, і тут жа прапанаваў узяць з нагружаных трафеямі саней 2-га атрада некалькі бляшанак мясных кансерваў сабе і партызанам. С.С.Манковіч у сваю чаргу пацікавіўся, як партызаны вялі сябе пад варожым агнём.

Другі ж атрад граміў нямецкія склады, што размяшчаліся ў канцы вуліцы Трактарнай, недалёка ад лесу. Прыкладна разам з адыходам 3-га атрада ў Маргавіцу прыйшоў і 2-і з добрымі трафеямі.

У ходзе аперацыі 3-і атрад страціў двух чалавек, у іншых атрадах забітых не было.

У выніку актыўных дзеянняў партызан немцы былі дэмаралізаваны і блакіраваны ў сваіх бункерах на Кальніцкім і Бузянскім мастах. Убачыўшы, што далейшае знаходжанне тут паграджае немінучым разгромам, яны пакінулі ўвесь свой рыштунак у бункерах каля мастоў і ўцяклі, напэўна, у Докшыцы. А 18 снежня з Плешчаніц прыйшло да немцаў у Бягомль ратаванне: некалькі транспартных адзінак, якія забралі жандараў, паліцэйскіх і дзесятак чалавек цывільных з абслугі. З гэтага часу Бягомльскі раён стаў востравам свабоды ад акупантаў. Партызаны наладзілі тут жыццё па савецкіх законах.

Для гітлераўцаў страта кантролю над раёнам і парушэнне тылавых камунікацый на поўнач ад Мінска з'явілася моцным ударам. Каб неяк кампенсаваць гэту страту, немцы пачалі будаўніцтва вузкакалейных дарог, якія часта падвяргаліся дыверсіям партызан.

Вызваленне ад акупантаў цэлага раёна плошчай больш за 2 тыс. км$^2$ з насельніцтвам каля 40 тыс. чалавек прыбавіла ўпэўненасці іншым партызанскім злучэнням. Яны пачалі праводзіць падобныя аперацыі і ствараць у месцах сваёй дыслакацыі такія ж свабодныя партызанскія зоны. З сакавіка 1943 г. ў Бягомлі пачаў рэгулярна дзейнічаць аэрадром. Рэзка вырас колькасны склад усіх атрадаў брыгады «Жалязняк». Калі ў Бягомльскай аперацыі 3-і атрад дзейнічаў у колькасці 50 чалавек, то ў сакавіку 1943 г. ў ім было ўжо звыш 200 партызан, а ў брыгадзе — больш за 1500.



Помнік у гонар партызанскай брыгады «Жалязняк», якая 18.12.1942 г. вызваліла г.п. Бягомль ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

## Юхнаўскі бой

Бой партызанскай брыгады «Жалязняк» Мінскай вобласці і нямецка-фашысцкіх захопнікаў у в. Юхнаўка Бягомльскага раёна 13.8.1943 г. Праводзіўся сіламі 5-га партызанскага атрада (камандзір Р.А.Карніец, камісар А.Г.Калашнікаў) брыгады «Жалязняк» супраць гарнізона ў в. Юхнаўка (каля 400 гітлераўцаў), які ахоўваў дарогу Бягомль—Докшыцы. Напярэдадні бою партызанскія разведчыкі праніклі ў в. Юхнаўка, вывучылі размяшчэнне варожых умацаванняў, агнявых кропак, пастоў аховы. На досвітку 13 жніўня партызаны на чале з намеснікам камандзіра брыгады «Жалязняк» А.В.Склярэнка пайшлі



Помнік у гонар разгрому партызанамі варожага гарнізона ў в. Юхнаўка.



В.І.Ляшчынскі.



Я.І.Саковіч.

на штурм гарнізона і авалодалі Юхнаўкай. Спробы праціўніка выбіць партызан з вёскі поспеху не мелі. У выніку бою партызаны знішчылі каля 80 гітлераўцаў, у т.л. камандзіра і начальніка штаба варожага батальёна, узялі ў палон 48 салдат і 3 афіцэраў, захапілі вял. трафеі: 45-міліметровую гармату, 2 мінамёты, 7 кулямётаў, больш 60 вінтовак, 3 аўтаматы, 32 тыс. патронаў, 40 падвод з харчаваннем і амуніцыяй, рацыю, штабныя дакументы і шыфр батальёна. У час бою загінулі 2 партызаны. У 1964 г. ў в. Юхнаўка ў гонар гэтага бою пастаўлена стэла.

*М.Ф.Шумейка.*

## ...І тры гранаты для сябе

**З успамінаў пра падземны партызанскі шпіталь**

Канчатковай мэтай аперацыі «Кармаран» («Баклан») было акружэнне і знішчэнне 19 партызанскіх брыгад у Домжарыцкіх балотах, каля воз. Палік. Агульная шчыльнасць карнікаў на знешняй паласе акружэння складала 200 чалавек на кіламетр, а ў раёне Домжарыцкіх варот — 700 чалавек. Салдаты ішлі ланцугом на адлегласці паўтара метра адзін ад другога. Задума: ні адзін партызан не павінен застацца жывым.

5 чэрвеня гітлераўцы захапілі Бягомльскі аэрадром. Больш за 30 (дакладную лічбу ўстанавіць не ўдалося) раненых і хворых тыфам партызан эвакуіраваць за лінію фронту не паспелі. Апошнія самалёты адляталі ўжо пад абстрэлам.

Камандаванне брыгады «Жалязняк», атрады якой дыслацыраваліся вакол аэрадрома, прадугледзела і такі паварот падзей. Вырашана было схаваць раненых на час блакады ў дзвюх зямлянках, выкапаных сярод Домжарыцкіх балот у Саўскім Бары... У тое, што адбылося потым у партызанскіх зямлянках, цяжка паверыць. Аб гэтай хвалюючай гісторыі расказваюць тыя, хто меў да яе прамыя адносіны.

**М.С.Сялюк, былы камісар 8-га атрада брыгады «Жалязняк»**: У час блакады ўсе (раненыя і хворыя), хто мог рухацца, бралі зброю і адыходзілі са шпіталю ў свае атрады. Гэтыя 30 нікуды пайсці не маглі. Былі сярод іх і без ног і без рук. Многія былі ў беспрытомнасці, трызнілі. Гэта ў асноўным тыфозныя...

Зямлянкамі ў поўным сэнсе слова гэтыя сховы не назавеш. Кожная — 10 метраў у даўжыню, 2 у шырыню і 1 метр у вышыню. Ляжаць, сядзець можна, але не ўстаць. Глыбей капаць нельга было. Вакол балота. Сталі б глыбей капаць, атрымалі б сажалку замест зямлянкі. На падлозе насціл з жэрдак, на сталяванне тонкія бярвенні пайшлі. Тут жэрдзі не гадзіліся, маглі б не вытрымаць зямлі, прагнуцца. Мы зверху ўсё зямлёй засыпалі, зямлю зараўнялі і заслалі мохам. Нават ядловец і ягаднік зверху ў мох пасадзілі. Выкапаную зямлю за кіламетр адвезлі і ў балота высыпалі... Вузенькі люк, каб толькі чалавеку прапаўзці, цяжкай скрыняй з зямлёй закрылі, кожную шчыліну замаскіравалі. Калі не ведаеш, можаш прайсці над зямлянкай і не заўважыць. Для таго, каб дыхаць можна было, невялікую адтуліну пад карэнне сасны вывелі. У адну «нару» раненых уцягнулі, у другую — тыфозных хворых. Бой ішоў ужо зусім блізка...

**В.І.Ляшчынскі, былы начальнік партызанскага шпіталю брыгады «Жалязняк»**: Калі б я мог, я б нашым сёстрам і санітаркам помнік паставіў. З чыстага золата... Аб сабе не думалі, прама ў рукі да фашыстаў лезлі, калі трэба было раненых з-пад агню выцягнуць. Была ў нас сястрычка Валя па прозвішчы Мальчык. Усе яе дражнілі: «Мальчык з пальчык!». Дык вось гэты «мальчык з пальчык» на сваіх вузенькіх плячах выцягнула з бою больш за 200 раненых. Разам з іх зброяй, ніводнай вінтоўкі не кінула. Маша Углова прама на аэрадроме загінула, калі раненых да самалёта прывезла. Пачалі аднойчы бамбіць наш лясны шпіталь, а я якраз нажоўкай руку ў раненага адпільваю, вачэй падняць не магу. Дык Ядзя Саковіч і мяне і раненага сабой прыкрыла. Ці ж такое загадаеш?..

А тут ужо зусім выпадак асобны быў. Як загадаеш жывому чалавеку добраахвотна ў зямлю замуравацца? У хворых і раненых іншага выхаду не было — або пад зямлю, або... Ефрасіння Іванаўна Грыбаедава, фельчар наш, тая першая сказала: «Я буду з ранянымі, што ім, тое і мне». А з ёй усе два гады ў лесе дачка маленькая была гадоў пяці. Яна ў нас і малярыяй захварэла. Я ёй кажу: «Фрося, а як жа дачка?». Яна адказвае: «І Ліля са мной будзе». Думаў я, што сясцёр угаворваць прыйдзецца. А Наташа Кульба — прыгажуня была такая, што вачэй не адвесці, — гаворыць: «Не трэба, Васіль Іванавіч, нас прасіць. Трэба, значыць, трэба. Мы застаёмся з хворымі і раненымі. Не кідаць жа іх адных». І засталіся яны — Наташа Кульба, Ліда Радзівон, Надзя Церах, Ефрасіння Грыбаедава. І тры санітаркі з імі — Ліда Балбукова, Лукер'я Пярэдня, мы яе ўсё Луцэйкай звалі, і Тоня Пярэдня, дваюрадныя сёстры. Луцэйка была старэйшай, а Тоні ўсяго гадоў пятнаццаць...



Н.У.Кульба.



Н.І.Церах.

**М.С.Сялюк**: Выклікаў нас да сябе камбрыг, Іван Піліпавіч Ціткоў, мяне і камандзіра нашага восьмага атрада Пятра Клякіна і гаворыць: «Брыгада будзе прарывацца з акружэння. А вашаму атраду заданне надзвычайнай важнасці, вы застанецеся тут і будзеце выклікаць агонь на сябе, калі карнікі падыдуць да зямлянак. Трэба будзе — памрыце, але тыя, у зямлянках, у рукі да фашыстаў трапіць не павінны». І развітаўся з намі, як са смяротнікамі. Ён разумеў, што такое сто чалавек супраць некалькіх тысяч...

**Е.І.Грыбаедава, былы фельчар партызанскай брыгады «Жалязняк»**: Задыхацца мы пачалі на другія суткі, перасталі гарэць свечкі, запалкі ўспыхвалі і адразу тухлі. Мы ўсё рабілі навобмацак — мянялі павязкі, давалі лякарства. Разаб'ём ампулу кафеіну, працэдзім праз марлю, каб асколкі шкла не трапілі ў рот, і даём з кубка. У канцы кожнай зямлянкі быў «калодзеж» зроблен — ямка глыбінёй у метр. Вада ў ёй збіралася балотная, смярдзючая. Але іншай не было. Разагнуцца нельга было. І мы поўзалі на чацвярэньках. Дапаўзеш на каленях да «калодзежа», зачэрпнеш паўкубка вады і назад. Хворыя і раненыя ўвесь час хацелі піць. А тут у Лілі маёй яшчэ прыступ малярыі пачаўся. Нам усім го-



Е.І.Грыбаедава.

рача, душна, а яна просіць: «Мама, абнімі мяне, мне холадна...».

**З тых, хто знаходзіўся сярод раненых і хворых пад зямлёй, удалося знайсці траіх партызан: Уладзіміра Іванавіча Бяляўскага, Івана Максімавіча Архіпенку і Браніслава Баляслававіча Палянскага.**

**Б.Б.Палянскі**: Прыйшоў да сябе я ад стрэлаў наверсе, дзесьці над самай галавой. Ніяк не зразумею, дзе я і што са мной. Паўзмрок, дзесьці ў куце ледзь-ледзь гарыць свечка. Справа і злева ад мяне ляжаць незнаёмыя людзі, ці то жывыя, ці то мёртвыя, хтосьці стогне. Першае, што запомнілася, — грудзі разрываюцца ад няхваткі паветра. Да мяне нахілілася якаясьці дзяўчына (потым я даведаўся, што гэта была Наташа Кульба) і шэптам сказала, што я хворы тыфам і знаходжуся ў падземным партызанскім шпіталі. А над намі — карнікі, ідзе блакада. Страляць пачалі зусім блізка, з кулямётаў і з аўтаматаў. Мінамёты ўдарылі. І тут мы ўсе пачулі над сабой нямецкую гаворку. Мы замерлі і не дыхаем. А партызан, што побач са мной ляжаў, як ускінецца і як закрычыць у непрытомнасці: «Бі фашысцкую погань!».

**М.С.Сялюк**: Мы рухаліся ўвесь час упрытык за карнікамі, а наша разведка, дык тая зусім побач з імі ішла, каб у час заўважыць, як гітлераўцы стануць да зямлянак падыходзіць. І вось дакладваюць нам: да зямлянак засталося сто метраў. Ідуць прама на іх. І хоць добра мы замаскіраваліся, сэрца ва ўсіх замерла. Там жа бездапаможныя, бяззбройныя... Мы забеглі і ўдарылі па карніках з фланга. Яны залеглі і такі агонь адкрылі, што ў нас адразу двух чалавек забіла, начальніка штаба Разбягаева і ячшэ аднаго партызана па прозвішчу Куцепаў...

**Е.І.Грыбаедава**: Трызнілі многія, але крычалі моцна толькі двое. Прытым, калі наверсе ціха, яны маўчаць, як толькі наверсе пачынаюць страляць, гэтыя двое адразу ў крык, камандуюць, людзей у атаку падымаюць. Дзве сястры сядзелі каля іх і затыкалі ім рот анучкамі. І так трымалі. Сачылі толькі, каб не задыхнуліся. Дык яны дзяўчатам ледзь рукі не паламалі. А што ты ім зробіш? У непрытомнасці ж, нічога не памятаюць, а мужыкі яны моцныя.

**Б.Б.Палянскі**: Калі я канчаткова апамятаўся, зразумеў, што становішча наша — горш не бывае. На ўсіх нас адзін карабін і тры гранаты, якія выпадкова засталіся ў мяне. Калі сёстры і санітаркі даведаліся пра гранаты, дамовіліся, што яны будуць для нас, што ўзарвём мы імі сябе, калі фашысты люк адкрыюць. Каб не жывымі ў рукі... Усе мы памяталі, як у 1943 годзе ў час карнай аперацыі «Котбус» гітлераўцы захапілі партызанскі шпіталь. Нажамі заколвалі, жывым нікога не пакідалі. А ўжо як над сёстрамі, над санітаркамі здзекаваліся... Нашы дзяўчаты гэту гісторыю ведалі, таму і рашылі цвёрда: «Гэтыя тры гранаты для сябе як... апошняе выратаванне».

**В.І.Бяляўскі**: Нам, мужчынам, не пад сілу было чуць блізкі бой і не ўдзельнічаць у ім. Адзін з раненых пачуў пра гранаты, схапіў адну і кінуўся па нашых нагах да выхаду, каб у бой уступіць. Сёстры ледзь звалілі яго і аднялі гранату. З таго моманту сёстры трымалі гэтыя тры гранаты пры сабе... Бой аддаліўся, а напружанне ў нас не спала, таму што галасы немцаў чутны былі зусім блізка...

**М.С.Сялюк**: Ходзім мы з карнікамі па кругу. Яны ад нас не адрываюцца, і мы не маем права далёка адыходзіцца, зямлянкі кінуць. А разведчыкі дакладваюць: карнікі капаюць акопы побач з зямлянкай і кухню там паставілі. Безумоўна, ніхто з нас гэта не прадбачыў і не быў гатоў да такога павароту падзей...

**Л.В.Скакун (дзявочае прозвішча Пярэдня), санітарка партызанскага шпіталю**: Страляць наверсе перасталі. Гяргечуць дзесьці пасвойму. А мы ўжо зусім задыхаемся. Гэта мы ўжо потым даведаліся, што, калі яны акопы капалі, нашу паветраную дзірку зямлёй закідалі. Паветра да нас толькі праз дупло старой сасны паступала. А дупло зусім маленькае... Грыбаедава загадала нам, каб менш паветра траціць, не рухацца. Ну, а як ты не будзеш

рухацца, калі хворыя стогнуць, просяць то піць, то судна паднесці. Паўзеш, галава круціцца, дрэнна, сэрца дзесьці ў горле калоціцца, вось-вось замлееш. Але ж трэба! Хто ж яго напоіць?.. Я толькі аднаго баялася: калі хто памрэ, куды мы яго дзенем? Так і будзе ляжаць сярод жывых. Думала, калі вытрымаю, то ўжо ніколі спіну не разагну — увесь час на чацвярэньках і на чацвярэньках, як кот ці сабака...

**І.М.Архіпенка**: Прадуктаў у нас было на тыдзень, але вось і яны сталі канчацца. Урэзалі паёк да мінімуму. Але людзі пакутавалі не ад голаду, а ад духаты. Хацелася толькі піць. А вада ў калодзежы стала горкая, салёная. Нарэшце, і яе не стала. Бачна, балота перасохла. Вось тут ужо пачаліся сапраўдныя нашы пакуты...

**А.К.Таракан (дзявочае прозвішча Пярэдня), санітарка партызанскага шпіталю**: Калі скончылася вада ў «калодзежы», мы паспрабавалі паглыбіць яго. Капалі кубкамі, рукамі. Вады не было, была толькі мокрая ліпкая гразь. А хворыя то прыходзілі ў свядомасць, то зноў млелі, прасілі піць. Здавалася, калі б можна было, крывёю сваёй напаіла б, толькі, каб яны не пакутвалі. Бяляўскі хацеў пакончыць з сабой, так цяжка яму было. Луцэйка яго выратавала. Наклала ў анучку мокрай гразі і выціскала гэту анучку над яго тварам, змазвала яму вусны, язык...

**В.І.Бяляўскі**: Я добра не памятаю, што адбывалася асабіста са мной. Памятаю толькі, што многа разоў партызаны парываліся выйсці вон і «даць апошні бой». Адным карабінам і трыма гранатамі. Маўляў, лепш памерці наверсе ад кулі, чым задыхацца і гніць жывым тут, унізе. І кожны раз утрымлівалі сёстры і санітаркі. Утрымлівалі не столькі сілай, колькі сваімі ласкавымі, пяшчотнымі словамі. У гэтых дзяўчатках, якіх мы і бачыць не бачылі, а толькі чулі, было столькі сілы, веры, любові, столькі жыцця, што мы, мужыкі, зноў сябе адчувалі мужыкамі, адказнымі за гэтыя дзявочыя лёсы. І не толькі за гэтыя...

**Е.І.Грыбаедава**: Калі пачулі моцныя галасы над люкам, зразумелі — гэта канец. Усё ў нас было прадумана да дробязі. Дзве гранаты ўзяла Наташа Кульба, адну я. «Вусікі» адагнулі, чакаем. І ў зямлянцы ўсе чакаюць — жыццё на секунды пайшло. Дамовіліся, што кідаем адначасова, па маёй камандзе, яна — далей, я прама пад ногі нам. Чуем, люк крануўся, пясок на нас пасыпаўся. Вось і ўсё, думаю, скончылася жыццё. Не сябе — Лілю шкада. Добра, што ў цемнаце ніхто слёз маіх не бачыць. «Кідай!» — шэпча Наташа. А ў мяне раптам сэрца зашклянела, і якісьці незвычайны спакой найшоў. Быццам я ўжо з таго свету гляджу. «Няхай люк адкрыюць, — шапчу ў адказ. — Каб хоць адзін з іх разам з намі акалеў!». Падрыхтавала гранату, чакаю. А зверху голас: «Не бойцеся, гэта мы!».

**М.С.Сялюк**: Бег да зямлянак разам з Клякіным і думаў з надзеяй і жахам: ці застаўся хоць хто-небудзь жывы? Вады ў іх было на 3—4 дні. Харчоў — на тыдзень ад сілы. А прайшло 18 сутак! 18 дзён і начэй. «Колькі вас?» — толькі і спытаў Клякін. «Усе», — адказала Грыбаедава і самлела. Гранату з яе рукі Клякін выняў. Ні стаяць, ні хадзіць, ні глядзець яны не маглі. Яны дыхалі і ніяк не маглі надыхацца... *М.Матукоўскі.*

*«Ленінская трыбуна». 1984. 8 кастрычніка.*

## Сувязны ў чорнай расе

Неўміручай славай пакрылі сябе салдаты, партызаны і падпольшчыкі. У іх рады станавіліся людзі рознага ўзросту, полу і нацыянальнасці. Трэба яшчэ дадаць, што і рознай сацыяльнай прыналежнасці. Аб тым, што святары, якіх так мэтанакіравана знішчала ўлада ў 1930-я гады, станавіліся на абарону гэтай жа ўлады, напісана няшмат. Прынамсі, намнога менш, чым аб гераічных учынках салдат Вялікай Айчыннай. А яны — гэтыя людзі — заслугоўваюць не меншай пашаны.

Сям'я святара праваслаўнай царквы Аляксандра Новіка прыехала ў вёску Слабада, што ля Крулеўшчыны, з Гродзеншчыны ў канцы 1930-х гадоў. Пасяліліся прыезджыя ў доме, які належаў царкве, а айцец Аляксандр атрымаў Слабадскі прыход.

— Вельмі добрыя былі людзі, — успамінае жыхарка вёскі Таісія Аляксандраўна Таляронак, — асабліва айцец Аляксандр. Вельмі добразычлівы, ён хутка змог заваяваць любоў і давер сялян. Памятаю, як гаварыла маці, што наведваліся партызаны і прасілі бацюшку стаць сувязным, сачыць за справамі на станцыі (нашы хаты тады стаялі побач). Падобна, што ён згадзіўся, бо потым госці з

лесу перыядычна прыходзілі да яго, але не ў хату, а ў прызначанае месца. Зімой на сустрэчу ў балота вазіла яго мая маці. Аднойчы партызан, што прыходзілі да Новіка па звесткі, адвозіла аж у Таргуны.

У сям'і было шасцёра дзяцей, і партызаны, каб адвесці падазрэнне і пагрозу ад іх жыцця, спалілі хату святара, але, папярэджаны, той вывез увесь скарб. Потым Новікі жылі ў адной хаце з Юнцэвічамі. Бяда грымнула вясной 1943 г. Знайшоўся вылюдак сярод прыхаджан і выдаў бацюшку. Айца Аляксандра забралі і павезлі ў Докшыцы. Тады ж знішчылі яшчэ дзве сям'і слабадчан, якія мелі сувязь з партызанамі. Назаўтра ў Докшыцы адправілася матушка Марыя. Не дачакаўшыся бацькоў, на іх выручку паехаў сын Алег. Ён добра ведаў нямецкую мову, сабраў подпісы аднавяскоўцаў у абарону бацькоў. Падпісалася ўся вёска, акрамя Рыгора Ждановіча.

Успамінае М.Дз.Чысцякоў:

—Святара Аляксандра Новіка і яго жонку немцы расстралялі ў свірне ля будынка паліцыі. Потым забітых адвезлі ў кар'ер, дзе расстрэльвалі яўрэяў. Памятаю, што бацюшка быў апрануты ў чорную расу.

Пра лёс праваслаўнага свяшчэнніка з в. Слабада газета «Родныя вытокі» расказала 8.6.1996 г., а ў лютым 1998 г. ў рэдакцыю завітала пажылая кабета, якая шукала аўтара вышэй названай публікацыі. Гэта была Нона Аляксандраўна Новік, дачка загінуўшага свяшчэнніка. Аб артыкуле, прысвечаным іх сям'і, Ноне Аляксандраўне расказалі вяскоўцы, калі яна летам прыязджала на асвячэнне царквы святой праведнай Ганны, што пабудавана ў Слабадзе. Менавіта ў гэтым храме працаваў яе бацька. Пасля сумеснага прачытання артыкула, слёз і падзяк за праўду і захоўваемую вяскоўцамі памяць, Нона Аляксандраўна зноў расказала аб страшнай трагедыі, якая спасцігла сям'ю Новікаў.

У 1943 г., калі адбылася трагедыя, ёй было 15 гадоў, таму яна добра памятае падзеі. Узначальваць Слабадскі прыход айцец Аляксандр пачаў у 1940 г., а дагэтуль быў свяшчэннікам у Чэрасах Міёрскага раёна. Наогул жа карані Новікаў на Гродзеншчыне. Сувязь з партызанамі меў не толькі галава сям'і, але і адзін з сыноў — Алег, 1926 г. нараджэння. Магчыма, што ён нават больш дапамагаў партызанам, чым бацька. Справа ў тым, што ў Алега была схільнасць да вывучэння замежных моў, і, маючы за плячыма толькі школу, ён тым не менш добра размаўляў па-нямецку. Гэта ведалі немцы, і таму, як толькі прыязджалі ў вёску, адразу бралі хлопца за перакладчыка. Ён часцяком хадзіў на станцыю Крулеўшчына, і пасля гэтага адразу ў хату наведваўся нехта з партызан. Потым Алега запрасілі ў жандармерыю і прапанавалі ехаць вучыцца ў жандармскую школу. Абяцалі вялікую будучыню. Але бацька неяк адпрасіў сына, спасылаючыся на невядомую невылечную хваробу.

Бацьку разам з Алегам забралі адразу, як толькі згарэла хата. Нехта бачыў, што рэчы дапамагалі выносіць партызаны, і данёс немцам. Разам з імі ўзялі і Юзіка Юнцэвіча, Валодзю Бурду. Бацюшку з сынам дапытваць пачалі тут жа, у вёсцы. Білі гумовымі шлангамі, заціскалі пальцы ў дзверы. Перад ад'ездам у Докшыцы дазволілі выйсці да дзяцей з жонкай.

—Тата выйшаў да нас увесь сіні, так быў збіты. Мы кінуліся немцам у ногі, прасілі, плакалі, але ўсё дарэмна, — расказвае Нона Аляксандраўна. — Тату загадалі зняць крыж, і ўсіх павезлі ў Докшыцы. Забіраў тату і іншых вяскоўцаў здраднік Комулька (пасля вайны яго знайшлі ў Польшчы, і мяне выклікалі сведкай на суд). Маму забралі таксама і потым расстралялі разам з татам і Алегам. Зою і Ігара — нашых старэйшых — адправілі ў Германію, а нас з малодшым братам Севам партызаны схавалі на балоце. Вельмі ўдзячна сям'і Аляксандра Юнцэвіча, сын якога Аляксандр Аляксандравіч зараз жыве ў Докшыцах, а таксама ўсім жыхарам вёскі Слабада, якія насілі нам у яму ежу, не далі памерці з голаду. У вёсцы я жыла да 1974 г., а потым выехала на станцыю Гудагай, дзе жыву і зараз. Пасля вайны, калі адкрылі яму з расстралянымі, мы з братам спадзяваліся адшукаць целы нашых бацькоў. Але дарэмна. Нікога і нічога там пазнаць было немагчыма. Зараз помнік маім бацькам і брату — гэта адноўленая царква святой Праведнай Ганны ў Слабадзе. Пакуль ходзяць мае ногі, я буду прыязджаць сюды, на гэту зямлю, дзе спазнала здраду і дапамогу, перажыла трагедыю і нарадзіла дзяцей.

*Т.Чувахова.*

## Доўгачаканае вызваленне

Грукат артылерыйскай кананады на світанні 23 чэрвеня 1944 г. абвясціў, што вызваленне ўжо блізка — пачалася аперацыя «Багратыён». Ужо ў першы дзень надзвычай жорсткіх баёў абарона нямецкіх войскаў у правабярэжжы Заходняй Дзвіны была прарвана. На наступны дзень войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту пераадолелі раку. На поўдзень ад Дзвіны рушылі на захад, на Багушэўск, Сянно, Лепель злучэнні 3-га Беларускага фронту. Размежавальная лінія франтоў праходзіла ўпоперак раёна — ад Чашнікаў праз Лепель, на поўдзень ад в. Беразіно, ст. Параф'янава і Мядзела.

З боку Бешанковіч і Лепеля (вызвалены 28 чэрвеня) да Бярэзіны імкнуліся войскі 43-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант А.П.Белабародаў), якая перад тым удзельнічала ў знішчэнні віцебскай групоўкі гітлераўцаў. Першымі да моста і пераправ каля в. Беразіно падышлі 306-я стралковая дывізія (генерал-маёр М.І.Кучаравенка) 1-га стралковага корпуса (генерал-лейтэнант Н.А.Васільеў) і танкі 39-й гвардзейскай танкавай брыгады.

На правым флангу 3-га Беларускага фронту яшчэ больш імкліва наступалі брыгады 3-га Сталінградскага гвардзейскага механізаванага корпуса (генерал-лейтэнант В.Ц.Абухаў), які ўваходзіў у конна-механізаваную групу (генерал-лейтэнант М.С.Аслікоўскі). Партызанская брыгада «Жалязняк» загадзя, яшчэ 21—22 чэрвеня, разагнала нямецкіх ахоўнікаў, захапіла на Бярэзіне плацдарм шырынёй 17 км і ўсталявала 2 танкавыя пераправы — каля вёсак Броды і Сінічына. Да іх і накіроўваліся перадавыя атрады корпуса. 29 чэрвеня яны ўжо былі каля ракі і Сергуцкага канала і пераправіліся праз іх, на наступны дзень стварылі неадольныя для ворага плацдармы, на якія пераправіліся і стралковыя



Група ветэранаў 277-й стралковай дывізіі на Докшыцкай зямлі. 1985 г.

ВЫЗВАЛЕННЕ ДОКШЫЦКАГА РАЁНА Ў 1944 г.




Аўтар карты У.Ф.Іоаенка

часткі. Каля в. Кальнік вялі бой 7-я і 9-я механізаваныя брыгады, а паблізу ад паўднёва-ўсходняй мяжы раёна і в. Броды — 8-я гвардзейская механізаваная брыгада і 35-я гвардзейская танкавая брыгада. На дапамогу ім прыйшлі батальёны 277-й, 215-й і 144-й стралковых дывізій 72-га стралковага корпуса (генерал-маёр А.І.Казарцаў) 5-й арміі (генерал-лейтэнант М.І.Крылоў). Пры гэтым асабліва вызначылася 277-я стралковая дывізія (генерал-маёр С.Т.Гладышаў).

30 чэрвеня ўсе стралковыя дывізіі першага эшалона былі на заходнім беразе Бярэзіны. У кожнай з іх меліся спецыяльныя матарызаваныя атрады, створаныя, каб ушчыльную наступаць за танкамі, разам з імі весці праследаванне ворага. Гэтая тактыка сябе цалкам апраўдала. У той жа дзень імклівым ударам




Мемарыяльная дошка на стэле ў гонар вызвалення г.п. Бягомль.



Помнік воінам 277-й стралковай дывізіі — вызваліцелям Докшыцкага раёна. 1979 г.

перадавы атрад 35-й гвардзейскай танкавай брыгады (генерал-маёр А.А.Асланаў) разам з партызанамі брыгады «Народныя мсціўцы» авалодалі суседнім раённым цэнтрам Плешчаніцы. А з Зембіна немцы былі выбітыя перадавым атрадам 8-й гвардзейскай механізаванай брыгады (палкоўнік С.Д.Крэмер). Усё гэта гарантавала, што Бярэзіна не пераўтварыцца ў неадольны рубеж варожай абароны.

Наяўных нямецкіх войскаў для гэтай мэты не хапала. Сярод іх былі патрапаныя ў баях франтавікі і ахоўнікі без цяжкага ўзбраення: 95-я і 212-я пяхотныя дывізіі на поўнач ад Беразіно, 720-ы пяхотны полк і 391-ы ахоўны полк каля вёсак Кальнік, Бабцы і каля Бягомля, часці 201-й і 207-й ахоўных дывізій на паўднёвых подступах да раёна.

Тым не менш баі адбываліся жорсткія. Савецкія войскі падтрымліваліся з паветра лётчыкамі 6-й гвардзейскай бамбардзіровачнай дывізіі (гвардыі палкоўнік Р.А.Чуганаў), 259-й знішчальнай авіядывізіі (палкоўнік Я.А.Курбатаў) і іншымі авіятарамі. Экіпажы бамбардзіроўшчыкаў бамбілі пазіцыі, абарончыя рубяжы, пазіцыі нямецкіх войскаў, эшалоны на чыгунцы. Знішчальнікі выляталі на суправаджэнне бамбардзіроўшчыкаў і штурмавікоў, перахоплівалі фашысцкія самалёты, перашкаджалі руху па дарогах. Вылучыўся баявымі поспехамі 72-і гвардзейскі знішчальны авіяполк (палкоўнік П.П.Заварухін). Нямецкая абарона не вытрымала ўдараў, якія былі нанесены з захопленых плацдармаў. Да 1 ліпеня савецкія воіны ачысцілі ад акупантаў усю ўсходнюю частку сучаснай тэрыторыі раёна на глыбіню больш за 20 км. Наступ працягваўся.

Ішлі і ішлі савецкія войскі ўздоўж дымных папялішчаў і свежых магільных насыпаў. Байцы 72-га стралковага корпуса часта бачылі па абодва бакі свайго баявога шляху

звернутыя да неба ў нямым плачы закапцелыя пячныя трубы на месцы дамоў знішчаных ворагам вёсак Сасновая (П'яны Лес), Вітунічы, Атрубак, Гарэлае і Кліннікі, Мількунь і Азарцы, сястры Хатыні — Шунеўкі. Яны быццам клікалі да помсты. А іх баявыя паплечнікі з 1-га стралковага корпуса (179-я, 306-я, 357-я стралковыя дывізіі) праходзілі ў паходных калонах месцы бязмернага разарэння сёлаў і знішчэння людзей — Полацка-Лепельскую партызанскую зону. Гэта на яе абрынуўся шэраг карных аперацый, лютая нянавісць акупантаў. Ад цудам ацалелых мясцовых жыхароў яны чулі жудасныя апавяданні, сустракалі па дарозе групы ўзрадаваных партызан. Зона прымыкала да тэрыторыі раёна з паўночнага ўсходу. Узімку 1943/44 гг. вакол яе адбываліся жорсткія баі з шматлікімі карнымі атрадамі. Апошнія спрабавалі адціснуць партызан ад важнай дарогі Віцебск—Лепель—Докшыцы—Параф'янава да раёна Ушачы—возера Шо і там знішчыць. Не здзейснілася — партызаны пайшлі на прарыў.

1 ліпеня Бягомль быў вызвалены 277-й стралковай Рослаўльскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава 2-й ступені дывізіяй (генерал-маёр С.Т.Гладышаў) разам з мясцовымі партызанамі. Вечарам 2 ліпеня 306-я стралковая Рыбшэўская Чырванасцяжная імя М.І.Калініна дывізія (генерал-маёр М.І.Кучаравенка) штурмавала і вызваліла раённы цэнтр — г. Докшыцы. Над горадам быў узняты сцяг перамогі.

Адначасова з Докшыцамі, ужо за межамі раёна былі вызваленыя буйныя населеныя пункты Будслаў і Даўгінава. 850-ы стралковы полк (кам. падпалкоўнік Д.К.Марозаў) 277-й стралковай дывізіі вызваліў ст. Параф'янава. Пры фарсіраванні Бярэзіны, вызваленні Докшыц і Параф'янава вызначыўся батальён капітана І.П.Луева. 3—4 ліпеня пасля вызвалення Крулеўшчыны, Гарадзішча, Валкалаты, Порпліпіча і суседніх вёсак уся тэрыторыя раёна была ачышчана ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Запыленыя, пачарнелыя ад летняй спёкі, у выцаленых сонцам пілотках і гімнасцёрках салдаты ішлі на захад. Другі эшалон войскаў — 84-ы і 5-ы гвардзейскі стралковыя карпусы — праходзіў дарогамі раёна 4—6 ліпеня. Праз Вілейку і Мядзел войскі рухаліся ў Прыбалтыку. А там дайшла чарга і да трэцяй хвалі войскаў, ужо з мясцовымі папаўненнямі. Праводзілі іх кветкамі і слязамі, з пачуццём удзячнасці, надзеі, любові. Ішлі родныя і блізкія. Як хацелася, каб усім выпала вярнуцца назад! *У.Ф.Ісаенка.*

## Дакументы сведчаць

### З АПЕРАТЫЎНЫХ ЗВОДАК САЎІНФАРМБЮРО

**1 ліпеня 1944 г.**

[...]

Войска 3-го Белорусского фронта, развивая успешное наступление, форсировали реку Березина на фронте в 110 км и 1 июля штурмом овладели крупным узлом коммуникаций городом Борисов, а также с боями заняли более 150 других населенных пунктов; среди них — районные центры Минской области город Бегомль, город Плещеницы и крупные населенные пункты Бересневка, Будиловка, Прусовичи, Липки, Зембин, Червоная Рудня, Струпень, Вериски, Новоселки, Чернявка.

[...]

**3 ліпеня 1944 г.**

[...]Юго-западнее города Полоцк войска 1-го Прибалтийского фронта, продолжая развивать наступление, овладели районными центрами Вилейской области городом Глубокое, городом Докшицы, а также с боями заняли более 400 других населенных пунктов, среди которых крупные населенные пункты Погост Новый, Иоды, Мосарж, Хорошки, Крулевщизна, Порплище, Парафьяново и железнодорожные станции Крулевщизна, Порплище, Парафьяново. Наши войска ворвались в город Полоцк, где завязали уличные бои.

[...]

*Сообщения Советского информбюро. Кн. 7. М., 1945. С. 23, 26.*

# Ад Віцебска да Мінска

**З успамінаў Маршала Савецкага Саюза камандуючага 5-й арміі 3-га Беларускага фронту М.І.Крылова**

28 июня передовые части 5-й армии близко подошли к Березине. Правофланговая 7-я гвардейская механизированная бригада 3-го гвардейского механизированного корпуса, преследуя части немецкой 201-й охранной дивизии, гнала их в болота оз. Плавно, где с севера со стороны Медведовки и Затиклясья им наносили чувствительные удары отряды — 1-й Смоленской партизанской бригады под командованием командира В.И.Целищевского и комиссара И.Х.Войзудина.

Добивать остатки частей витебской группировки, окруженных в лесах между Чашниками и оз. Лукомль, командующий 5-й армии поручил 159-й и 215-й стрелковым дивизиям, которым активно помогали партизаны бригады имени Заслонова.

Теперь предстояла необычайно трудная задача — форсировать р. Березину, широко прикрытую по всей полосе армии непроходимыми лесами, топкими болотами. Топкими были и берега ее притоков.

Учитывая, что войска армии крайне устали, я разрешил соединениям перед форсированием немного отдохнуть, а сам с членом Военного совета генерал-майором И.М.Пономаревым и начальником инженерных войск полковником Я.Я.Лейманом отправился в дивизии, действовавшие на главном направлении, чтобы там на месте еще раз проверить их боеспособность, вместе с командованием дивизий и полков более детально разобраться в обстановке, помочь им в решении весьма трудной и сложной задачи форсирования. Утром 29 июня мы прибыли на КП 277-й стрелковой дивизии. Эта дивизия наступала на бегомльском направлении.

Разведка и передовой отряд дивизии под командованием капитана И.П.Луева к этому времени вышли к Березине, но со стороны Кальника, Бабцев и южнее моста были остановлены организованным огнем противника. Четвертая стрелковая рота 850-го стрелкового полка, которой руководил старший лейтенант Щукин, два часа вела бой за шоссейный мост, но захватить его так и не смогла.

При подходе к Березине батальон капитана И.П.Луева встретил разведчиков одного из отрядов партизанской бригады «Железняк», высланных командованием отряда для встречи частей Красной Армии. Разведчики рассказывали, что Кальник, Бабцы и островок южнее шоссе обороняют 720-й пехотный и 391-й охранный полки, остатки лепельского гарнизона и отошедших из-под Витебска частей. В тылу их, на восточных опушках рощ восточнее Бересневки, а также в районе Бабцев — немецкая артиллерия.

Из всего сказанного партизанами было ясно, что в этой сковывающей топкими болотами местности в районе шоссейного моста Березину не удастся форсировать, и как ни трудно, а надо эти места обойти с помощью партизанских следопытов и ударить по противнику с флангов и тыла.

Так и было решено. Командир 277-й стрелковой дивизии вызвал на КП командиров частей и в моем присутствии поставили следующие задачи: 854-му стрелковому полку наступать вдоль шоссе Лепель—Бегомль и активными действиями сковывать неприятеля; 850-му стрелковому полку начать движение в 2—3 км севернее шоссе, пройти по болотам к Березине и там в районе севернее Кальника внезапно для противника форсировать ее, затем выйти к Бересневке и оттуда нанести удар в тыл — на Бабцы, чем обеспечить форсирование Березины главными силами дивизии.

В это же утро партизанскими тропами, утопая по колено в болотной жиже, 850-й полк под командованием подполковника Д.К.Морозова двинулся в обход немецкой обороны. На этом направлении Березина имеет четыре заболоченных протока, каждый шириною до 30 км. Первым шел 2-й батальон. Все оружие, боеприпасы и снаряжение бойцы несли на себе, вплоть до легких переправочных средств. Подойдя к первому же протоку, пришлось делать поплавки из солдатских палаток, набивая их хворостом и связывая в плотики. К основному течению Березины добрались только к вечеру, устали, конечно, очень. На той стороне реки противник беспрерывно постреливал, видимо, чтобы напугать партизан.

Капитан Луев вывел 2-й батальон на сухие островки, а сам вышел с командирами рот на берег, показал им местонахождение д. Кальник и поставил задачу. После проверки готовности пулеметов старшего лейтенанта Дани-

ленко и минометов лейтенанта Голова капитан Луев приказал начать форсирование. Первыми в воду бросились парторг 6-й роты сержант В.Ивьяков и бывалый воин И.Плотников.

Уже густели сумерки, когда стрелковые роты, бесшумно форсировав Березину, словно гром среди ясного дня, ударили по врагу: 6-я рота, ведомая бесстрашным старшим лейтенантом А.Старостенко, успешно атаковала с фланга Кальник, 5-я рота также неожиданно ударила с севера на Бабцы. Отважно действовали пулеметчик Николай Грицун и автоматчик Федор Замятин. Они огнем пулеметов и гранатами уничтожили 2 пулеметных расчета, расчистили путь роте к Березине, 5-я рота захватила шоссейный мост. Четвертая рота бросилась на Бересневку и завязала за нее горячий бой.

За батальоном капитана Луева ночью переправились остальные батальоны полка.

